№ 31 (389) 20 жніўня 2004 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

АЛІМПІЯДА-2004



### Хлопцы, імпэтней!

Пяты дзень Алімпіяды прынёс Беларусі першыя мэдалі — ня ў самым прэстыжным відзе. Штангісткі Ганна Бацюшка й Тацяна Стукалава (на здымку) занялі 2-е і 3-е месцы ў вагавой катэгорыі да 63 кг, узьняўшы 242,5 і 222,5 кг адпаведна. У рыўку Г.Бацюшка паставіла сусьветны рэкорд (115 кг). Г.Бацюшцы — 23 гады, Т.Стукалавай — 28.

А штурхальнікі ядра, ад якіх у сераду таксама чакалі перамогі, не далі рады.

Пра Алімпіяду — **старонкі 3, 11.**

### Аляксей Шэін

Хрысьціянін у палітыцы. Гутарка з сэрыі «Пакаленьне next».

старонка 6

### Край лясных бровараў

Вандроўка зь Сяргеем Харэўскім.

старонка 13

### Закапанае жыцьцё

Тыпалёгія беларускіх дачнікаў.

старонка 14

# Рэфэрэндуму — так!



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Старонка 2.

КУЛЬТУРА

### Наваградак узялі ў аблогу

Праз моцны цыклён рыцары (на фота справа) дэманстравалі сваю спраўнасьць 10-ці, а не заплянаваным 50 тысячам гледачоў. Фэсты ў Наваградку і Готляндзе, іншыя падзеі культуры — **старонка 8.**

З УСЁЙ КРАІНЫ

### Аквапарк на Полаччыне

Кіраўніцтва Наваполацку плянуе пабудаваць самы вялікі ў Беларусі аквапарк у Баравусе-1 — былым вайсковым гарадку, які знаходзіцца ад нафтагораду за 10 км. У пасёлку знаходзіцца маляўнічае возера Вельле, вакол — бор. Найперш маркецца мадэрнізаваць мясцовую кацельню, бо аквапарк — энэргаёмісты аб'ект. Будаўніцтва мае доўжыцца пяць гадоў. Аб'ект зробіць крыўскі край больш прывабным для турыстаў.

**Васіль Кроква, Полацак**

Іншыя паведамленьні — **старонка 5.**

## Першыя вынікі выбараў

**Бізнэсоўцаў-дэпутатаў Мікалая Скутава і Аляксея Ваганава ў наступнай палаце ня будзе.**

Пастаўская выбарчая камісія адмовіла ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы дзейнага дэпутата Мікалая Скутава, які быў генэральным дырэктарам ЗАТ «БелРосУкрнафта», ЦВК пацьвердзіла рашэньне акруговай камісіі. Вядомы ж бізнэсовец Аляксей Ваганаў, старшыня камісіі грашова-крэдытнай палітыкі

**Працяг на старонцы 3.**



СЯРГЕЙ ХАРЭЎСКІ

**«Нешта ў вас, таварыш конюх, усе кабылкі цёмныя!» Улады імкнуцца абмежаваць кантакты кандыдатаў з выбарцамі.**

СКАНДАЛ

### Суд ыратаваў Inco-Food ад банкруцтва

Польская фірма Inco-Food — рэзыдэнт свабоднай эканамічнай зоны «Берасьце». Карыстаючы з гэтага, Inco-Food наладзіла ў СЭЗ вытворчасьць мясных вырабаў з прывазной польскай сыравіны. Мяса захоўвалася ў маразільніку, які таксама месьціцца на тэрыторыі СЭЗ, але належыць беларускай фірме, якая фармальна не рэзыдэнт СЭЗ. Мытнікі падалі пазоў у суд. Берасьцейскі раённы суд прызнаў гэта парушэньнем мытнага заканадаўства і прысудзіў канфіскацыю мяса на суму $1,8 млн і штраф. Гэтае рашэньне давала мытнікам падставы патрабаваць мыта й з усіх папярэдніх партыяў сыравіны, што прывяло б да банкрутства фірмы.

Распродаж мяса меў адбыцца 12 жніўня і быў адкладзены да разгляду справы судом вышэйшай інстанцыі толькі дзякуючы ўмяшаньню віцэ-прэм'-ера Польшчы Ежы Гаўснэра. 17 жніўня Берасьцейскі абласны суд скасаваў рашэньне раённага. Узаеміны з Польшчай уладам даражэйшыя за даляры.

**АП**

КАЛЯНДАР

## Яблычны Спас



Усё ж такі бульба — амэрыканка. І нашы продкі яшчэ гадоў 150 таму называлі яе «чортавым яблыкам», процістаўляючы яблыку людзкому і боскаму. Апошні, як у той казцы, з пракаветных дакалюмбавых часоў каціўся па сьцяжынцы побач зь беларусам. І Скарына, вырушаючы ў Кракаў, ня мог ня кінуць у заплечнік пару штрыфляў з-пад старой дзедавай яблыны; а Барбара, зьлаўшы позірк брата Мікалая, вядома ж, падала маладому каралю Жыгімонту аж празрыстую налііўную папяроўку.

Нашы яблыкі — чароўны флякон, у якім прырода збалянсавала вітаміны, цукры й фэнолакіслоты, неабходныя для добрага абмену рэчываў, яснасьці розуму і сілы. Таму іх з такім імпэтам сушаць, мочаць, вараць, пякуць, хаваюць на зіму (паспрабуйце захаваць банан). Але найболей яблыкі ядуць так — шчыпаючы проста зь яблыні. А яшчэ яблыня — найлепшы меданос. Так што мёд, якім мы часам ласуемся, — таксама яблычны.

## Школам вясковым куранят на адкорм




**Дырэктар адной зь вясковых сярэдніх школ не бяз горычы паведаміў, як днямі яму пазванілі з раённага аддзелу адукацыі і далі наказ: прыняць на адкорм 50 куранят мясной пароды, камбікорм завязуць, усё астатняе — ягоны клопат на час летніх вакацый.** Калі ён запярэчыў, то яму напомнілі, што ў РАА ёсьць намер забясьпечыць маладняком птушкі на адкорм і іншыя школы. А мой суразмоўнік успомніў, што нешта падобнае яны перажылі пры Хрушчове, калі ім даводзілі заданьне вырасьціць на прышкольным участку ня меней за 50 сотак кукурузы і адкарміць двух-трох парсючкоў, каб дагнаць Амэрыку па вытворчасьці мяса. Як відаць, адміністрацыйна-камандны сьверб 60-х гадоў мінулага стагодзьдзя зноў не дае спакою ўладам. Вядома, тут праглядваецца ініцыятыва не раённага аддзелу адукацыі, а менскай «вэртыкалі» — тых, хто без камандаў у «нізы» не ўяўляе свайго жыцьця.

**Міхась Кутнявецкі, Слуцак**

Іншыя паведамленьні з усёй краіны — **на старонцы 5.**

# Рэфэрэндуму — так!

**Менавіта рэфэрэндум здольны надаць другое дыханьне апазыцыі. Тады яна здолее адысьці ад «лямпачак» да галоўнага палітычнага пытаньня, па якім яе пазыцыя супадае з думкай большасьці беларусаў. А ў выніку гэтага рэфэрэндум можа дапамагчы апазыцыі «выцягнуць» і перадвыбарную кампанію — ператварыць яе ў агульнанацыянальную пад лёзунгам «не трэцяму тэрміну». Зрэшты, акурат таму я моцна сумняваюся, што рэфэрэндум усё ж такі будзе назначаны на 17 кастрычніка, мяркуе палітоляг Віталь Сіліцкі.**

Парлямэнцкія выбары ўжо на пачатку іх правядзеньня набылі фармат, які няцяжка было прадбачыць. За тры месяцы да абвяшчэньня выбарчай кампаніі нам паведамілі, колькі каго будзе ў складзе палаты прадстаўнікоў трэцяга скліканьня, а за каго ніхто ніколі не прагаласуе. Пры гэтым дзеля пэўнасьці пачалі «зачыстку». За два месяцы паказалі «сапраўднае аблічча» тых, каго прадыктаваны ўладамі расклад не задавальняе. За месяц правялі нараду, дзе растлумачылі, каму, што і як рабіць. Калі выбары нарэшце былі абвешчаны, папулярна растлумачылі, чаму народ будзе галасаваць менавіта так, як трэба. Для большай пэўнасьці нязгодных пачалі адсякаць у масавым парадку яшчэ на этапе рэгістрацыі ініцыятыўных груп — гэта пакуль што галоўнае ноў-хаў сёлетняй кампаніі. Каб зразумець, што будзе далей, дастаткова правесьці лінію «па нарастаючай».

Ці гатовая была да ўсяго гэтага апазыцыя? Ілюзій, безумоўна, было няшмат. Улічваючы, у якіх умовах апанэнтам улады прыходзіцца дзейнічаць, папракаць іх таксама амаль няма за што. Бо справа нават не ў стратэгіі, а ў тактыцы ды тэхналёгіях. Палітыка па-беларуску (ці, больш дакладна, па-лукашэнкаўску: былі ў нас і лепшыя часы) вымагае большага, чым здольнасьць пераканаць выбаршчыкаў у тым, што ваш кандыдат — самы-самы.

Хаця, безумоўна, з пункту гледжаньня стратэгіі і тактыкі пэўныя прэтэнзіі можна было б выказаць. Аўтар гэтых радкоў ня раз і ня два на працягу папярэдняга году казаў (у тым ліку і на старонках «НН»), што да парлямэнцкіх выбараў варта ня толькі рыхтавацца, як да баёў бяз правілаў, але яшчэ і ўсьвядоміць, дзеля чаго апазыцыі патрэбны гэтыя выбары.

**Працяг на старонцы 4.**

# Новая кніга Калінкінай

Сьвятлана Калінкіна сышла з пасады галоўнага рэдактара «Белорусской деловой газеты». Яна чарговы раз зьбіраецца пісаць кнігу. Папярэднюю кнігу «Выпадковы прэзыдэнт» Калінкіна напісала ў суаўтарстве з Паўлам Шараметам летась — падчас вымушанага адпачынку, калі выхад «БДГ» быў прыпынены на тры месяцы. Паводле нашых зьвестак, той выдадзены ў Расеі том выклікаў моцнае раздражненьне сярод лукашыстаў. Новую кнігу Калінкіна таксама піша ў суаўтарстве з Шараметам (на фота — разам). Кажа, што кніга будзе публіцыстычнай, пра Беларусь. «Але яе зьяўленьне — гэта справа не аднаго тыдня і нават ня месяца», — зазначае Калінкіна.

Галоўным рэдактарам «БДГ» зноў стаў Пятро Марцаў. Ён кажа, што пакуль ня бачыць кандыдатуры, вартай узначаліць калектыў «БДГ», таму кіруе газэтай сам. Пра сыход Калінкінай ён гаворыць неахвотна: «Яна напісала заяву пра сыход, я не пярэчыў. Можаце напісаць, што сышла з узаемнай згоды». Марцаў адмаўляе палітычныя матывы пры зьмене галоўнага рэдактара.

**АШ**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

ПОШТА РЭДАКЦЫІ

## Пра нашых спартоўцаў

Агідна было глядзець, як на адкрыцьці Алімпіяды члены беларускай каманды махалі ў тэлекамэры лукашэнкаўскімі сьцяжкамі — з радаснымі тварамі. Пэўна ж, калі б нехта зь іх адмовіўся ўзяць такі «сьцяжок» у рукі — наўрад ці да яго (яе) былі б прыменены нейкія рэпрэсіўныя захады. Але ні ў кога, напэўна, і думкі такой ня ўзьнікла. Зрэшты, гэта аксіёма — спорт амаль заўсёды служыць рэжыму (пры дэмакратыі — дэмакратыі, пры дыктатуры — дыктатуры).

**Сяргей Навумчык,**
намесьнік старшыні
Рады БНР

Іншыя лісты, водгукі й камэнтары — **старонка 10**.

З УСІХ СТАРОН

# Нямецкі мяккі знак

Нямецкая правапісная рэформа можа паслужыць добрым прыкладам таго, як нельга абыходзіцца з мовай, а таксама вылучае пытаньні, на якія трэба будзе шукаць адказы і беларусам. Ці можа мова жыць без адзіных арфаграфічных нормаў? Паўстае дылема паміж адзінствам правапісу (але ў гэтым выпадку мове і яе носьбітам навязваецца пэўная штучная норма) ды вольным разьвіцьцём мовы (тады ў правапісу няма адзінства, што стварае праблемы пры вывучэньні мовы ў школах). У адрозьненьне ад нямецкага падыходу ангельская мова падае прыклад існаваньня некалькіх варыянтаў правапісу. Камэнтар Сяргея Вінаградава — **старонка 10.**

IN MEMORIAM


WWW.IBIBLIO.ORG

**У 1985 годзе, калі я ўпершыню прачытаў у «Encyclopedia Britannica» пра ягоны «Скуты розум», мне было цяжка паверыць, што ён яшчэ жыве. Сёньня ня менш цяжка ўявіць, што ён ужо адышоў.**

Чэслаў Мілаш

## Сэнс

— Калі я памру, я ўбачу падшэўку сьвету.
Зь іншага боку, за птахам, гарою й заходам сонца.
Сапраўдныя знакі, што прагнуць, каб іх расчыталі.
І зробіцца слушным усё, што было няслушным.
І зробіцца ўцямным усё, што было няўцямным.

— А калі няма ніякай падшэўкі сьвету?
Калі дрозд на галіне — гэта зусім ня сымбаль,
Проста дрозд на галіне, а дзень і ноч
Настаюць па чарзе і ня дбаюць пра сэнс,
І нічога няма на зямлі, апроч гэтай зямлі?

Калі нават і так, усё адно застанецца
Слова, абуджанае ў нетрывалых вуснах,
Што бяжыць і бяжыць, нястомны пасланьнік,
У міжзорных палёх, у вірох галяктык,
І крычыць, і гукае, і пратэстуе.
*1991*

Пераклаў з польскай Андрэй Хадановіч

# Чэслаў Мілаш

Апошнія 15 год Мілаш быў з намі. На пачатку 90-х ён арганічна ўпісаўся ў стыль і настрой віленскай «НН». Ягонае «Вялікае княства Сіліцыяніі» знайшло сябе побач з «Бабілёнскай бібліятэкай» Борхеса, кельцкімі лябірынтамі Мэвы Марон, панам Блішчынскім Лесьмяна. А яшчэ Эдгар По, Кундэра, Гэрбэрт ды іншыя. Мілаш відавочна быў *наш*.

Таму, калі ў Сэйнах на Сярэднеэўрапейскім форуме культуры Сакрат Яновіч пасадзіў мяне сам-насам зь Мілашам, на «паўгадзінкі», я не асабліва ўразіўся. Мы размаўлялі пра *нашу* Літву. Было пэўнае сугучча, была й насьцярога.

Для нас абодвух *нашая Літва* была сном. Але для яго гэты сон быў дзяцінным, салодкім, прамінулым. Сном каранёў і глебы, радзіннага маёнтку. Для нас жа Літва была тады адной з магчымых будучынь, яна сачылася з будучыні як атрутная спакуса. Мілаш імкнуўся захаваць памяць пра тых, хто лічыў гэтую зямлю сваёй. Мы ж спрабавалі зьмяніць канон культуры, якая ў сваім народніцкім паходзе адвучылася сьніць салодкія сны.

У яго было неверагодна доўгае жыцьцё.

У 30-я ён пісаў катастрафічныя вершы і хацеў быць сучасным. І таму марыў вырвацца з задушлівай крэольскае атмасфэры міжваеннага *Wilno*. Пакуль не натрапіў у Парыжы на свайго дзядзьку Оскара Мілаша з Чарэі, зь беларускай галіны роду. Паэта, містыка, літвамана, кабаліста. Які навучыў яго, што ў кожнага свой час і свая сучаснасьць. У 70-я, у каліфарнійскім Бэрклі, ён вырашыў быць верным. І таму пісаў пра гэтае самае *Wilno*, пра даліну Ісы, пра цывілізацыю, якая прамінула і якая наўрад ці, як ён уяўляў, на другім канцы сьвету была камусьці цікавая.

Пасьля канца камунізму ён хацеў быць карысным. І пражыў яшчэ 15 доўгіх год. Падарожжы, канфэрэнцыі, сустрэчы, размовы. Новыя кнігі, новыя пераклады. Калі ў Менску выходзіў ягоны «Скуты розум», ён напісаў прадмову для беларускага чытача. Да ягонага зьдзіўленьня гэтая «амаль выпадковая» кніга ва Ўсходняй Эўропе ўсё яшчэ была актуальная. А ён так хацеў, каб пра яе «забылі».

Мне таксама хочацца назаўсёды забыцца на «Скуты розум». І тады Мілаш застанецца для мяне зь іншай кнігай. «Зямля Ульро». У ёй іншы Мілаш. Несучасны, некарысны і неактуальны. Жывы.

**Ігар Бабкоў**

АБВЕСТКА

## Працяг традыцыяў Беларускага ліцэю!

**Выкладнікі, што працавалі ў Беларускім ліцэі, падрыхтуюць Вашых дзяцей да паступленьня ў найлепшыя ВНУ Беларусі й замежжа.**

Вучням школ, якія закончылі сёлета **7 класаў,** прапануюцца бясплатныя кансультацыі ды платныя курсы па ўсіх дысцыплінах сярэдняй школы (праграмы ліцэю). Курсы, якія ладзіць індывідуальны прадпрымальнік Грыневіч Ю.М. (пасьведчаньне №190553728, выдадзенае Менгарвыканкамам 15.07. 2004 г.), разьлічаны на чатыры гады напружанай працы!

Ахвотных *атрымаць эўрапейскую адукацыю па-беларуску* запрашаем тэлефанаваць: 8-029-629-59-03, 8-029-639-27-15, 8-029-633-48-59.

## Увазе прыватных распаўсюднікаў

«Нашу Ніву» для распаўсюду па цане 550 рублёў можна купіць у краме УП «Марат». Менск, вуліца Інтэрнацыянальная, 11А, 2-гі паверх. Ад 9 да 17, перапынак ад 13 да 14, тэл. 226-87-99.

ТЭНДЭНЦЫІ


REUTERS

## Сьпі спакойна, барэль

Чавэса слушна называюць лацінаамэрыканскім Лукашэнкам. Вэнэсуэльскі папуліст правёў рэфэрэндум аб даверы сабе — і выйграў. Увага да Вэнэсуэлы ў ЗША непараўнана большая, а ўсё ж Чавэс застаўся. Амэрыка ня ўсёмагутная. Яе параза ў Каракасе перагукаецца з іракскай у тым пляне, што цэны на нафту ня маюць шанцаў на зьніжэньне. Адпаведна, высокія даходы расейскага ПЭК гарантуюць добры попыт на беларускія тавары, а пераарыентацыя Беларусі на іншыя рынкі адкладаецца на сьвятога ніколі.

Сьвет стаўся малы, і далёкая перамога Чавэса аказваецца зарукаю эканамічнага буму ў гэтым зерні ў арэху Эўропы — Беларусі. Але да чаго гэта прывядзе? Толькі да росту веры ў сябе. Ва ўсім астатнім Беларусь — не Вэнэсуэла.

**Мікола Бугай**

# Першыя вынікі выбараў

**Працяг са старонкі 1.**

і банкаўскай дзейнасьці ПП НС, «сам вырашыў» на выбары не ісьці.

У той самы час без праблем прайшлі рэгістрацыю ініцыятыўныя групы ўсіх сяброў дэпутацкай групы «Рэспубліка». Канкурэнтам У.Парфяновіча ў Чкалаўскай акрузе №98 можа стаць ганаровы старшыня АГП Станіслаў Багданкевіч, які ўжо абіраўся ў гэтай акрузе ў Вярхоўны Савет 13-га склікання.

Вінцук Вячорка балятуецца ўва Ўсходняй акрузе сталіцы, Анатоль Лябедзька — у Сухараўскай. Намесьнік старшыні БНФ Алесь Міхалевіч балятуецца ўва Ўручанскай акрузе, старшыня Рады беларускай інтэлігенцыі Ўладзімер Колас — у Старавіленскай акрузе Менску.

Усяго ў выбарчыя камісіі падалі дакумэнты 635 ініцыятыўных груп, але ня ўсе яны былі зарэгістраваныя. Гэта навінка цяперашняй выбарчай кампаніі: упершыню адсейваньне патэнцыйных кандыдатаў пачалося ўжо на першым этапе кампаніі, яшчэ перад зборам подпісаў.

74 ініцыятыўныя групы атрымалі адмовы ад выбарчых камісій. Найбольш пацярпела на гэтым этапе выбараў Народная Грамада — з 50 ініцыятыўных групаў актывістаў гэтай партыі зарэгістраваныя былі толькі 35. ПКБ зарэгістравала ўсе свае ініцыятыўныя групы. АГП і Партыя БНФ страцілі па 3 ініцыятыўныя групы. Самыя балючыя страты — Сьвятлана Каралёва (АГП, Менск) і Аляксей Лапіцкі (БНФ, Жодзіна). Сяргей Салаш з Барысава, ініцыятыўнай групе якога адмовілі былі ў рэгістрацыі, пасьпеў зарэгістравацца скарэктаваны сьпіс.

Навінкі зьявіліся ў тактыцы дзеяньняў апазыцыйных кандыдатаў. Некаторыя кандыдаты рэгіструюць ініцыятыўныя групы адразу ў дзьвюх акругах — выбарчае заканадаўства гэта дазваляе. Гэтак, ініцыятыўныя групы Міколы Статкевіча зарэгістраваныя ў Ясенінскай і Каліноўскай акругах Менску. Лідэр камуністаў Сяргей Калякін балятуецца ў Гомельскай-Навабеліцкай і Менскай-Коласаўскай акругах. Пасьля рэгістрацыі кандыдат, які балятуецца адразу ў дзьвюх акругах, павінен будзе зьняць сваю кандыдатуру ў адной зь іх.

Ня выключана, што зьнятыя кандыдаты будуць вылучаныя паўторна партыйнымі зьездамі.

Перавага вылучэньня праз збор подпісаў — дадатковая магчымасьць агітацыі. Зарэгістраваныя ініцыятыўныя групы ўжо цяпер могуць даносіць да выбарцаў інфармацыю пра свайго кандыдата. Зьбіральнікі подпісаў з досьведам удзелу ў папярэдніх выбарах кажуць, што колькасьць сабраных за кандыдата подпісаў прыкладна адпавядае колькасьці галасоў за яго на выбарах.

Да 20 жніўня адмовы ў рэгістрацыі можна абскардзіць у Цэнтравыбаркаме і судах. Праўда, пакуль з 10 пададзеных скаргаў ЦВК задаволіў толькі 2 — гарадзенскіх прадпрымальнікаў Валера Леванеўскага (арыштаванага за паклёп на прэзыдэнта) і Аляксандра Васільева. Найбольш пацярпелая БСДП-НГ падавац скаргі ў ЦВК ня будзе, бо лічыць гэта беспэрспэктыўным.

Паводле зьвестак ЦВК, сярод зарэгістраваных груп 371 (66,8%) належаць беспартыйным, 51 (9,1%) — АГП, 35 (6,3%) — БСДП (НГ), 32 (5,7%) — ПБНФ, па 21 (3,7%) маюць КПБ і ПКБ, па 1 — ЛДПБ, зялёныя, Партыя народнай згоды, Рэспубліканская, Аграрная і Патрыятычная партыі.

Максымальная колькасьць прэтэндэнтаў зарэгістраваная ў сямі акругах — Берасьцейскай Цэнтральнай №2 (11 груп), Гомельскай Савецкай №36 (11), Лідзкай гарадзкой №56 (10), Слуцкай №89 (10), Ясенінскай Менскай №101 (11), Коласаўскай Менскай №106 (10), Уручынскай Менскай №109 (11).

На прэсавай канфэрэнцыі ў сераду на пытаньне, наколькі жосткай будзе канкурэнтная барацьба, старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына адказала: гэта залежыць ад таго, колькі незаконных грошай будуць выкарыстоўваць кандыдаты. Паводле словаў Л.Ярмошынай, ЦВК заплянаваў сродкі на выбарчую кампанію з разьліку 10 кандыдатаў на акругу: «Думаю, больш і ня будзе».

За мяжой для грамадзянаў Беларусі будзе створана 40 выбарчых участкаў. Усе яны будуць прыпісаныя да Купалаўскай выбарчай акругі Менску (дзе месьціцца МЗС), па якой вылучаецца кандыдатам дзейны дэпутат Уладзімер Навасяд.

**Алесь Пяткевіч, Аркадзь Шанскі**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Тацяна Працька кіруе выбарчым штабам Сяргея Скрабца.**

НАВІНЫ

### Расея адмяняе ПДВ для Ўкраіны

Прэзыдэнт Расеі У.Пуцін падпісаў закон аб пераходзе Расеі на выплату ўскосных падаткаў з нафты й газу пры гандлі з краінамі СНД паводле краіны прызначэньня. Гэта азначае, што прыкладна $1,2 млрд падаткаў будуць асядаць цяпер ва Ўкраіне й Казахстане. Расея спадзяецца такім чынам прывязаць эканомікі СНД да расейскага рынку. Аднак для Беларусі захаваецца цяперашні прынцып спаганяньня падатку на даданую вартасьць з нафты й газу паводле краіны паходжаньня, да падпісаньня міжурадавых пагадненьняў аб ускосных падатках.

### Лідэр Абхазіі не ідзе на трэці тэрмін

Прэзыдэнт Абхазіі Ўладзіслаў Ардзінба назваў імя кандыдата, якога ён падтрымае на выбарах 3 кастрычніка. Ім стаў прэм'ер самаабвешчанае рэспублікі Рауль Хаджымба. Канстытуцыя Абхазіі не дазваляе кіраваць краінай больш за два тэрміны запар.

### Польскі рух за Беларусь

Шэраг польскіх палітыкаў і інтэлектуалаў заявілі аб стварэньні руху «Польшча за дэмакратычныя перамены ў Беларусі». Сярод іх — рэжысэр Анджэй Вайда, старшыня Польскага ПЭН-Цэнтру і экс-міністар замежных справаў Уладзіслаў Барташэўскі, сэнатар і сусьветнавядомы хірург Зьбігнеў Рэліга.

### Ініцыятыва аб ордэне Купалы

Мінкультуры не падтрымала прапановы ТБМ пра заснаваньне ордэна Янкі Купалы.

### Цэнзура на канцэрты

У Мінкультуры распрацаваны праект пастановы, у выпадку прыняцьця якой для канцэртаў патрэбны будзе дазвол камісіяў пры мясцовай уладзе. Норма можа пачаць дзейнічаць з 1 верасьня.

### Рак наступае

За апошнія 30 год колькасьць выпадкаў захворваньня на рак павялічылася ў Беларусі ў 3—3,5 разы. Гэтую лічбу падалі спэцыялісты НДІ анкалёгіі, якія стварылі электронны атляс анказахворваньняў. Асноваў сталі зьвесткі пра ўсе выпадкі злых пухлінаў у краіне з 1965 г. Нейкай геаграфічнай залежнасьці не прасочваецца. Укладальнікі атлясу цьвердзяць, што Чарнобыль паўплываў толькі на колькасьць раку шчытавіцы. Рост астатніх відаў хваробы ўкладальнікі атлясу тлумачаць урбанізацыяй і стрэсамі.

**МБ; БелаПАН, радыё «Свабода»**

АЛІМПІЯДА

# Дурное гэта — плянаваць мэдалі

Ад Алімпіяды ў беларусаў пакуль дваякае ўражаньне. З аднаго боку — ідэалягічны прэсынг, Плян, завочнае спаборніцтва з героямі жніва, што страшна надакучыла. Зь іншага боку — сфэра чыстых эмоцый. Вось у выходныя краіна шчыра хварэла за цяжкаатлета Віталя Дзербянёва і фэхтавальшчыка Зьмітра Лапкеса.

Запомнілася, як апошні ў тайм-аўце двубою за трэцяе месца разгублена пытаў трэнэра: «Што мне рабіць, што рабіць?» Сытуацыя з Лапкесам агаліла яшчэ адну праблему — брак фінансаваньня. У інтэрвію журналістам Зьміцер сказаў пра «мора» грашовых праблем. А ў нас заяўляецца пра пільную ўвагу да спорту.

Гісторыя з баксёрам Сяргеем Быкоўскім наагул бязглуздая. Ураджэнец Віцебску прыехаў у Атэны «першым запасным»: ён мусіў замяніць украінскага калегу, якога мэдычнская камісія не дапусьціла да турніру. Але высьветлілася, што ў Сяргея… няма акрэдытацыі. Штаб беларускай дэлегацыі проста не парупіўся яе зрабіць. Напэўна, там былі занятыя нечым больш важным.

Дэкляраваны ўладамі плян па мэдалях у першыя дні Гульняў праваліўся. Лапкес, Дзербянёў, стралок Канстанцін Лукашык не ўзялі заплянаваных беларускім кіраўніцтвам узнагародаў. Алена Попчанка ня трапіла ў фінал каронная дыстанцыі на 200 мэтраў вольным стылем. Макс Мірны і Ўладзімер Ваўчкоў ужо ня возьмуць «заплянаванае» бронзы — яны выбылі ў другім крузе парнага разраду. Дурное гэта — плянаваць узнагароды.

Пра камэнтатараў БТ — Паўла Баранава і Інгу Хрушчову — і гаварыць ня хочацца. Хацелася б закрануць іншы аспэкт. Можна было б зрабіць больш разнастайнай праграму тэлетрансляцый па БТ і «Ладзе». Хоць няма там беларусаў, але паказваць гульнявыя віды — футбол, баскетбол, гандбол. Таксама скачкі ў ваду ці спартовую гімнастыку. Але не! Упарта трансьлюем малавідовішчную стральбу, і такой бяды, што беларусы нават у фінал ня выйшлі.

Афіцыйныя мэдыі па-рознаму ўспрымаюць выступы суайчыньнікаў. Поўны трагічнасьці загаловак на БелТА: «Чарговая беларуская надзея на мэдаль патанула ў алімпійскіх Атэнах». Ці амаль палітычна-крамольнае: «На беларускіх стралкоў — галоўныя нашы надзеі». Радыё «Свабода» й «Народная воля» — зь іншага боку барыкад. У аўторак газэта выйшла са зьедлівым: «Ну дзе, скажэце, мэдалі?»


REUTERS

**Зьміцер Лапкес лічыць, што перамагчы яму перашкодзіла новая маска, у якой цяжка дыхаць і блага відаць.**

Безьліч меркаваньняў на сайце «Прессбола». Таксама зьбольшага зьедліва-іранічных. Найбольш трапным падалося выказваньне чалавека, які падпісаўся нікам «Норд»: «Ні ў якім разе не хачу, каб бралі менеі мэдалёў… Але гэтыя дні нам паказалі, чаго вартыя ўсе гэтыя размовы блазнаў у гарнітурах, якіх нехта прызначыў міністрамі ды іншымі кіраўнікамі…»

**Алег Раявец**

МУЗЫ — АЛІМПІЙЦАМ

Людка Сільнова

### Алімпіяда 2004

I

Расквецідь кола дзён трыяда:
Натхненьне. Мір. Алімпіяда.
І на далёкія Атэны
Настроім мы свае антэны:
Хто свае ракавіны-вушы,
Хто зыбкія — як мора! — душы...

II

Атэны, грэцкая сталіца, —
Цывілізацыі крыніца —
Напрыканцы нуды і лета
Зрабілася сталіцай сьвету.
Сышліся тут на жатву ў жніўні
Амаль багі й амаль багіні.

III

Яшчэ наперадзе дажынкі.
— Ты чуў апошнія навінкі?
— Ну, як там нашы беларусы?
— Сваё ня ўпусьцяць! Не хваліся!
І балабоніць кожны рады
Пра Адкрыццё Алімпіяды.

IV

Якія сіла, дух і тайна
Ў таго відовішча дызайне!
Вы мудрасьць захавалі, грэкі,
Што скарб — у целе
алавека!
І перад будучыняй Тэхна
Яго растраціць будзе грэх нам.

### «Беларускі гістарычны агляд»-10




«БГА» належыць да таго шэрагу выданьняў, сам факт існаваньня якога натхняе. Нават калі ты не прачытваеш яго сшыткаў, разьлічаных на прафэсіяналаў, ад форзацу да форзацу, ты ведаеш: гэта краіне патрэбна і гэта ў краіне ёсьць. Рэдагаваны Генадзем Сагановічам «БГА» трымае найвышэйшую планку гуманітарнага мысьленьня, без банальнасьці і ідэалягічнага заказу. Новы 10-ы том насычаны палкімі дыскусіямі (у тым ліку рэдактара зь Ігарам Марзалюком ды Сяргея Запрудзкага з Валерам Булгакавым і Юрасём Бушляковым) і дэталёвымі працамі (між іншых, Юры Туронак піша пра Фабіяна Акінчыца, а Рустыс Камунтавічус — пра падарожжы па Літве ў XVI—XVII ст.).

# Недатыкальныя

Віталь Тарас

Некалі давялося бачыць фільм (здаецца, італьянскі), які атрымаў прыз на міжнародным фэстывалі кароткамэтражнага кіно. Фільм сапраўды кароткі, а сюжэт яго вельмі просты. Аднаму заслужанаму генэралу прысвойваюць самую высокую ўзнагароду. Калі яму ўручаюць ордэн у адмысловай каробачцы, састарэлы генэрал адчувае сябе на вяршыні шчасьця. Да выступу з ганаровай трыбуны з урачыстай прамовай у яго застаецца лічаныя хвіліны, і тут генэрала падводзіць страўнік — арганізм ня вытрымаў эмацыйнай нагрузкі. Генэрал ідзе ў прыбіральню і там, седзячы на ўнітазе, дастае сваю новую бліскучую цацку, каб палюбавацца на яе. Раптам ордэн высьлізвае з рук. Генэрал спрабуе злавіць яго, але празь нязграбныя рухі той праваліваецца ва ўнітаз. Генэрал закасвае рукавы… Тым часам высокая публіка і салдаты чакаюць генэрала. Праходзіць дзесяць хвілін, дваццаць… Нарэшце генэрал зьяўляецца на публіцы — потны, зь перакошаным тварам, увесь з галавы да ног у г…. У бруднай руцэ яго зьзяе зорка.

Зразумела, гэта карыкатура. Варта заўважыць пры гэтым, што вайскоўцы, асабліва генэралы, даўно сталі ўлюбёнымі пэрсанажамі карыкатурыстаў ва ўсім сьвеце. Генэрал — гэта такая тупая агрэсіўная жывёліна ў мундзіры, укрытая поўсьцю. У яго з пашчы капае сьліна, а ў руцэ заціснуты ўсе віды зброі, улучна з дручком. Прыкладна так савецкія карыкатурысты малявалі гітлераўскіх, а потым і натаўскіх афіцэраў. Савецкі афіцэр-мядзьведзь на амэрыканскіх карыкатурах выглядаў, зрэшты, ня большым інтэлектуалам.

З другога боку, генэралы заўсёды плацілі штацкім узаемнасьцю. Штафірка — гэта самае мяккае азначэньне для тых, хто ня носіць вайсковай вопраткі, ня можа разабраць аўтамат і ня ведае статуту. Мабыць, гэтая ўзаемная варожасьць засталася з таго часу, калі грамадзтва падзялялася на касты і прадстаўнік касты ваяроў ня мог сесьці ў прыбіральні побач, скажам, зь якім-небудзь гандляром.

Кастаў нідзе, апрача Індыі, ужо няма. Каставасьць засталася. Нездарма існуе жарт, што сын адмірала ня можа стаць генэралам — толькі адміралам. Аднак без усялякіх жартаў трэба прызнаць, што, калі нейкая частка грамадзтва жыве на асобным, можна сказаць, ваенным становішчы, яна адасабляецца ад грамадзтва, зачыняецца ад яго. Ад няведаньня нараджаюцца міты. Як пра юдэяў цёмныя людзі казалі, што яны нібыта п'юць кроў хрысьціянскіх немаўлят, гэтаксама людзі, далёкія ад войска, любяць распавядаць пра надзвычайныя маральныя якасьці афіцэраў.

У 60-я гады мінулага стагодзьдзя, зь якімі супала маё дзяцінства, некалькі разоў давялося чуць ад дарослых байку пра афіцэра, які ў тэатры падчас опэрнага спэктаклю пусьціў сабе кулю ў лоб праз тое, што ён гучна пукнуў (чамусьці таго афіцэра называлі то вугорскім, то польскім, але ніколі — савецкім).



Калі яго не пускаюць у Эўразьвяз, нагадваючы аб маральнай (прынамсі маральнай) адказнасьці за зьнікненьне людзей, ён пачынае абурана гаварыць аб прэзумпцыі невінаватасьці. Ці была ў зьніклых магчымасьць нагадаць сваім катам аб той самай прэзумпцыі?

Зноў жа, калі гаварыць сур'ёзна, ад людзей у вайсковай вопратцы, надзеленых зброяй і ўладай над іншымі людзьмі, іншыя людзі чакаюць не гераізму, але адказнасьці ды акуратнасьці ў выкананьні сваіх абавязкаў. Вернасьць свайму абавязку, са зразумелых прычынаў, лічыцца галоўнай вартасьцю афіцэра. Кепска, калі вернасьць абавязку застаецца адзінай вартасьцю. Эсэсаўцы ў канцэнтрацыйных лягерах таксама выконвалі свой абавязак. Аб вернасьці фюрэру, субардынацыі й выкананьні загадаў гаварылі ўсе без выключэньня падсудныя афіцэры Вэрмахту на Нюрнбэрскім працэсе.

Хіба не выконвалі свайго абавязку афіцэры НКВД, якія камандавалі расстрэламі тысяч бязьвінных людзей у Курапатах? Афіцэры, што атрымлівалі «расстрэльныя» пісталет, які выдаваў пад расьпіску (калі верыць апублікаваным дакумэнтам) нехта Лапацік, таксама, урэшце, толькі «прыводзілі загад у выкананьне».

Паняцьце афіцэрскага гонару, калі за ім нешта сапраўды калісьці стаяла, у наш час занадта шырока расплылося. Расейскі палкоўнік Буданаў, які сваімі рукамі задушыў чачэнскую дзяўчыну падчас допыту, ня толькі не пусьціў сабе кулю ў лоб, але ахвотна цяпер косіць пад дурня на судовым працэсе й скардзіцца на галаўны боль. А тым часам вялікая частка расейскай публікі лічыць яго героем і гатовая насіць на руках. Чаго можна было чакаць ад грамадзтва, якое фактычна дало сваім вайскоўцам нефармальную санкцыю на забойства мірных жыхароў, на зьдзек і гвалт над людзьмі толькі за тое, што яны чачэнцы?

Ці можна гаварыць аб гонары афіцэра, адказнага, ні больш ні менш, за ўнутраныя справы краіны, у тым ліку — хаця б паводле сваёй пасады — за зьнікненьне вядомых людзей, які моўчкі прымае новую высокую пасаду? А потым — мабыць, таксама ў знак прызнаньня былых заслуг — яго прызначаюць кіраваць спортам, і ён з імпэтам пачынае камандаваць спартоўцамі. А потым, калі яго не пускаюць у адну з краін Эўрапейскага Зьвязу, нагадваючы аб маральнай (прынамсі маральнай) адказнасьці за зьнікненьне людзей, ён пачынае абурана гаварыць аб прэзумпцыі невінаватасьці.

Ці была ў зьніклых магчымасьць нагадаць сваім выкрадальнікам і катам аб той самай прэзумпцыі?

Зрэшты, маральную адказнасьць з «новымі цэнтурыёнамі», якія службу грамадзтву блытаюць са службай гаспадару, павінна падзяліць само грамадзтва. У атмасфэры ўсеагульнай маны й цкаваньня рэштаў апазыцыі, грамадзтва моўчкі пагадзілася на выдачу індульгенцыі тым, хто й надалей гатовы тую апазыцыю зьнішчаць усімі дазволенымі й недазволенымі сродкамі. Доказаў шукаць ня трэба: аднаго з такіх людзей праваслаўная царква ў асобе мітрапаліта Філарэта нядаўна ўзнагародзіла ордэнам…

# Рэфэрэндуму — так!

Працяг са старонкі 2.

Сапраўды, мо для таго, каб сядзець у Авальнай залі і штампаваць прэзыдэнцкія дэкрэты альбо ствараць ілюзію плюралізму? Што зьяўляецца галоўным крытэрам перамогі: дасягненьне тэктанічных зьмен у грамадзкай сьвядомасьці адносна апазыцыі, здабыцьцё некалькіх мандатаў альбо пэрсанальная раскрутка асобных кааліцыйных дзеячоў? Ці ёсьць парлямэнцкія выбары галоўнай палітычнай кампаніяй году або ўсе высілкі трэба будзе кінуць на іншае, як дыпляматычна выказаўся Лукашэнка, «адказнае мерапрыемства»? Гучных адказаў на гэтыя пытаньні не было дадзена, і праз гэта перадвыбарная кампанія апазыцыі ўжо ператварылася ў беганіну па кватэрах з выхадам на праблемы лямпачак у пад'ездах. Удакладню: бегаць па кватэрах, безумоўна, трэба, зьбіраць подпісы неабходна, гутарыць з выбаршчыкамі аб іх праблемах — абавязкова. Але ці дастаткова гэтага?

Вяртаючыся да агучаных пытаньняў, паспрабую яшчэ раз даць на іх адказы. На маю думку, палітычны кампанэнт кампаніі — спробы данесьці да электарату ідэі, якія могуць мець пэўную мабілізацыйную сілу, — ня менш, а то і больш важны, чым выключна электаральная барацьба. А рэфэрэндум — куды больш істотнае мерапрыемства (тое самае «адказнае»), чым самі па сабе выбары. Палітычную кампанію, аднак, трэба пачынаць загадзя, задоўга да самых выбараў, калі яшчэ няма ні кандыдатаў, ні выбарчых камісій. Гэта відавочна, ведаючы спэцыфіку беларускага заканадаўства, згодна зь якім «крок управа, крок улева» азначае аўтаматычную дыскваліфікацыю на любой ступені працэсу. Аднак паўгоду перад выбарамі не былі адпрацаваны на ўсе сто. Падзей — няшмат (гераічнае «хаджэньне ў народ» з прыпынкамі ў пастарунках заслугоўвае павагі, аднак барацьбу ў інфармацыйным полі нават яно не заменіць), адмысловых акцый, якімі апазыцыя магла б прыцягнуць увагу да сваіх дзеяньняў, — вельмі мала. Прычым больш за ўсіх старалася не якая з кааліцый, а група «Рэспубліка». Аддамо ёй належнае, нягледзячы на абсалютна непатрэбныя, на наш погляд, дзеяньні і выказваньні, якія сапсавалі адносіны спадароў «рэспубліканцаў» з астатняй апазыцыяй. У той жа час, менавіта яны зрабілі штосьці, каб «убіць» у галовы выбаршчыкаў асноватворныя, галоўныя апазыцыйныя ідэі — такія, як «не трэцяму тэрміну» альбо «за справядлівыя выбары».

Аднак у цэлым «палітычны» аспэкт кампаніі ўжо рэанімаваць цяжка. Нягледзячы на тое, што фармулёўкі кандыдатаў, якія здолеюць прайсьці рэгістрацыю, будуць у нечым падобныя адна да адной, выбары аб'ектыўна ператвараюцца ў «лямпачкавую» кампанію, дакладней, у некалькі дзясяткаў асобных кампаній, якія не пераплятаюцца паміж сабой. У «лямпачкавай» барацьбе, аднак, у апазыцыі шанцаў мала. Як бы там ні было, сытуацыя ў эканоміцы, безумоўна, не настолькі катастрафічная, каб бясконца апэляваць да яе, а спаборнічаць у рамонце сапсаваных кранаў з прадстаўнікамі ўлады цяжка. Між тым, улада, што цікава, вядзе менавіта «групавую» прапаганду, абліваючы брудам апазыцыю агулам і паводле вызначанага стандарту. Зразумела, што багата на каго прапаганда дзейнічае з дакладнасьцю наадварот, але калі б такіх была большасьць, у нас ніколі не было б Лукашэнкі.

Усё так і будзе цячы, калі раптам улады ўсё ж ня пойдуць на абвяшчэньне «адказнай кампаніі». Аб рэфэрэндуме самім па сабе мы разважаем як аб справе вырашанай, пытаньне — ці будзе ён сумешчаны менавіта з парлямэнцкімі выбарамі. Гэта можа гучаць як парадокс, але менавіта рэфэрэндум здольны надаць другое дыханьне апазыцыі. Тады яна здолее адысьці ад «сацыялкі» да сапраўды галоўнага палітычнага пытаньня, па якім яе пазыцыя, дарэчы, супадае з думкай большасьці беларусаў. А ў выніку гэтага рэфэрэндум, пры правільным падыходзе з боку апазыцыі, можа дапамагчы ёй «выцягнуць» і перадвыбарную кампанію — калі яна сапраўды ператворыцца ў агульнанацыянальную і пройдзе пад лёзунгам «не трэцяму тэрміну».



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Калі хочаце на гэтых выбарах чагосьці іншага, чым прадыктавана зьверху, дасягніце гэтага самі.

Кажу гэта таму, што наўрад ці ўлады пасьпеюць выйграць рэфэрэндум да 17 кастрычніка менавіта ў галавах выбаршчыкаў. У гэтым выпадку недавер да рэфэрэндуму перарастае ў недавер і да парлямэнцкіх выбараў. На гэтым падмурку ўжо можна будзе грунтаваць і будучую прэзыдэнцкую кампанію. Зрэшты, акурат таму я моцна сумняваюся, што рэфэрэндум усё ж такі будзе назначаны на 17 кастрычніка. Уладам куды зручней спачатку «элегантна» выйграць лямпачкавыя выбары, а потым, распрапагандаваўшы разгром апанэнтаў, давесьці справу і да плебісцыту — недзе ў наступным годзе.

Аднак чаго ўладам клапаціцца? Нават калі два галасаваньні і будуць сумешчаны, імавернасьць эфэктыўнага супраціву далёка не стопрацэнтная. І вось менавіта тут варта сказаць пра галоўную прычыну майго пэсымізму ў гэты палітычны момант. Яна далёка не ў стратэгіі і не ў тэхналёгіях.

Пры той запалоханасьці, што пануе ў грамадзтве, аніякая стратэгія і тактыка не спрацуе. Пры тым (нулявым) узроўні грамадзянскай салідарнасьці, што можна было назіраць за апошнія часы, «зачыстка» апанэнтаў адбываецца без праблем. Людзей, здольных прапагандаваць і агітаваць, стала на парадак менш, чым было яшчэ некалькі гадоў таму. А колькі зь іх здольны выйсьці на вуліцу, калі гэта сапраўды будзе трэба? Мабілізацыйны патэнцыял дэмакратычных сіл выключна нізкі, і самых дэмакратаў ужо даўно абвінавачваць у гэтым нельга. Мода на крытыку апазыцыі стала за апошні час адмысловай формай сублімацыі ўласнага страху і абыякавасьці. У такіх абставінах можна праводзіць хоць тры рэфэрэндумы і ўсе магчымыя выбары запар — вынік будзе забясьпечаны.

Тыя, хто яшчэ здолеў знайсьці ў сабе сілы працаваць сёньня, заслугоўваюць найперш павагі, а не чарговай порцыі лаянкі за чарговую праваленую кампанію. Таму калі хочаце на гэтых выбарах чагосьці іншага, чым прадыктавана зьверху, дасягніце гэтага самі. Усё ў вашых руках, а не кіраўнікоў штабоў, партыйных лідэраў ці тэхнолягаў. Знайдзіце ў вашай акрузе вашага кандыдата. Прапануйце яму дапамогу са свайго боку. Паспрыяйце ў назіраньні. Проста выкажыце сваю маральную падтрымку. Калі гэтага ня зробіце — можаце зноўку разважаць, якая ў нас няздатная апазыцыя. Але — безь мяне.

**Д-р Віталь Сіліцкі**


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Хросны ход у вёсцы Лаўрышава (Наваградчына), дзе аднаўляецца манастыр. Вернікі нясуць абраз з выявай сьвятога Елісея Лаўрыскага. Кім ён быў — загадка. Адны варыянты жыцця называюць яго сынам «бязьлітаснага паганца» Тройдзеня, іншыя — сынам Траняты, адвечнага Міндоўгавага суперніка, трэція — настаўнікам і хросным бацькам сьвятога князя Лаўрыша-Войшалка. Ёсьць сьцьверджаньні, што і на вокладцы Лаўрыскага Эвангельля менавіта Елісеева, а ня Войшалкава выява. Цуды сьвяты пачаў рабіць пасьля сьмерці. Як сьведчыць легенда, у пачатку XVI ст. ён адвёў ад манастыра татараў. Крымчакам падалося, што манастырскі двор поўны цяжкой коньніцы, і яны ў страху вялікім уцяклі.**

# Паломніцтва ў Зэльву



**У гісторыі Беларусі ёсьць асобы, якія веліччу духу зрабілі б гонар любой нацыі. У ліку такіх паэтка Ларыса Геніюш, якая прайшла жахлівыя канцлягеры, але не скарылася і да канца жыцьця не прыняла савецкага грамадзянства. Кожны год на дзень нараджэньня паэткі ў Зэльву прыязджаюць людзі з усёй краіны.**

Нарадзілася Ларыса Геніюш (дзявочае прозьвішча Міклашэвіч) у маёнтку Жлобаўцы Ваўкавыскага павету. Лёс быў надзвычай жорсткі да паэткі і яе блізкіх. Бацька згінуў у Гарадзенскай турме ў 1939-м, маці памерла ад голаду ў высылцы ў Казахстане ў 1945-м, брат Аркадзь злажыў галаву пад Монтэ-Касіна ў баях з фашыстамі.

У лютым 1949-га паэтку засудзілі на 25 гадоў савецкіх лягераў. Выйшаўшы на волю, Ларыса Геніюш пасялілася на радзіме мужа ў Зэльве. Хата Геніюшаў у Зэльве стала месцам паломніцтва для адраджэнцаў.

Улады павыкідалі творы паэткі са школьных праграм. Але неўміручыя радкі нельга сьцерці цыркулярамі. Нядаўна ўбачыла сьвет кніжка дзярэчынскага краязнаўца Пятра Марціноўскага «Наша Лорка». Летась ля зэльвенскай царквы ўсталявалі помнік паэтцы. На ім бракуе памятнай шыльды, але гэта справа часу.

Сёлета ўшанаваць памяць паэткі ў Зэльву прыехалі сябры розных партыяў — Партыі БНФ, Грамады, КХП-БНФ. З прамовамі выступілі зэльвенец Юры Качук, гарадзенцы Віктар Сазонаў і Вадзім Саранчукоў, Яўген Даўгілевіч з Баранавіч. А паэтка і перакладніца Алена Таболіч, якая родам з Зэльвеншчыны, прачытала твор Геніюш у арыгінале і па-ангельску. Пасьля ўсе разам прасьпявалі гімн «Магутны Божа».

У наступным годзе спаўняецца 95 год з дня нараджэньня Ларысы Геніюш. Юбілей мае адзначыцца больш маштабнымі ўрачыстасьцямі.

**Х.Каменскі, Зэльва**

## Банкрутуюць рэстараны

Наведнікаў рэстарану на рэканструяваным чыгуначным вакзале Воршы цяпер сустракае ля ўваходу рыцар у латах з гарадзкім сьцягам у руках. Памяшканьне пасьля рамонту аздоблена гравюрамі, зробленымі паводле фатаздымкаў старадаўняй Воршы. На жаль, шмат якія помнікі даўніны засталіся толькі на паперы. Дарэчы, прывакзальны рэстаран — адзін з двух, што захаваліся ў Воршы. Апошнім часам у горадзе праз адсутнасьць кліентаў былі зачыненыя тры рэстараны. У былой «Плянэце» цяпер аддзяленьне Нацбанку, у «Каліне чырвонай» — крама будматэрыялаў. Зачынены нядаўна і адзіны прыватны рэстаран «Шчадрэц». Яго гаспадар палічыў за лепшае перавесьці свой бізнэс у Літву. У цэнтры гораду застаўся, такім чынам, усяго адзін рэстаран у гатэлі «Ворша». Звычайна тут частуе гасьцей гораду мясцовае чынавенства. Застаецца дадаць, што ў Воршы няма цяпер і ніводнай грамадзкай сталоўкі.

## Халяўныя патрыёты

Год таму два ўладальнікі аршанскіх маршрутных таксі заклікалі сваіх калег (іх звыш за 150) дарма вазіць вэтэранаў вайны. Гэтую дабрачынную акцыю падтрымалі тады ўсяго некалькі прыватнікаў. Нядаўна адзін зь іх вывесіў на сваёй машыне аб'яву пра тое, што бясплатна возіць ня толькі вэтэранаў вялікай айчыннай вайны, але і воінаў-інтэрнацыяналістаў ды вучняў вайсковапатрыятычных клясаў (калі тыя ў адпаведнай форме). Праўда, клясаў такіх у Воршы пакуль усяго два. Але, магчыма, стане болей, бо выгадна ў нашай краіне быць штатнымі патрыётамі.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

## Паскевіч б'е Чартарыйскага

Уладныя структуры Гомельшчыны зноўку паказалі сваю прыхільнасьць да імпэрскай традыцыі. Ня так даўно ў Добрушы быў адкрыты бюст Фёдара Паскевіча — князя, які валодаў у XIX ст. Гомелем. Безумоўна, варта адзначыць яго заслугі ў мадэрнізацыі краю (у Добрушы была пабудавана папяріня, пры якой меліся бальніца й сталоўка). Але зацыкленасьць на падрасейскім пэрыядзе Гомельшчыны перарастае ў непрыемную тэндэнцыю. Тым часам як імёны-прозьвішчы з дарасейскае эпохі (Сапегі, Красінскія, Чартарыйскі) ведаюць адзінкі.

## Цьвік у патрэбным месцы

За апошнія паўгоду 1638 гамельчукоў абверглі знакаміты анэкдот пра беларуса і цьвік. Прынамсі, столькі пісьмовых зваротаў зарэгістравана Гомельскім гарвыканкамам са студзеня. 12% усіх скаргаў былі калектыўнымі. Галоўная тэматыка — кепскае аказаньне жыльлёва-камунальных паслуг.

## Наказ ад улады

Гарвыканкам зладзіў сустрэчу прадстаўнікоў афіцыйна зарэгістраваных палітычных партый з намесьнікам бурмістра (мэра) Сяргеем Парошыным. Улада зусім не імкнулася праявіць тым самым нейкую добрую волю. С.Парошын проста даваў парады кандыдатам у дэпутаты — дзяліцца з выбарцамі «не сваімі фантазіямі, а канкрэтнымі лічбамі й фактамі». Да таго ж палітычныя дзеячы былі строга папярэджаныя, што распаўсюджваньне агітацыйнай прадукцыі па-за межамі адведзеных для гэтага месцаў будзе карацца спагнаньнямі.

**Сяргей Балахонаў, Гомель**

## Страйк у Брузгах

Манаполія «Белдзяржстраху» на продаж полісаў міжнароднай сыстэмы абавязковага страхаваньня грамадзянскай адказнасьці (т.зв. «Зялёнай карты») часова прыпынена пасьля страйку кіроўцаў у Брузгах пад Горадняй. Канчатковае рашэньне ў гэтым пытаньні мусіць прыняць Савет Міністраў. 600 беларускіх машын заблякавалі пераход 11—12 жніўня. Паводле ўказу прэзыдэнта, грамадзяне Беларусі, якія выяжджалі за мяжу, мусілі набываць «Зялёныя карты» толькі ў «Дзяржстраху». Страхавы поліс для легкавога аўтамабіля на 15 дзён у «Белдзяржстраху» каштуе 35 эўра, для грузавога — 65 эўра. У той час як 15-дзённы поліс для грузавіка ў польскай страхавой кампаніі каштуе 25 еўра.

## Кручкоўскі ўхіляецца ад суду

Кіраўнік Саюзу палякаў Беларусі Тадэвуш Кручкоўскі ў другі раз не зьявіўся ў суд на пазоў заснавальніка Гандлёва-прамысловай палаты Саюзу палякаў Зыгмунда Пелуця аб абароне гонару і годнасьці. Справа будзе разабраная пазьней.

**Паводле Pahonia.promedia.by**

## Полацак вылучыў Сом і Салаўёва

13 жніўня ў Полацку (акруга №28) зарэгістраваныя тры ініцыятыўныя групы — прыватнага прадпрымальніка Ірыны Андрэевай, вайсковага пэнсіянэра (ПКБ) Леаніда Карпішына, а таксама настаўніцы СШ №5 (Партыя БНФ) Леры Сом. Яшчэ раней была зарэгістравана ініцыятыўная група цяперашняга дэпутата палаты Ўладзімера Ісаева.

У Полацкай сельскай акрузе №29 зарэгістравана шэсьць ініцыятыўных груп — дырэктара Полацкага аграрна-тэхнічнага каледжу Ўладзімера Дзюбы, супрацоўніка Полацкага гаррайаддзелу па надзвычайных сытуацыях Анатоля Літвіненкі, юрыста з Наваполацку Віталя Мязіцава, дэкана завочна-прававога факультэту прыватнай установы адукацыі «Беларускі інстытут праваэнаўства» Ірыны Сідарчук, індывідуальнага прадпрымальніка Зьмітра Салаўёва (БНФ) дый дзейнага дэпутата Міхаіла Сасонкі.

**ВК, Полацак**

## У памяць Алеся Адамовіча

Як вядома, славуты беларускі пісьменьнік і грамадзкі дзяяч Алесь Адамовіч нарадзіўся ў вёсцы Канюхі Капыльскага раёну. Там у сярэдзіне 20-х гадоў мінулага стагодзьдзя ў мясцовым Доме адпачынку працавалі ягоныя бацькі. Зямляк пісьменьніка, адзін зь лідэраў Саюзу прадпрымальнікаў Анатоль Самусевіч задумаў увекавечыць памяць Алеся Адамовіча — паставіць на тым месцы, дзе жылі ягоныя бацькі (дом не захаваўся), знак. Ён ужо правёў кансультацыі з дачкой пісьменьніка Натальляй, у Саюзе пісьменьнікаў, Фондзе культуры, аблвыканкаме. Усюды адобрылі такую задуму, як і прапанову прысвоіць мясцовай школе імя Алеся Адамовіча.

## Шыхтуюць прызыўнікоў да абэліску воінам-інтэрнацыяналістам

На вуліцы імя 14-ці слуцкіх партызан (былі расстраляны палякамі летам 1920 г.) некалькі гадоў таму на адкрытай, бачнай з суседніх вуліц пляцоўцы паўстаў гранітны абэліск, дзе на бронзавай дошчачцы выпісалі прозьвішчы дзесяці салдатаў Случчыны, што загінулі ў Аўганістане.

У дні сьвяткаваньня чарговых угодкаў перамогі над гітлераўскай Германіяй да гэтага абэліску вэтэраны ВАВ ускладаюць вянкі, кветкі, салдаты зь мясцовага гарнізону даюць салют з аўтаматаў.

У тым, што не забываюць ахвяраў згубнай палітыкі купкі састарэлых кіраўнікоў КПСС, якія развязалі крывавую бойню на тэрыторыі суседняй краіны, нічога дрэннага ня бачу. Хоць, думаецца, для маці тых загінулых хлопцаў гэтыя вянкі і салюты радасьці не прыносяць. А хтосьці ўжо хоча, каб і моладзь раўнялася ў жыцьці на іх. Нядаўна сюды на ініцыятыву гарваенкамату прывялі строем прызыўнікоў, якім ісьці на службу ў армію. Прыйшлі сюды афіцэры, вэтэраны, былыя воіны-аўганцы. У сваіх прамовах-зваротах яны заклікалі прызыўнікоў быць такімі ж мужнымі воінамі, як і іх землякі, што не вярнуліся з Аўганістану. А пара б ужо пранафталінены тэрмін «воін-інтэрнацыяналіст» выключыць з ужытку.

**Міхась Кутнявецкі, Слуцак**

# А качкі не пацярпелі

Пачатак паляўнічага сэзону на птушак падняў на ногі ледзь ня ўсю аршанскую раённую міліцыю. Зьбіраліся нават выклікаць віцебскі АМАП. А ўсё праз тое, што чатыры паляўнічыя выехалі на паляваньне ды заначавалі ля возера. У гэтую ж ноч група мясцовай моладзі пасьля п'янкі пайшла купацца ў гэты вадаём. Яны ўзьнялі такі галас, што ў паляўнічых здалі нэрвы і яны пачалі страляць. Стварылася ілюзія перастрэлкі дзьвюх груповак, што і выклікала вялікую заклапочанасьць міліцыі. Раніцай пачалі лічыць «страты»: у плячах некаторых купальшчыкаў засталіся шрацiны. І хоць стралялі раззлаваныя паляўнічыя паверх галоў, але, відаць, занізка. Цяпер вінаватых чакае суд.

**ЯЖ**


«ОХОТНИК И РЫБОЛОВ»

**Палітыку і журналісту Аляксею Шэіну 28 гадоў. Ён мяркуе балятавацца ў ПП НС у Валожынскай акрузе. Ягоны бацька нарадзіўся ва Ўладзікаўказе (Асеція) у сям’і вайскоўца, закончыў Інстытут замежных моў у Менску (франкафонія й арабістыка). Аляксей нарадзіўся ў Менску, пасьля сям’я пераехала ў Горадню. Маці была журналісткай, ад утварэньня радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная» працавала там. Потым шчыравала рэдактарам гарадзенскага радыё. Сам Аляксей скончыў філфак БДУ, але стала займаецца палітыкай. Захапляецца геалёгіяй, літаратурай, кінадакумэнталістыкай. Нежанаты. Мае 24-гадовага брата. Зьбіраецца заснаваць хрысьціянска-дэмакратычны палітычны рух.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# «Мы можам жыць прыгажэй, прыямней, лепей»

**«НН»: Вы заяўляеце, што будзеце ствараць хрысьціянска-дэмакратычны рух. Але падобна, што ў Эўропе гэтыя рухі выходзяць з моды, дый у Севярынца гэта ня надта ўдалося…**

**АШ:** Любы ўздым — эканамічны, сацыяльны й культурны — заўжды грунтаваўся на духоўным уздыме. Амэрыка паднялася, бо яе заснавальнікі былі людзі з выразным хрысьціянскім сьветапоглядам, зь верай у Бога, з адпаведным стаўленьнем да працы й жаданьнем посьпеху. А ў XX ст. добрым прыкладам паўстаньня краіны можа служыць Паўднёвая Карэя — будысцкая краіна, у якой у 50—70 гады палова насельніцтва перайшла ў пратэстантызм. Выйгралі будысты, хрысьціяне і гаспадарка. Вера асьвяжыла грамадзкі клімат, і на гэтым фэномэне вырас славуты азіяцкі тыгр. Карупцыя на парадак меншая ў краінах, дзе людзі, у тым ліку чыноўнікі, вераць у існаваньне пекла…

**«НН»: Каталіцкі касьцёл заявіў, што пекла са смалою, патэльнямі, смуглымі чарцямі, вечным агнём і скрыгатам зубоў няма…**

**АШ:** Вашы пытаньні сьпіхнуць нас да глыбіняў тэалёгіі, але я адкажу: натуральна, пекла з патэльнямі не існуе. Пекла — духоўныя пакуты. Ісус сказаў, што ў пекле людзі аддзелены ад Бога. Аднак вяртаемся да пытаньня. Духоўны пад’ём — пэрспэктыва для Беларусі. Цяпер яго няма нізваньня, адсюль цяжкі стан грамадзтва. Калі мы паглядзім на пратэстанцкія і каталіцкія сем’і, мы ўбачым большую заможнасьць, шчаснасьць, меншую колькасьць звад, алькагалізму й разводаў. Пратэстанты ўвогуле амаль ніколі не разводзяцца.

**«НН»: Першае месца ў Эўропе па разводах трымаем. Сацыёлягі кажуць: роспач, атамізацыя грамадзтва…**

**АШ:** Хрысьціянскія сем’і — ня фікцыя, гэта рэальныя сем’і, дзе многа дзяцей, дзе бацькі любяць дзяцей, а дзеці — бацькоў. Калі шчасьце чалавека і сям’і, асабісты, індывідуальны посьпех і прагрэс залежаць ад хрысьціянскасьці, духоўнасьці, гэты ж закон дзейнічае і на грамадзкім узроўні.

> Мы жывём горш, чым заслугоўваем. Зьмяніць сытуацыю можна невідавочнай акуратнай працай.

## Богу цікавае ўсё

**«НН»: Гучыць ідэалістычна. Беларусы — прагматычныя людзі (найлепшыя беларускія мысьляры нават кажуць, што груба й вузка прагматычныя, з ухілам у бульбяны рэалізм). Палітыку й рэлігію людзі ўспрымаюць як рэчы процілеглыя — «бы алей і вада, зьмешваць іх — адна бяда». Для палітыка файна, калі ён чалавек хітры, спрытны, у меру амаральны, дзейсны, схільны да закулісных гульняў і кампрамісаў. Не падобна да партрэта добрага хрысьціяніна.**

**АШ:** Гэты ўстарэлы падыход культываваўся ў часы Маркса і культывуецца ў постмарксісцкія часы, у якіх мы тут знаходзімся. КПСС заяўляла: хай ваш Бог застаецца ў храме, не пераступае яго парогу. Ёсьць іншыя падыходы, як у той жа Скандынавіі. Калі чалавек верыць у Бога, ён не павінен адкідаць палітыку. З гледзішча сучасных філязофскіх плыняў, Богу, які стварыў сьвет, цікавае ўсё, у тым ліку й палітыка. Бог цікавіцца ня толькі індывідуумам і ягонай сфэрай дзейнасьці, але й тым, як разьвіваецца грамадзтва. Меркаваньне, што палітыка — брудная рэч, гэта стэрэатып. Пытаньні можна вырашаць і ня надта пэцкаючыся. Да таго ж, а хто яе будзе «чысьціць», як ня «чыстыя» людзі? Зь іншага боку, палітыка ня больш брудная, чым усе астатнія сфэры чалавечае дзейнасьці. Я калісьці працаваў у музэі Янкі Купалы. Музэй! Янкі Купалы! Але й там пэўнага часу быў сапраўдны гадзючнік.

**«НН»: Давайце пагаворым рэзка, паўтрыруем зьлёгку: паспалітае грамадзтва ўважае хрысьціянства за слабасьць. Хрысьціянін — гэта нехта хворы, слабы й бедны. Хрысьціянін — ня мача, хрысьціянін успрымаецца не як пасьпяховы чалавек, а як варона. Да таго ж, як сьведчаць сацыялягічныя дасьледаваньні, грамадзтва пасьпяхова ламае ўсе запаветы хрысьціянства: квітнее п’янства, аборты, разводы. Дзейнічае перакананьне: ня ўкрадзеш — не пражывеш, суд — як дышла. 65% дзяўчат хочуць не каханага, а багатага мужа і да т.п. Гэта Вашы выбарцы. Няўжо вы думаеце, што яны прагаласуюць за хрысьціяніна?**

**АШ:** Усё гэта наступствы сацыялістычных часоў. Я ведаю, што гэта трэба мяняць, і ведаю, як патрэбна дзейнічаць. Людзям жа трэба сказаць, што хрысьціяне — пасьпяховыя, свабодныя людзі. Заходняе хрысьціянства, у адрозьненьне ад расейскага праваслаўя, наўпрост заахвочвае людзей да шчырай, разумна арганізаванай працы. У мяне некалькі знаёмых бізнэсоўцаў-пратэстантаў (бізнэс жа таксама лічыцца «нехрысьціянскім» рамяством), якія маюць посьпех нават у гэтай заганнай эканамічнай сыстэме.

> Гэта пытаньне эліты, пытаньне найбліжэйшых 20—30 гадоў — як мы будзем жыць найбліжэйшыя некалькі стагодзьдзяў.

## Генная памяць

**«НН»: Чаму для свае палітычнае дзейнасьці Вы абралі Ракаў?**

**АШ:** Там нарадзілася й пахаваная мая маці, там жывуць мае найбліжэйшыя сваякі, зь дзяцінства я летаваў у Ракаве, ну і, нарэшце, мой прапрапрадзед Францішак Драгун у XIX ст. быў кіраўніком Ракаўскай воласьці і цяпер ляжыць на Ракаўскіх могілках. Можа, ува мне гаворыць генная памяць? Мая акруга — Маладачанскі раён без Маладэчна і частка Валожынскага раёну. З аднаго боку, гэта Заходняя Беларусь, прытым блізкая да Менску, але з другога боку, там з пачатку 90-х не існуе ніякіх палітычных структур — ні фронтаўцаў, ні камуністаў, ні сацыял-дэмакратаў. Гэта, зрэшты, акруга, якая магла б вырасьці ў такі агульнабеларускі рэкрэацыйны абшар, — там цудоўныя мясьціны, дзясяткі санаторыяў. Але і рэкрэацыйныя ўстановы, і сельская гаспадарка разваленыя. Што дзіўна: блізка ж да Менску, павінны б больш баяцца начальства. Дый прадукцыю збываць ёсьць дзе. Гэты абшар магла б выцягнуць сфэра абслугоўваньня. Гэта галоўная пэрспэктыва Ракаўшчыны і Валожыншчыны. Буйных прадпрыемстваў там няма. Але менавіта дзякуючы гэтаму захавалася некранутая прырода — лясы, Налібоцкая пушча, рэчкі. Стаўку можна рабіць толькі на невялікі бізнэс.

**«НН»: А што там за людзі, якія настроі?**

**АШ:** За год адбыліся нейкія імклівыя зьмены ў палітычных настроях. Калі раней людзі былі за Лукашэнку, паўтаралі рэфрэн, што яму замінаюць, то цяпер паўсюдна, нават галышом у ракаўскай лазьні, людзі гавораць не пра лёгкую пару,

а пра тое, як надакучыў Лукашэнка па кожным канале тэлевізіі цэлы дзень, па радыё, партрэты ягоныя ўсюды паразьвешвалі… Такая рэзкая эмацыйная рэакцыя непрыманьня. Мне гэта было нечакана. Дарэчы, з тых краёў паходзіць Вячаслаў Кебіч — зь вёскі Канюшаўшчына Валожынскага раёну. У 1994 г., здавалася, за яго павінны былі галасаваць, але прагаласавалі за Лукашэнку, бо Кебіча страшна не любілі. Цяпер тое самае з Лукашэнкам: палюбілі, пагуляліся й кінулі.

## На дарозе зь яйка

**«НН»: А з чым Вы, палітык, пойдзеце да землякоў? Ці не адкінуць і Вас?**

**АШ:** Банальна й нясьціпла, але я люблю краіну і мне падабаюцца людзі, якія тут жывуць. Я ўпэўнены, яны жывуць ніжэй за свае заслугі й магчымасьці. З другога боку, ніхто не жыве ніжэй за свае магчымасьці («Я няварты, каб Ты ўвайшоў да мяне»): за апошнія 400 гадоў мы ўвесь час рабілі няправільныя палітычныя выбары як народ…

**«НН»: Ня надта ж хто й даваў тыя выбары рабіць…**

**АШ:** І ўсё ж. Можна было паіншаму павярнуць сваю гісторыю. Я маю на ўвазе канкрэтную, рэальную супольнасьць людзей, якія тут жывуць, і ведаю, што мы можам жыць прыгажэй, прыямней, лепей, чым цяпер. Я веру, што Бог недарэмна даў мне нарадзіцца ў гэтай краіне і ў гэты час. Ёсьць у нас унікальны шанец у тым пляне, што беларусы — нацыя XXI ст. Мы не да канца сфармаваліся. Мы вылезьлі зь яйка, сталі на ногі, абсохлі — і якімі мы вырасьцем, залежыць ад таго, хто нас будзе фармаваць. Гэта пытаньне эліты, пытаньне найбліжэйшых 20—30 год — як мы будзем жыць найбліжэйшыя некалькі стагодзьдзяў.

**«НН»: Вы гаворыце рэчы, якія натхняюць адну катэгорыю людзей. А як натхніць так званага «простага чалавека» (калі такі фэномэн сапраўды існуе)?**

> Хрысьціянства выцягнула мяне з дэпрэсіі. Яно можа выцягнуць і ўсю нашу нацыю.

**АШ:** Мой унівэрсытэцкі выкладчык Павал Навуменка гаварыў: «Калі вы скажаце пры мне «просты чалавек», я буду біць вас па пальцах». Кожны чалавек — вартая павагі індывідуальнасьць. Адклікацца на ягоныя прагненьні, мары й жаданьні — адна з галоўных якасьцяў палітыка, і ёй можна дасканала навучыцца. Усіх людзей аб’ядноўваюць аснаватворныя каштоўнасьці — напрыклад, годнае жыцьцё, добрыя адносіны ў сям’і, добрая праца й фінансавая незалежнасьць. Гэта цікава і акадэміку, і непісьменнаму.

**«НН»: Адзін палітык сказаў мне, што дзяржава — шкілет краіны. Цяпер наша краіна выглядае нейкай крывабокай. Што трэба зьмяніць, каб стаць прыгожай краінай?**

**АШ:** Нельга імплянтаваць нешта, да чаго краіна не дарасла. Людзям трэба казаць пра дэмакратыю і правы чалавека, ставіць ім плянку, вышэйшую за іх цяперашняе разуменьне. Бо, калі быць голым папулістам і гаварыць тое, што яны жадаюць пачуць, будзе рэгрэс, а не прагрэс. Палітык мусіць выхоўваць нацыю. Інакш бяда. Я жыў у сяброў у Нямеччыне і бачыў, як пакутуюць былыя казахскія немцы. Для іх там стаяць занадта высокія плянкі — у побытавай, палітычнай культуры, культуры працы й карпаратыўных адносін, грамадзкіх дачыненьняў — ва ўсім. Яны, пажыўшы 3—5 год, так і не ўзьняліся да гэтага. Бо савецкія ўлады не выхоўвалі грамадзян. І людзі заставаліся савецкімі. Палітык павінен старацца, каб людзі зьмяняліся знутры на лепшае. Калі чалавек не зразумее, што ёсьць нешта большае, чым нейкія трывіяльныя рэчы, то, хоць ты яго ў Нямеччыну вывезі ці накінь яму дэмакратыю і правы чалавека, ён застанецца тым, кім ён ёсьць. Зьмяніць сытуацыю можна невідавочнай акуратнай працай, якая прынясе відавочны плён, нават на добры лад, толькі праз некалькі дзесяцігодзьдзяў.

**«НН»: Вы лічыце, што грамадзтву трэба 20—30 год, каб засвоіць сьціплыя ўрокі дэмакратыі?**

**АШ:** Што не вызваляе нас ад пабудовы дэмакратычнага грамадзтва ўжо цяпер.

## Простае шчасьце людзкое

**«НН»: Пратэстантызм — гэта Ваша сямейная вера?**

**АШ:** Я быў атэіст з, адпаведна, атэістычнай сям’і, спрачаўся з польскай раднёй, якая імкнулася навярнуць мяне ў веру. А потым на першым курсе ўнівэрсытэту я ўпаў у глыбокую дэпрэсію, якая доўжылася гадамі. Я зьнемагаў ад барацьбы зь ёй і нарэшце сказаў: «Калі Ты ёсьць, выцягні мяне». Было вельмі пагана. Са мной на філфаку навучаліся колькі пратэстантаў, я прыйшоў да іх на пятым курсе ў царкву і, дзякуй Богу, жыцьцё зьмянілася. Гэта не бацькоўская вера, але мая.

**«НН»: У дзяцінстве людзі прагнуць вадзіць тралейбусы, лятаць на самалётах і прадаваць марожанае. Няўжо Вы марылі стаць палітыкам?**

**АШ:** Я марыў стаць пісьменьнікам. Супэрбэстсэлерам была кніжка Эдуарда Скобелева «Незвычайныя прыгоды Арбузіка й Бябешкі», і я ў першай клясе напісаў працяг гэтае аповесьці, які потым згубіўся. (Ня ведаў я, што зь сябе ўяўляе гэты чалавек…) Пасьля вучобы ў Горадні я паступіў у ліцэй пры БДУ, сядзеў за адной партай з Раманам Арловым — то ягоны бацька Ўладзімер Арлоў пабуджаў мяне пісаць. А адна пісьменьніца выдала мне стыпэндыю як аўтару, што падае надзеі. Цяпер я адчуваю, што нечым павінен адплаціць, — пішу казку для дзяцей, якая апавядае пра тое, што

> Я выйграў чэмпіянат Беларусі па шліхавой пробе. Лепш за ўсіх намываў золата.

Бог добры і любіць чалавека. Пішу і словы для мюзыклу пра XVI ст., часы Рэфармацыі, час Сымона Буднага, Радзівіла Чорнага й Яўстафія Валовіча, час другога Статуту, які замацаваў свабоду веравызнаньня ў ВКЛ. Разам з прафэсійнымі музыкамі з эвангельскіх цэркваў мы паставім гэты мюзыкл. Таксама мы з адной камандай амаль запісалі матэрыял аб пратэстанцкім супраціве ў гады савецкай улады — 10 гадзін інтэрвію зь вернікамі, якіх перасьледавалі за Саветамі, якія сядзелі ў лягерах, былі ў высылках. І якія ў 70—80-я гады арганізавалі нелегальны хрысьціянскі друк у Беларусі. Аказваецца, у нас было некалькі падпольных друкарань (толькі ў Менску — чатыры), дзе друкавалі Новы Запавет, буквары для дзяцей, іншую хрысьціянскую літаратуру. Пасьля выбараў мы зробім паўнавартасны дакумэнтальны фільм.

**«НН»: У мяне ёсьць эратычна-патрыятычная вэрсія: тыя, хто захапляецца геалёгіяй, лепей адчуваюць цела Беларусі і таму больш кахаюць яе (маю на ўвазе Вас і Севярынца).**

**АШ:** Я зь юнацтва захоплены геалёгіяй. Езьдзіў у экспэдыцыі з Гарадзенскім геагуртком па Беларусі, у Запаляр’е, на Ўрал. Зьбіралі камяні. Аднойчы мы тыдзень пажылі ў закінутым сталінскім лягеры ў Запаляр’і, між гор. Лягер закрылі ў 1954 г. Туды не дабіраецца нават усюдыход, мы 20 км ішлі да яго па тундры. У 1990 г. я выйграў чэмпіянат Беларусі па шліхавой пробе. Лепш за ўсіх маладых беларусаў намываў золата. Трасеш такім латком, лёгкія пароды — алювій, дэлювій — сплываюць, а цяжкія застаюцца. Па іх ты мяркуеш, якія каштоўнасьці залягаюць у нетрах.

**«НН»: Філязофскі занятак. Я ж і кажу, ня ўсё так проста з гэтай геалёгіяй…**

**Гутарыла Сьвятлана Курс**

# Лідзкія сустрэчы



**Аляксей Хадыка, рэдактар часопісу «Спадчына», выканаўчы дырэктар РГА «Таварыства аматараў ведаў (філяматаў)»**

Усё-такі дзіўная краіна — Беларусь! Хіба толькі ў нас магчыма, каб праз уласную забыўчывасьць (на літару закону) пратэрмінаваны прэзыдэнт кіраваў дзяржавай толькі на той падставе, што ён, бачыце, за 10 год гэтаму як сьлед не навучыўся (значыць, трэба працягнуць), ды своечасова не прызначыў выбараў наступніка, ды яшчэ ён — прэзыдэнт алімпійскага камітэту, а год якраз алімпійскі. Ніводная краіна Эўрасаюзу, зь якім мы ад траўня 2004 г. (у сувязі з уступленьнем у яго Польшчы, Літвы і Латвіі) мяжуем, не дазволіла б сабе раскошы такога бязладзьдзя. Там на такі выпадак існуюць дзейсныя судовая і праваахоўная, заканадаўчая і рацыянальна пабудаваная выканаўчая сыстэмы. На крайні выпадак, ёсьць якасна арганізаваная мэдычная дапамога, што дазваляе ўсяму грамадзтву не пакутаваць у выніку амнэзіі паасобных грамадзян.

Адрозьненьні Беларусі і ЭС, як і эканамічныя, геапалітычныя, нават чалавечыя фактары, зьвязаныя з аб’яднаньнем Эўропы, тым ня менш, непасрэдна цікавяць беларусаў, большасьць зь якіх (ужо ў верасьні 2002 г., паводле НІСЭПД, такіх было 53,4%) бачаць сваю будучыню ў эўрапейскай сям’і. І таму розныя грамадзкія арганізацыі ўсё часьцей зьвяртаюцца да пытаньняў узаемадачыненьняў ЭС і Беларусі. Ад гэтага інтэлектуальнага мэйнстрыму апошніх месяцаў не застаўся ўбаку і шырокавядомы Народны ўнівэрсытэт, што ўвасобілася ў 14 зборніках навучальных матэрыялаў і 9 выпусках часопісу «Філаматы». Згаданы часопіс папулярызуе дзейнасьць Рэспубліканскага грамадзкага аб’яднаньня «Таварыства аматараў ведаў (філяматаў)», сяброўскага саюзу людзей, апантаных пашырэньнем у грамадзтве дакладных і сучасных ведаў. Таварыства здолела афіцыйна арганізавацца ва ўнікальны час — у 2002 г., калі міністэрства юстыцыі Беларусі амаль аўтаматычна адкідала спробы юрыдычна аформіцца самых разнастайных грамадзянскіх ініцыятыў.

Разумеючы, што веды набываюць характар матэрыяльнай сілы пры ўмове іх мэтанакіраванага адраснага пашырэньня, філяматы зьвярнуліся да тых асоб, якія ўвасабляюць (і адначасова крышталізуюць) волю шараговых грамадзян да эўраінтэграцыі пасьля выбраньня іх, гэтых асоб, дэпутатамі на парлямэнцкіх выбарах 2004 г., з заклікам да супрацоўніцтва. Запланаваўшы два практычныя сэмінары на тэму «Беларусь і Аб’яднаная Эўропа: рэаліі і пэрспэктывы» — адзін на захадзе, другі на ўсходзе краіны, Таварыства зьвярнулася да пяці асноўных палітычных партый Бларусі, якія прадстаўляюць практычна ўвесь палітычны спэктар — ад правага флянгу (БНФ, АГП) да цэнтру і левага флянгу (Партыя працы, сацыял-дэмакраты, ПКБ). Цікава, што ўвесь палітычны спэктар у Беларусі лічыцца апазыцыяй — апазыцыяй тым пазасыстэмным (з пункту гледжаньня рацыянальнай палітыкі) сілам, якія цяпер кіруюць краінай.

Першы з сэмінараў, што сабраў каля 40 кандыдатаў і членаў іх каманд — прадстаўнікоў вышэйзгаданых партый і дэпутатаў мясцовых саветаў з захаду Беларусі (Гарадзенскай, Берасьцейскай, Менскай абласьцей), адбыўся ў мінулыя выхадныя (7—8 жніўня 2004 г.) у Лідзе. Ён выявіў цікавыя тэндэнцыі ў беларускім грамадзтве. Паколькі, падобна як тэатар зь вешалкі, кожны сход пачынаецца з арэнды памяшканьня, Таварыства філяматаў паспрабавала арандаваць ці не найлепшую ў Лідзе залю ў Польскім доме. Аднак спробы правесьці (ня будзем казаць *карысны* для ўсёй Беларусі, скажам проста *звычайны*) сход зарэгістраванай арганізацыі напаткалі тыпова савецкі бюракратычны супраціў — спачатку пайшлі спасылкі на быццам бы маючы адбыцца (які, натуральна, нават не пачаўся) рамонт, потым — перапасоўка паміж Лідай і Горадняй, пасьля чаго нам проста адмовілі.

Але як бы павёў сябе грамадзянін ЭС, калі б яму трэба было правесьці сход грамадзкай арганізацыі ў яго краіне? Правільна, у кожным горадзе, дзе б такі сход ні зьбіраўся, ёсьць гасьцініца, а пры ёй бізнэс-цэнтар з канфэрэнц-заляй. Так і ў 100-тысячнай Лідзе ёсьць вялікая гасьцініца (дзе і пасяліліся ўдзельнікі сустрэчы), а ў ёй маюцца адпаведныя памяшканьні. Паколькі філяматы законапаслухмяныя і добра разумеюць, што мясцовая ўлада зусім натуральна цікавіцца падзеямі ў сваім горадзе, тым больш сур’ёзнага маштабу, то яны своечасова паведамілі і запрасілі да ўдзелу мясцовы выканкам. Як жа было дзіўна даведацца ў выніку напярэдадні канфэрэнцыі, што гарантаваная дырэктарам гасьцініцы заля на 60 чалавек раптоўна скарацілася памерам і ўжо не магла зьмясьціць больш за 15 асоб!

Папраўдзе, філяматы добра ведаюць сваю краіну і яе хваробы апошніх год, таму імі загадзя была арандавана файная вазоўня ў прыватным сэктары амаль у цэнтры места Ліды — памяшканьне, у якім колькі год, пераабсталяваўшы яго пад імправізаваную канфэрэнц-залю, лідзкія дэмакраты ладзяць свае сходы. У сьпякотным надвор’і яе халодныя сьцены забясьпечвалі немагчымае ў іншых установах Ліды кандыцыянаваньне і надавалі імпрэзе незабыўны шарм.

Урэшце, мілая маладая прадстаўніца выканкаму, прысутная на сэсіях абодва дні і ўражаная ўзроўнем выкладаў (не на кожным сходзе ў Лідзе выкладаюць два прафэсары — дактары, дацэнт — кандыдат навук ды кандыдат навук — рэдактар найстарэйшага беларускага культуралягічнага часопісу — назавём хоць бы прозьвішчы Ю.Хадыкі, В.Голубева, А.Бухаўца), запэўнівала арганізатараў, што ў наступны раз гасьцям будзе гарантавана кожная заля ў Лідзе, а заля выканкаму — дакладна. Пэўна, так і будзе, бо перамены ў краіне насьпелі і гэта адчувае мясцовая ўлада, а практычных людзей, гатовых супрацоўнічаць з інтэлектуаламі з дэмакратычных колаў, а таксама з палітычнымі партыямі Беларусі, у гэтых структурах хапае.

А лякальны праэўрафорум у Лідзе скончыўся ўступленьнем удзельнікаў у шэрагі філяматаў, прыняцьцем зваротаў (аднаго — да кандыдатаў у дэпутаты на выбарах-2004, другога — да структур ЭС) — зваротаў, накіраваных на разьвіцьцё плённых сувязяў Беларусі з Аб’яднанай Эўропай. Нарэшце, быў калектыўны здымак — прадстаўнікі беларускіх палітычных эліт на фоне дэмакратычнай вазоўні з плякатам-расьцяжкай «Беларусь і Аб’яднаная Эўропа: рэаліі і пэрспэктывы». Атрымалася іранічна і аптымістычна — з надзеяй, што ўяўны вазок з вазоўні ўрэшце данясе нашу краіну да роўнага партнэрскага саюзу з суседзямі.

Запанавала агульная думка: на месцы Аляксандра Лукашэнкі кожны з прысутных на сустрэчы ў Лідзе 30—40 патэнцыйных палітыкаў вышэйшага эшалёну зрабіў бы крокі да эўрасупрацоўніцтва не пад самую заслону, а на пачатку сваёй палітычнай кар’еры. Разумець зараз гэта тым болей крыўдна, што 10 год таму гэта было абсалютна своечасова і, хутчэй за ўсё, цяпер бы мы сьвяткавалі аб’яднаньне з Эўропай разам з палякамі, літоўцамі ды латышамі, а не назіралі разбуральныя наступствы фатальных памылак аднаго няўдалага, але, на жаль, часова ўплывовага палітыка.

**Аляксей Хадыка,**
выканаўчы дырэктар РГА «Таварыства аматараў ведаў (філяматаў)»

# Сталіца вярнулася ў Наваградак

## На два фэстывальныя дні

У суботу траса на Наваградак была перапоўненая. Дзясяткі аўтобусаў і аўто чарадою рухаліся ў бок старажытнага гораду.

Фэст «Наваградзкі замак» упершыню прайшоў чатыры гады таму. Тое сьвята было суцэльным экспэрымэнтам: упершыню рэканструяваліся старажытныя баі на Замчышчы, упершыню 30-тысячны Наваградак прымаў тысячы турыстаў адразу.

Мясцовыя ўлады падтрымалі фэст, і экспэрымэнт ператварыўся ў штодвухгадовую традыцыю. Сёлета Наваградак быў гатовы прыняць 50 тысяч гледачоў. Але прагнозы ня спраўдзіліся: праз моцны цыклён сёлета на фэсьце было ня болей за 10 тыс. гледачоў. На ранейшых сярэднявечных фэстах зьбіралася да 40 тысяч, а ўсе рэкорды наведвальнасьці пабіла леташняе сьвята ў Нясьвіжы, дзе сабралася 80 тыс.

На Замкавай гары плянавалася ўсталяваць 500 плястыкавых крэслаў і сцэну, але перашкодзіла надвор’е. Пад вечар на галоўным пляцы паставілі вялікі экран — гала-канцэрт і начны бугурт люд меў магчымасьць разглядзець ва ўсіх падрабязнасьцях. Цэнтар гораду ў межах вуліц Міцкевіча і Малой Замкавай ператварыўся ў суцэльны кірмаш. Старшыня райвыканкаму Анатоль Ліс кажа, што толькі на гандаль сувэнірнай прадукцыяй было пададзена больш за 100 заявак.

Аляксандра і Канстанцін засьпявалі «Галілея» двойчы, перапрацаваўшы яго на лад песьні Сэлін Дыён з «Тытаніка». Танчылі ўсе — ад маладзёнаў у саколках «Арыя» да бабулек.

На другі дзень сьвята перамясьцілася пад Замкавую гару: тамака ішлі ваярскія баі бяз правілаў і рэканструкцыя штурму тэўтонцамі Наваградзкага замку (1394 г.). Мясцовая моладзь пасьля некалькіх пляшак віна была настроена ваяўніча: калі нашы пачнуць прайграваць — дапаможам. Добра, што крыжакі палеглі пад замчышчам, інакш да цяжкаўзброеных рыцараў ВКЛ далучыліся б маладзёны «ў трэніках». Люд бурна рэагаваў на кожнага зьбітага крыжака і на кожны стрэл сярэднявечнай артылерыі. Не безь цікавасьці за ўсім назіралі і амапаўцы. Яны зусім не рэагавалі на бела-чырвона-белыя сьцягі, а калі да іх хто зьвяртаўся, усім казалі «калі ласка». Во яно — патрыятычнае выхаваньне!

У фэсьце ўзялі ўдзел 50 рыцарскіх клюбаў з Польшчы, Расеі і Беларусі. Рэжысэр сьвята Ігар Міхно наракае на невялікі бюджэт фэсту, праз які не ўдалося запрасіць этна-трыё «Троіца» і прафэсійны рыцарскі клюб з Чэхіі (у нас усе клюбы — аматарскія). Адны чэхі «каштуюць» 2,5 тыс. эўра. «Адзінае, што мы пакуль можам, — гэта забясьпечыць удзельнікам харчаваньне», — кажа сп.Міхно.

Кіраўніцтва гораду настроена праводзіць буйное сьвята штогод. Паводле слоў Івана Грыня, загадчыка па ідэалягічнай рабоце Наваградзкага выканкаму, людзі мусяць добра адпачываць, і на адпачынак пасьля добрае працы сродкаў шкадаваць ня трэба. Цяпер вядуцца перамовы з ангельскімі інвэстарамі, што зацікавіліся тутэйшымі мясцінамі і жадаюць укладаць грошы ў турбізнэс.

**Сяргей Будкін, Менск—Наваградак**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

ДЫСКАГРАФІЯ

### Легенды Вялікага Княства II




«Легенды Вялікага Княства II. Старажытная зямля». «БМА-group», 2004.

Першы дыск гэтай сэрыі гістарычнай музыкі пасьпеў вытрымаць некалькі выданьняў. І вось — варты працяг. Сярод выканаўцаў ёсьць адкрыцьці.

Калі капэлу Алеся Лася многія ведаюць паводле альбомаў і канцэртаў, дык дудар Васіль Грынь з Заслаўя пасьпеў засьвяціцца толькі на ладжаных ім у родным горадзе дударскіх фэстах. Ягоны «Пастушок» (найгрыш на парных дудках) — першы выхад у вялікі сьвет. Бард клясычнай традыцыі Алесь Галіч выступае ў дуэце з Вольгай Емяльянчык; яны падаюць сваімі кантраснымі галасамі кант XVII ст. з славутага зборніка «Куранты».

Творы з «Полацкага» ды «Віленскага» сшыткаў, якія захавалі праявы айчыннай палацава-замкавай «дыскатэкі», пададзеныя яшчэ шырэй. Іх выконваюць лютніст І.Кубліцкі, гурты «Lituus», «Стары Ольса», аргяніст В.Кісьцень.

Альбом прэзэнтуе й фальклёрныя баляды («Конь з арлом» гурту «Княжыч»), татэмічныя танцы («Журавель» капэлі А.Лася, «Медуніца» гурту «Guda»).

Маецца й лыжачка дзёгцю ад пінскага хору «Покліч»: кант XVII ст. «Нова радасьць стала» выконваецца ў русіфікаваным выглядзе, хоць ён шмат разоў выдаваўся ў першаснай вэрсіі, і нават у скарэктаванай новабеларускай (альбомы «Сьвятая ноч» хору «Залатая горка», рок-праект «Сьвяты вечар», «Хтось крануўся крылаў» Вальжыны Цярэшчанкі).

І ўсё ж гэта не дыскрэдытуе агульнай задумы (прадусарка Арына Вячорка). Асобная падзяка саўндпрадусару Ўладзю Давыдоўскаму (экс-«Мроя»), які разбудаваў настраёва цэльны й стылістычна выверany альбом.

**Вітаўт Мартыненка**

ЯК У ІНШЫХ

# Фэст на Готляндзе



З 2 да 8 жніўня ў месьце Вісьбі, што на швэдзкай (з 1645 г.) высьпе Готлянд, адбыўся традыцыйны «Тыдзень Сярэднявечча». Фэст пачаўся з малітвы і царкоўнага шэсьця на могілкі, дзе спачываюць целы 2000 месьцічаў, забітых пры штурме гораду дацкім каралём Вальдэмарам у 1361 г. Сьвяточная праграма наступнага дня пачалася з інсцэніроўкі «штурму і несправядлівага ўваходжаньня дацкага караля ў Вісьбі» і рабаваньня датчанамі места. Пад крыкі сучасных месьцічаў «Дацкія сьвіньні!» Вальдэмар атрымаў ключы ад гораду, а жаўнеры-акупанты абабралі сяброў магістрату. Потым адбылося паказальнае «пакараньне» дзяўчыны, якая, закахаўшыся ў дацкага караля, адчыніла гарадзкую браму, а пасьля сыходу датчан была зажыва замураваная ў гарадзкую вежу.

На працягу наступных сямі дзён тутэйшыя і турысты з усяго сьвету наведалі каля 1000 розных імпрэзаў, якія пачыналіся а 12 гадзіне і заканчваліся далёка за поўнач. Сярод іх — прафэсійныя і аматарскія рыцарскія турніры, спаборніцтва лучнікаў, сярэднявечныя шэсьці і маскарады, кірмаш, канцэрты фольк-гуртоў, фэст клясычнай музыкі, шахматны матч паміж Швэцыяй і Даніяй, дзе фігурамі былі жывыя людзі, рэстараны і бары са старажытнай ежай, півам і сапраўдным «мёдам» з нашых казак. Амаль кожны жыхар места і ўсе швэды-турысты пераапрануліся падчас фэсту разам зь дзеткамі ў сярэднявечнае адзеньне.

Сярод рыцарскіх клюбаў былі заўважаны, апроч швэдзкіх, ангельскія і эстонскія. Побач з сусьветна вядомымі фольк-гуртамі, што граюць рыцарскую музыку (такімі, як «Wolgemot»), у сьвяце бралі ўдзел маладыя музыкі, у тым ліку з Расеі (Новасібірск).

Занесены ў сьпіс сусьветнай спадчыны ЮНЭСКА Вісьбі лічыцца «дыямэнтам Балтыкі». Места цалкам захавала сваю сярэднявечную забудову і гарадзкі мур з 40 вежамі. Вуліцы ў горадзе носяць назвы купецкіх карпарацый з нашай часткі Эўропы: Рыская, Наўгародзская, Рэвельская, Данцыгская, Любецкая і г.д. Купцы з Полацку жылі на «Рускай вуліцы». Праваслаўныя беларусы пабудавалі там царкву (рэшткі якой захаваліся), цалкам згодна са старавіленскай традыцыяй. Праваслаўныя браты-наўгародцы жылі на іншым баку места і пабудавалі там сваю царкву — вядома, у сваім стылі. Відаць, тады яшчэ не існавала паняцьця славянскага адзінства.

# Сталь і салодкая вата

**У беларусаў адсутнічае заходні культ якаснага ды камфортнага адпачынку, бо клясычны беларус — працаголік, а не геданіст. Наваградзкі фэст — зьвяно з ланцуга традыцыйных сьвятаў, што адначасна ўпрыгожваюць ды скоўваюць блакітнавокую Беларусь.**

Сярэднявечныя мерапрыемствы маюць трохаблічную сутнасьць. У іх прысутнічаюць элемэнты савецкага сьвята, сьвецкае тусоўкі ды няўлоўнага рыцарскага духу, які пасьлядоўна руйнуецца нецьвярозымі рыцарамі.

Аматарскія ў 1990-х фэсты цяпер прыдбалі афіцыйнасьці (арганізатарамі зьяўляюцца мясцовыя ўлады) й талерантнасьці (поруч функцыянуюць міліцыянты ды нацыяналісты). Напярэдадні ўздоўж галоўных вуліц гораду праносіцца віхура добраўпарадкаваньня, якая зьмятае неканстытуцыйныя надпісы са сьцен, культурны слой — з ходнікаў і бамжоў — з лавак. Пасьля сьвяткаваньня горад праз адсутнасьць бясплатных прыбіральняў ператвараецца ў дзіця бяз пампэрсу.

Захаваліся і іншыя звычаі шчасьлівага савецкага мінулага. Як забарона продажу алькаголю (і астранамічная колькасьць чырванатварых валхвяцоў «Крыжачку»). Або разьмяшчэньне кемпінгу за тры кілямэтры ад гораду, прычым адзінымі паказальнікамі зьяўляюцца бабулькі-казапаскі.

Шашлыкі пазіраюць з талеркі схаладнелымі шматкамі Белкі ды Стрэлкі, а кволыя пшыкі салюту вымушаюць чырванець нашчадкаў вынаходніка шматступеньчатае ракеты Казімера Семяновіча. Звыклай стала адсутнасьць заўжды абяцанае сярэднявечнае кухні. Ахвочыя да ласіных губ ды крамбамбулі наведвальнікі выбіралі паміж блінамі з плястыкавых талерак ды цыбульнай смажанкай у кавярні са шчарбатым посудам.

Глябалісты цешацца такімі каштоўнымі праявамі амэрыканскае культуры, як кока-кола, папкорн, балёнікі, блісканьне японскіх камэр, скокі пад фанэру ў стылі «дыска ў Навінках», а таксама надзіманыя ярка-ружовыя гумавыя рогі, якія карціць убачыць на галовах плямістых абаронцаў парадку.

За дзесяцігодзьдзе адшліфаваўся й стандартны набор сувэніраў, абумоўлены перадусім наяўнасьцю дармовае сыравіны: шматпакутная гліняная сьвісьцёлка-птушачка, саламяны абручык з палеткаў радзімы, футарал са скуры сканалае з голаду калгаснае сьвіньні, мэталёвы падсьвечнік (вырашана пытаньне пра выкарыстаньне помнікаў Леніну), матрошка ды расьпісная лыжка, «совсем как у нас в Подмосковье».

Рыцарскай культуры выдзяляецца сьціплае месца нагоды: гандлярам — зарабіць, моладзі — патанчыць ды беспакарана паскандаваць «Жыве Беларусь!». Заварожваюць хіба паненкі ў ядвабных строях з CD-R-камі замест сасьмяглых кордаў. Найбольшымі рамантыкамі ды патрыётамі зьяўляюцца гледачы, а не сябры клюбаў, якія ведаюць унутраны мэханізм пэрформансаў. Прафэсіяналаў цікавіць кошт зброі ды колькасьць атрыманых гузакоў, а заўзятары шчыра турбуюцца пра вынікі двубояў. Экзатычнае захапленьне даўніною набывае форму любові да чужое культуры: рэй вялі спадары ў шатляндзкіх кілтах, спадарыні ў францускіх уборах ды расейскі гурт «Drolls». Наватераможца турніру клюб «Ратнае кола» насіў імя астраўнога акупанта Эрыка Рудабародага. Карацей, на здратаваным шнарамі целе нацыянальнае ідэі паразытуе поп-смактун колеру шалёнае ласасіны.

Зрэшты, на пачатку XXI ст. кожная краіна хварэе на пераплаўку традыцыйнае культуры ў масавую. І кожная выбірае свой варыянт. Ёсьць такія, што патанаюць у салодкай ваце, як герцаг Клярэнс у кадушцы з мальвазіяй. Але ці пасуе нам гэтая дарога? Беларусы знаходзяцца на стадыі пошукаў, і ёсьць надзея, што некалі мы пазбавімся ад саладжавасьці чужацкіх стэрэатыпаў ды ўбачым існы бляск мяча вершніка «Пагоні».

**Болачка**

# Макракніга пра мікрагісторыю

**Усё пачалося з вывучэньня ўласнага радаводу, потым ішло вывучэньне гісторыі родных мясьцінаў. За 10 гадоў працы ўзьнік велічэзны фаліянт — гісторыя Карэньшчыны, дзясятка вёсак Лагойшчыны, аб’яднаных вакол цэнтру — фальварку Корань — нібы гісторыя Цэнтральнай Беларусі ад XIV да XX ст. у мініятуры. Кніга прысьвечана сьвету, якога няма, — традыцыйнай вёсцы. Гэты сьвет ня зьнік бяз знаку. На глебе, угноенай прадуктамі яго распаду, вырасла цяперашняя палітычная сытуацыя Беларусі.**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

На прэзэнтацыі сваёй кнігі «Традыцыйная беларуская вёска ў эўрапейскай пэрспэктыве» Вячаслаў Насевіч (на фота) даказваў, што праўдзівы гісторык мусіць разьбірацца ва ўсім: генэалёгіі, археалёгіі, а таксама ўласна гісторыі — «ад Адама да Патсдаму». Пры падрыхтоўцы кнігі В.Насевіч выкарыстоўваў гістарычныя мэтодыкі, якімі не карысталіся ў савецкай Беларусі. У прыватнасьці, ён асабліва зьвяртаў увагу прысутных на мікрагісторыю: «У савецкі час прынесьці ў выдавецтва кнігу пра адну вёску было немагчыма, сказалі б: што вы нейкай драбязой займаецеся. Але ж жыцьцё кожнай вёскі падобнае да жыцьця іншых вёсак».

Аўтар з выкарыстаньнем велізарнага масіву дакумэнтаў апісвае жыцьцё рэгіёну ў цэлым: што елі, што апраналі жыхары Карэньшчыны, як рабілі зямлю, з кім жаніліся, як паміралі… Усё гэта — у гістарычнай пэрспэктыве.

У якасьці сваіх папярэднікаў В.Насевіч называе этнографа Язэпа Гладкага (псэўданім Адам Варлыга) і гісторыка Мікалая Ўлашчыка. Першы зь іх дасьледаваў тыя ж мясьціны, якія апісаў Насевіч. Другі ў кнізе «Была такая вёска» даў першы беларускі ўзор мікрагісторыі.

На прэзэнтацыі аўтара хвалілі. Архівіст Віталь Скалабан паставіў Карэньшчыну па яе значэньні для нацыі ў адзін шэраг зь Вязынкай, Ракуцёўшчынай, Віцкаўшчынай, Малой Багацькаўкай.

Аўтару давялося адказваць на пытаньні, датычныя ня толькі кнігі, але і ўвогуле гісторыі. Адно зь іх гучала па-філязофску: «Гіне вёска ці ня гіне?» Адказ: «Зьмяняецца. Нешта зь вёскі адыходзіць, штосьці — нараджаецца». Просьба ацаніць стан вёскі ў 1917 г. прыдалася Насевічу як нагода для займальнай міні-лекцыі: «1917 г. быў толькі зрэзам цэлай эпохі. Вёска першай паловы XIX ст. была рэліктам: увесь сьвет ужо жыў іначай. Сяляне самі не былі гатовыя да свабоды, яны спадзяваліся, што ўсе праблемы вырашыць пан. Таму ў Польшчы вызваленьне сялян адбылося на пачатку XIX ст., а ў астатняй Расейскай імпэрыі — толькі ў другой палове. Пачалася мадэрнізацыя вёскі паводле заходняй мадэлі разьвіцьця. Але ці шмат было тых, хто хацеў і мог адказваць за сябе? Не! Вобразна кажучы, тая мадэрнізацыя ішла навыперадкі з самараспадам грамадзтва Расейскай імпэрыі й прайграла гэты забег. Усе праблемы, пра якія мы гаворым, — гэта ня зь вёскай нехта стварыў, а самі сяляне стварылі з навакольным сьветам».

Адзіны закід, які прагучаў у бок Насевіча, — расейская мова выданьня.

**Адам Воршыч**

ЯК У ІНШЫХ



Готлянд называюць яшчэ выспай 100 сабораў. Усе цэрквы, сярэднявечныя ды мураваныя, атачаны рунічнымі камянямі. Усе цэрквы пабудаваны за адносна кароткі пэрыяд — з 1100-га па 1361-ы. Большасьць зь іх паходзяць менавіта зь сярэдзіны XIII ст. З 1361 (год дацкай акупацыі) да 1960-га на Готляндзе не было пабудавана ніводнага сабору ці капліцы. Вось такі эканамічны заняпад. Багацьце Вісьбі XIII ст. грунтавалася на пастаўцы будаўнічых матэрыялаў і начыньня замкам Лівоніі і Прусіі. Якраз у Вісьбі біскуп Альбэрт рыхтаваў вайну з Полацкам за Лівонію.

Сёньня большасьць сабораў і цэркваў Вісьбі ў руінах. Але іх не псуюць сучаснай рэканструкцыяй. Замест гэтага ў развалінах адбываюцца цудоўныя канцэрты.

Дужа хацелася б, каб сярод удзельнікаў фэсту зьявіліся рыцарскія клюбы і гурты зь Беларусі (электронны адрас для кантактаў info@medeltidsveckan.com, вэбстаронка www.medeltidsveckan.com), а, напрыклад, у Віцебску адбылася інсцэніроўка пад назвай «Штурм і несправядлівае ўваходжаньне 1654 году ў места цара Расеі Аляксея Міхайлавіча».

**Андрэй Катлярчук, спэцкар «НН» у Швэцыі. Вісьбі**

БІБЛІЯТЭКА

# Празаічна пра вяршыні белсаўліту

ЦК сочыць за якасьцю жанчынаў беларускіх пісьменьнікаў. Народная артыстка СССР Ржэцкая грае перад старшынямі сельсаветаў. Эстонскія пісьменьнікі, у адрозьненьне ад бравых беларускіх скульптараў, ня могуць уявіць Купалу босым. Машэраў — безуважны, артыстычны і супярэчлівы. Выступаюць артысты маскоўскай эстрады. Усе гэтыя прыметы часу прысутнічаюць у кнізе ўспамінаў, як дэкор і як зьмест адначасова.

Мікола Аўрамчык. Знаёмыя постаці. — Менск: Маст. літаратура, 2004. — 2000 ас.




Больш каштоўнае — рысы характараў, дэталі з жыцьця клясыкаў. Валеры Маракоў помсьціць міліцыянту, адбіваючы ў таго дзяўчыну. Колас апранаецца ў тройку пад гальштукам нават у шпіталі. Панчанка з Брылём перакусваюць на Камароўцы з чаркаю. Крапіва жартуе. Дэманічнае і жаноцкае суіснуе ў Зьмітраку Бядулю.

Ці ёсьць у кнізе Гілевіч? Ёсьць, але бадай няма.

Паэту Міколу Аўрамчыку не стае празаічнага майстэрства. Кніга нарысаў пра клясыкаў літаратуры не прычароўвае ні стылем, ні аналітычнасьцю, ні цынізмам. Гэта не «Начныя ўспаміны» і не «Вячэрняе». Аднак Аўрамчыку не адмовіш у скрупулёзнасьці і такце.

Кніга прызначана для старэйшага школьнага ўзросту. Ня самы ўдалы выбар выдавецтва. У 16 гадоў гэта здасца занудзтвам. Але пазьней, пазьней… Калі ведаеш цану лёсу, веку, эпосе…

**Сяргей Гезгала**

## Някляеў у Інтэрнэце

Паэт Уладзімер Някляеў адкрыў свой сайт (www.nekliaev.by). На сайце разьмешчаны вершы (з кніг «Вынаходцы вятроў», «Наскрозь» і «Прошча»), проза (аповесьць «Вежа» і раман «Лабух»), публіцыстыка (па-расейску), тэксты некаторых песень, фатаздымкі розных гадоў.

## Прапаганда ад «Дунечкі»

У Менску зьявіўся Дом беларускага кіно: пакуль што ён месьціцца ў кінатэатры «Цэнтральны», але пасьля рэканструкцыі «Партызану» перабярэцца туды. Дом кіно мае прапагандаваць дасягненьні нашага кінэматографу. Найбліжэйшай імпрэзай стане дапрэм’ерны паказ беларуска-расейскай карціны «Дунечка», здымкі якой вядуцца на «Беларусьфільме».

## Далонь Клэптана і зорка Дональда Дака

У галівудзкім музэі славы сучасных артыстаў, якія зрабілі ўнёсак у гісторыю музыкі, зьявіўся адбітак далоні брытанскага сьпевака і гістарыста Эрыка Клэптана. «Далонь Клэптана» будзе выстаўленая побач з «далонямі» Джымі Хендрыкса й Карласа Сантаны.

А на Бульвары зорак у Лос-Анджаласе зьявілася зорка пэрсанажа дыснэеўскіх мультфільмаў Дональда Дака. Гэты герой упершыню зьявіўся 9 чэрвеня 1934 г. у мультфільме «Разумныя курачкі». Увосень 2004 г. юбілей Дональда Дака будзе адзначаны выхадам першага кампутарнага анімацыйнага фільму зь ім — «Двойчы на Каляды». Бульвар зорак ствараецца з 1960-х, зорка дыснэеўскага героя на ім — 2257-я па ліку.

**АВ; БелаПАН, Gazeta.pl**

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**«Сьпевы пра даўніх ліцьвінаў да 1434 году» Яна Чачота 1842—1844 гг. — гістарычны эпас беларусаў** / Уклад. В.Ліцьвінкі; Пер. з польск. К.Цьвіркі, С.Судніка; Камэнтар. С.Судніка. — Менск: Тэхнапрынт, 2004. — 124 с.: іл., ноты. 150 ас.

«Калі чытаеш «Хроніку...» Стрыйкоўскага, цяжка ўтрымацца, каб не сьпяваць усьлед за ім — такая яна паэтычная, часта нават пераплеценая вершамі. Я чытаў яе і сьпяваў, складаючы песьні. У гэтых песьнях я закрануў далёкія гістарычныя падзеі, да сьмерці Ўладзіслава Ягайлы ў 1434 годзе» — так акрэсьліў аўтар 55 балядаў абставіны іх стварэньня ў 1842—1844 г. Сёньня «Сьпевы...» ўпершыню друкуюцца ў беларускім перакладзе. Музыку да тэкстаў Я.Чачота напісалі В.Купрыяненка, Я.Петрашэвіч, Л.Махнач і П.Русаў.

**Тацяна Вабішчэвіч**

# Нямецкі мяккі знак

Сяржук Вінаградаў



Арыентавацца ў моўных пытаньнях выключна на патрэбы адукацыі — значыць ставіць воз паперадзе каня.

У нямецкай мове літары «мяккі знак», адной з самых часта ўжываных у беларускай кірыліцы ды такой любай сэрцам прыхільнікаў клясычнае беларускае мовы, няма. Дый шырокаму ўжываньню нямецкае мовы (пакуль што) нічога не пагражае. Але ж зь нядаўняга часу зьявілася праблема, супольная для беларускае і нямецкае моў, — правапіс.

У 1996 г. прадстаўнікі нямецкамоўных краін прынялі рашэньне пра рэформу нямецкага правапісу. Рэформа прадугледжвала спрашчэньне некаторых існых дагэтуль правілаў і ўступіла ў сілу ў 1998 г. Тады ж адукацыйныя ўстановы пачалі выкладаньне нямецкае мовы згодна з новым правапісам. У 2005 г. новы правапіс мусіў стацца абавязковым для ўсіх сфэр ужываньня мовы.

Але самыя добрыя намеры прыводзяць да непрадказальных вынікаў. Ад пачатку рэформа выклікала пратэсты пісьменьнікаў, якія выступалі за вяртаньне да старога правапісу, спасылаючыся на блытаніну і непасьлядоўнасьць у новых правілах. Адзін з самых уплывовых штодзёньнікаў «Frankfurter Allgemeine» вярнуўся ў 2000 г. да старога правапісу. А сёлета, зважаючы на хуткі абавязковы статус рэформы, дыскусія разгарэлася наноў: прадстаўнікі ўплывовых выдавецтваў, сярод якіх каляровы часопіс «Spiegel», масавая бульварная газэта «Bild» ды штодзённая газэта «Sueddeutsche Zeitung», таксама вырашылі вярнуцца да клясычнага варыянту правапісу.

У спрэчку ўцягнуліся многія дзеячы культуры, палітыкі, адукацыі. У гэтым месяцы тэма правапісу была дамінантнай на экранах тэлевізараў і ў друку Нямеччыны, адсунуўшы надзённыя пытаньні эканомікі і сацыяльных рэформаў на другі плян. Рэформа, якая прадугледжвала спрашчэньне правапісу, прывяла да падзелу немцаў на прыхільнікаў і праціўнікаў новае арфаграфіі.

Абмяркоўваць падрабязнасьці рэформы вялікага сэнсу ня мае, бо насамрэч зьмены насілі толькі касмэтычны характар. У сваёй глыбіні нямецкая рэформа значна саступала праведзенай у 1933 г. у Савецкай Беларусі моўнай рэформе, якая, улічваючы сур’ёзныя зьмены ў граматыцы і вымаўленьні, фактычна прывяла да стварэньня другога варыянту беларускае мовы. Затое нямецкая сытуацыя можа паслужыць добрым прыкладам таго, як нельга абыходзіцца з мовай, а таксама вылучае пытаньні, на якія трэба будзе шукаць адказы і беларусам.

Першае такое пытаньне — ці трэба вітаць намаганьні мовазнаўцаў дзеля спрашчэньня правапісу, якія сталі падставай для беларускае і нямецкае правапісных рэформаў. Такія намаганьні тлумачацца ў першую чаргу імкненьнем палегчыць вывучэньне мовы ў школах, каб можна было выкарыстоўваць зэканомлены час для іншых мэт. Для гэтага ствараюцца ўсёабдымныя правапісныя канцэпцыі зь мінімальнай колькасьцю выключэньняў, якія радыкальна зьмяняюць ня толькі правілы, але і графічны выгляд ды саму моўную традыцыю. Нямецкі прыклад паказвае, што імкненьне да спрашчэньня можа прывесьці да яшчэ большых цяжкасьцяў. Рэальнае моўнае жыцьцё ставіць перад рэфарматарамі пытаньні, пра існаваньне якіх яны нават не здагадваліся, што прыводзіць да яшчэ большага нагрувашчваньня правілаў і выключэньняў. Акрамя таго, прыклад ангельскае і францускае моў дэманструе, што існаваньне складаных, але стагодзьдзямі ўстойлівых правапісных правілаў не зьяўляецца перашкодай для засваеньня мовы. У Францыі напісаньне дыктовак лічыцца ці не нацыянальным спортам і кожны жыхар лічыць справай асабістага гонару паляпшэньне сваёй пісьменнасьці. Такім чынам, практыка паказвае, што мова не павінна быць простай — мова павінна быць стабільнай і паважанай, а спробы спрашчэньня часам прыводзяць да адваротных вынікаў.

Наступнае пытаньне — ці можа мова жыць без адзіных арфаграфічных нормаў. У гэтым аспэкце паўстае дылема паміж адзінствам правапісу (але ў гэтым выпадку мове і яе носьбітам навязваецца пэўная штучная норма) ды вольным разьвіцьцём мовы (тады ў правапісу няма адзінства, што стварае праблемы пры вывучэньні мовы ў школах). У адрозьненьне ад нямецкага падыходу ангельская мова падае прыклад існаваньня некалькіх варыянтаў правапісу ў залежнасьці ад краіны і традыцыі, і вядомае ўсім нам пэдагагічнае патрабаваньне «пішы правільна» гучыць у ангельскай мове як «пішы пасьлядоўна». Такім чынам дасягаецца свабода моўнае творчасьці, і кожны носьбіт мовы робіць свой асабісты выбар на карысьць таго ці іншага варыянту.

Такі падыход мог бы асабліва прыдацца для беларускае сытуацыі, дзе адзінства правапісу праз палітычны і культурны раскол нацыі пакуль што не зьяўляецца магчымым. Патрабаваньне "пішы пасьлядоўна" азначала б вывучэньне ў беларускіх школах аднаго з варыянтаў правапісу і некаторае азнаямленьне з другім, а беларускія СМІ арыентаваліся б у сваім правапісе на пажаданьні спажыўцоў. Урэшце, існаваньне некалькіх варыянтаў мовы і складанасьці ў адукацыйнай сыстэме, што вынікаюць адсюль, — мабыць, меншае ліха, чым распрацоўка штучных рэформаў.

Яшчэ адно пытаньне — якія грамадзкія інстытуты мусяць вырашаць лёс мовы. У Нямеччыне правапісная рэформа прымалася прадстаўнікамі міністэрстваў культуры фэдэральных земляў, бо нямецкае заканадаўства адносіць адукацыю да сфэры паўнамоцтваў рэгіёнаў. Такім чынам, у Нямеччыне моўная праблематыка была зьведзена да пытаньня выкладаньня мовы ў школах. Далейшае разьвіцьцё падзей прадэманстравала, наколькі памылковым быў гэты падыход. Вяртаньне вядомых газэт да старога правапісу і непрыманьне рэформы значнай часткай насельніцтва абазначыла мяжу ўплыву адукацыйных чыноўнікаў. Гэта і зразумела, бо мова належыць усяму грамадзтву і пытаньні далейшага яе лёсу мусяць абмяркоўвацца ў як мага шырэйшых колах. Некаторыя нямецкія палітыкі нават патрабуюць вынесеньня пытаньня правапісу на рэфэрэндум. Вядома, для Беларусі такі шлях, улічваючы наш сумны досьвед з «моўнымі рэфэрэндумамі», наўрад ці падыходзіць. Варта проста памятаць, што арыентавацца ў моўных пытаньнях выключна на патрэбы адукацыі і выкладаньня — значыць ставіць воз паперадзе каня.

Такім чынам, нямецкая рэформа служыць бліскучым прыкладам, колькі шкоды можа прынесьці непрадуманая і прынятая ў вузкім коле моўная рэформа. Зрэшты, у беларусаў такі досьвед таксама ёсьць. А, мабыць, галоўны нямецкі ўрок — ня трэба сьпяшацца. Наяўнасьць двух варыянтаў беларускае мовы, вядома, не спрыяе пашырэньню ўжываньня беларушчыны. Але ж увядзеньне нейкага трэцяга, кампраміснага варыянту без адпаведнага кансэнсусу сярод носьбітаў мовы можа зрабіць сытуацыю яшчэ горшай. Так што варта дазволіць самой моўнай практыцы вырашыць пытаньне на карысьць «тарашкевіцы» або «наркамаўкі».

ВОДГУКІ

## Пра айца і друга

У прадмове да надзвычай цікавых запісаў кс.Адама Станкевіча («Віленскі куфэрак», №9) сутыкнуўся з прыкрай памылкай, якая рэзала мне вока й раней. «... запісы ойчы Станкевіча», піша «Куфэрак». Між тым, «ойча» — гэта клічны склон ад «айцец». Трэ было б пісаць «запісы айца Станкевіча». Тое самае з словам «дружа», клічным склонам ад «друг». Нашы слаўныя «краёўцы» (дзе яны падзеліся, дарэчы?) пісалі: «Дружа Сяргей наведаў...» Трэба «друг наведаў».

**Андрэй Карнялюк, Берасьце**

## Яшчэ раз пра Судан

Артыкул Сяргея Рака «Пошук братоў па розуме працягваецца» выклікае ў мяне пэўныя пярэчаньні. Адна справа Башар, які «паліць хатыні ў сваёй краіне» і сябруе з Бэн Ладэнам (Судан называюць радзімай «Аль-Каіды»). Другая — сам Судан, краіна старажытнай цывілізацыі, якая ня зводзіцца да рабаўладаньня і не зьяўляецца «спадчынай старажытнаэгіпэцкай цывілізацыі». Суданцы ўжо ў часы фараонаў будавалі свае ўласныя гарады, піраміды, мелі сваю старажытную сыстэму пісьма, якая дасюль не расчытана.Таму яны заўсёды супраціўляліся інтэграцыі з паўночным суседам. Беларусам ёсьць чаму павучыцца ў Судане. Тым больш што пэўная традыцыя ўжо маецца. Яшчэ ў XIX ст. Судан наведваў Язэп Сянкоўскі, беларус паходжаньнем, бацька расейскага ўсходазнаўства. Другі ліцьвін, Максім Рыль, ачольваў суданскі касьцёл. У пачатку мінулага стагодзьдзя сюды ў якасьці агранома прыяжджаў Раман Скірмунт.

**Усяслаў Шатэрнік, Менск**

## Пра візы ў Эўропу

З свайго досьведу наведваньня замежных амбасадаў у Менску: упэўненая, што свой бакшыш з чэргаў маюць найперш ахоўнікі консульстваў, якія прапускаюць людзей у візавыя аддзелы і маюць, мусіць, кантакты з турагенцтвамі. Вось ім і выгаднае стварэньне чэргаў. Асабліва непрыемнае было маё стаяньне каля францускага пасольства. Усё зусім інакш каля брытанскага/італьянскага офісу, дзе зь людзьмі абыходзіцца надзвычай ветліва і трымаюць парадак.

**Праф. Ружа Ганчарова, Менск**

# Пра выбары

Зьяўляюся сталым чытачом «НН», а пішу ў першы раз. Кожныя выбары ў нашай краіне пакідаюць глыбокі адбітак у сэрцы. Машына, запушчаная ППРБ, раніць альбо падмінае пад сябе іншадумцаў ды штампуе новых «кадры». Кадры, як вядома, вырашаюць, дакладней — выконваюць, усё. Яны ўжо даўно прызвычаіліся жыць толькі па камандзе «фас» (няма нічога лепшага, чым зьесьці слабага). Гэта асабліва відаць на менш за ўсё абароненых працаўніках ды студэнтах. Першыя страцілі сваю хоць нейкую абароненасьць, калі паставілі свой подпіс у кантракце, другія ўвогуле яе ня мелі. Гэта тычыцца ў вялікай ступені іншагародніх студэнтаў.

Як толькі набліжаецца апошні тыдзень выбарчай кампаніі, у інтэрнатах пачынаюць ледзьве не паляваньне — датэрміновыя выбары. Пра тых, хто «не пасьпеў» прагаласаваць учора, ужо клапоціцца камісія на чале з дэканам, якая з найвялікшым задавальненьнем выявіць у вашым пакойчыку безьліч недахопаў, за якія вам («як вам ня сорамна») ня месца ў інтэрнаце. І вось, з болем у сэрцы, бо раней пастанавіў чакаць да апошняга, ідзеш. Ідзеш, бо ня хочаш выцягваць з бацькоўскай кішэні 300 «лішніх» даляраў у год на кватэру. Ідзеш з адчуваньнем таго, што ты для іх, ні больш ні менш, — быдла, ад колькасьці якога залежыць моц гаспадара. Потым толькі застаюцца сапсаваныя бюлетэні, у якіх застаецца ўвесь твой боль.

Але шмат знаходзілася тых, хто чакаў (і будзе чакаць ізноў) да апошняга, адбіваў напады камэндантаў, намаў ды іншых агітатараў. Невядома, чаго чакаць гэтай восеньню, асабліва ў сьвятле апошніх заяў «яго вялікасьці». Гэта будуць адны з самых галоўных, а значыць, брудных выбараў, ад якіх будзе залежаць трэці (пажыцьцёвы) тэрмін. Насамрэч АР ня вельмі хочацца атрымаць гарбуз ад апазыцыі, які можа сапсаваць усе яго пляны.

Людзі кажуць, што яны шрубкі ў сыстэме, — маўляў, што тут зробіш. Але добра вядома, што адбываецца з машынай, у якой бракуе тых шрубак. Будзем спадзявацца, што знойдуцца тыя, хто здолее «адкруціць» гэтыя шрубкі ды пазбавіць нас ад чарговага болю.

**Дзьмітры Дзьмітрычэнка (студэнт), Менск**

ХРОНІКА

11 жніўня Берасьцейскі аблсуд адмяніў папярэджаньне, вынесенае райсудом дэпутату Маларыцкага райсавету (БНФ) **Уладзімеру Малею** «за арганізацыю несанкцыяванага сходу», бо справа разглядался пры адсутнасьці адказьніка. Адміністрацыйная справа накіраваная ў той самы суд на паўторны разгляд. Старшыню Гомельскай абласной філіі АГП **Уладзімера Кацору** 12 жніўня затрымалі на пасту аўтаінспэкцыі ў Жлобіне, абвінавацiўшы ў крадзяжы аўтамабіля, ды ўсяго толькі сканфіскавалі некалькі тысяч асобнікаў газэты «Время» ды ўлёткі «5+». 13 жніўня скаргу ў пракуратуру на дзеяньні міліцыянтаў, якія затрымалі яго 21 ліпеня, падаў актывіст «Зубра» **Сяргей Кунец**. 13 жніўня выбарчыя камісіі не зарэгістравалі ініцыятыўных груп **Валер’я Шчукіна**, **Вольгі Карач** і **Аляксея Гаўруцікава** ў Віцебску (апошні — з Народнай Грамады), **Леаніда Мархоткі** ў Салігорску, **Сьвятланы Каралёвай** (АГП), **Зьмітра Дашкевіча** (Малады Фронт, Менск). З 19 чальцоў ініцыятыўнай групы **Аляксандра Галакціёнава** (Амсьціслаў, АГП) да 16 жніўня пад ціскам уладаў 10 чалавек вырашылі выйсьці. **В.Леванеўскаму** падоўжылі тэрмін утрыманьня пад вартай да 13 верасьня. Актывіст «Зубра» **Аляксей Шыдлоўскі** 16 жніўня быў аштрафаваны на 95 тыс. руб. за распаўсюджваньне ўлётак. Дэпутат Менскага райсавету, намесьнік старшыні ПБНФ **Юрась Зянковіч** 17 жніўня выкліканы ў суд, дзе яго маюць судзіць за «непадпарадкаваньне патрабаваньням работнікаў міліцыі»: яго затрымалі 21 ліпеня пасьля канцэрту на плошчы Бангалор. **Уладзімеру Мацюшэнку** зь Лепелю 17 жніўня заявілі ў выканкаме: «Вас цяпер нідзе на працу ня возьмуць» — за ўдзел у ініцыятыўнай групе кандыдата Алега Тычыны. 17 жніўня суд Першамайскага раёну Менску не задаволіў пазову **Анатоля Лябедзькі** да НДТРК, АНТ і СТВ: лідэр АГП адстойваў свой гонар, зьняважаны фільмам «Дарога ў нікуды». Лідзія Ярмошына на паседжаньні 17 жніўня назвала **Сержука Салаша** «базарным мужыком» і прапанавала адкрыць на яго крымінальную справу за паклёп на выбарчую камісію. 12 жніўня **В.Леванеўскі** абвясьціў галадоўку: ён патрабуе прыёму скаргаў у вышэйшыя інстанцыі, сустрэчы з судзьдзём і зь дзецьмі, азнаямленьня з матэрыяламі справы. **Ю.Зянковіча** 17 жніўня аштрафавалі на 5 б.в. 18 жніўня ў пракуратуру Воранаўскага раёну паступіла скарга на старшыню Гіркаўскага сельсавету Марыю Кулік, якая агітуе жыхароў не падпісвацца за вылучэньне Аляксандра Мілінкевіча. Пракурор Маларыцкага раёну 18 жніўня вынес касацыйны пратэст на рашэньне раённага суду, які задаволіў пазоў **ПБНФ** да начальніка аддзелу па ідэалягічнай працы Маларыцкага райвыканкаму Сяргея Строка.

**АШ**

# Трыюмф антычнага шоў-бізу

**Каманда наша выступае пад неканвэрсоўным сьцягам з пахавальным арнамэнтам. Камэнтатары няўцямна размаўляюць на мове расейскай правінцыі. Але мы ўжо там, змагаемся за мэдалі. Калісьці пройдуць і па нашых стадыёнах атлеты ўсіх краін.**

Адкрыцьцё Атэнскай Алімпіяды сталася сапраўдным трыюмфам антычнасьці — у сучасную кампутарную эпоху. Гэта трыюмф антычнага шоў-бізу.

Пятніца, 13-га, не расчаравала сваім урачыстым і неверагодным відовішчам.

Бубеншчыкі, якія заклікаюць мінулае. З экранаў стадыёну глядзіць на нас старажытны музыка: антычнасьць вырываецца зь віртуальнасьці бубенным боем. Агнявыя алімпійскія кольцы на цёмнай вадзе вялізнага басэйну злучаюць дзьве магутныя стыхіі.

Аграмадная статуя распадаецца на кавалкі — нараджае мужчынскі торс, курас; а на паверхні кожнага з кавалкаў — відэакліпы з выявамі людзей і народаў. Чырвоны кентаўр з кап'ём.

Відовішча гадзіньніка-клепсыдры разгортвае карціну гісторыі ад старажытнасьці да нашых дзён: Эдып і Сьфінкс, Эгіпэт, Алімпійскія гульні. І хаця на стадыёне знайшлося месца вобразам праваслаўнай царквы — сьвятарам і храмам, гэта вяртаньне антычнасьці. Гэта паганства і культ цела.



AP

**Італьянскі сабліст Альда Мантана здымае пробу з залатога мэдаля.**



WWW.CALSHOP.BIZ

**Амэрыканскі баскетбаліст Шон Мэрыян дэманструе свае надзвычайныя фізычныя здольнасьці.**

Толькі цела ў сучаснасьці тэлевізійнае. Віртуальнай і падманлівай выглядае сьпіраль ДНК, што нараджаецца з хісткага зьзяньня Шляху Продкаў, створанага лазэрамі на кроплях вады. Як неверагодным гучыць віншаваньне касманаўтаў з арбіты. Як кампутарнай, «арнамэнтальнай» зоркай глядзіцца Б'ёрк, што сьпявае на Алімпіядзе. Ды-джэй мантажуе музыку — як у няпэўным сьвятле начных клюбаў.

Як і ў антычных піфагарэйцаў, культ лічбаў. Толькі камэнтатары прыводзяць лічбы мэгаляманскія, амаль нерэальныя. У штучнае возера, створанае на стадыёне, залілі 2 162 000 літраў вады. Прысутнічае 21 000 журналістаў. 202 краіны бяруць удзел у Алімпіядзе. Будзе разыграны 2021 мэдаль.

Палітыкі на трыбунах трапляюць у сымбалічны абмен антычнага шоў-бізу: Тоні Блэр, Шымон Пэрэс, Назарбаеў — яны таксама частка віртуальнасьці, частка відовішча. Краіны гандлююць іміджамі: маленькая Малдова дасьць за залаты мэдаль спартоўцу $ 50 000, а суседняя з намі Расея заплаціла за кожны спартовы строй 3 600 эўра.

Але тое, што алімпійцы маюць цела, таксама не забываецца. Так, «Навіны спорту» згадваюць, што «ў Атэнах для спартоўцаў падрыхтавана 130 000 кандомаў», а па тэлевізіі кажуць, што кожны дзень у Алімпійскай вёсцы спажываецца 700 000 бутэлек вады.

Цацачныя фігуркі Фэба і Афіны ўключаюцца ў гандлёвую гонку за лепшы сувэнір.

Дзе ў гэтым антычным шоў-бізе наша краіна?

Пакуль каманда наша выступае пад неканвэрсоўным сьцягам з пахавальным арнамэнтам. Пакуль журналісты нашы няўцямна размаўляюць на мове расейскай правінцыі, а галоўнай камэнтатарцы муляе «бітва за ўраджай». Пакуль нашым уладам няма месца на алімпійскіх трыбунах, бо прыхільнасьць да хакею не абараняе ад палітычных скандалаў.

Але мы ўжо там — і змагаемся за мэдалі. Калісьці пройдуць па нашых стадыёнах атлеты ўсіх краін. І тады мы канчаткова станем часткай антычнасьці, якая падаравала сьвету Алімпійскія гульні.

**Андрэй Расінскі**

АЛІМПІЯДА ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Лета, Грэцыя, сумна

Галоўнае рэзюмэ першага тыдня алімпіяды: калі арабскія тэрарысты ня выставяць сваёй каманды на наступных спаборніцтвах у Пэкіне, алімпійскі рух ператворыцца ў звычайны кіч.

Атэны-2004 — першая Алімпіяда пасьля падзей 11 верасьня, якія канчаткова пахавалі двухполюсныя расклады халоднай вайны. Спорт, што быў люстэркам палітычнага супрацьстаяньня двух блёкаў, таксама трансфармаваўся. Адзіны патрыятычны бзік, на які аказаўся здольны калісьці магутны Крэмль, — заклікаць сваіх спартсмэнаў не жаваць гумкі падчас трансьляцыі рэмэйку «Саюз нерушымы».

Фронт глябальнай барацьбы праходзіць паміж Захадам і ісламскім тэрарызмам. Аднак бэн Ладэн сваёй каманды ў Атэны не прыслаў і алімпійскія спаборніцтвы, пазбавіўшыся пікантнага палітычнага прысмаку, ператварыліся ў нейкую папсу.

Француская «Figaro» з лятэнтнай настальгіяй нагадвае, якія тэмы даводзілася аглядаць яго журналістам падчас алімпіяд мінулага стагодзьдзя: міжнародныя байкоты (Манрэаль-1976, Масква-1980, Лос-Анджэлас-1984), тэрарысты (Мюнхен-1972, Атланта-1996), палітычныя масакры (Бэрлін-1936 і Мэксыка-1970).

Сёньня камэнтатары Алімпіяды пакутуюць фігнёй. Іх артыкулы ў штодзённых выпусках адправілі б у рубрыку «Гэта цікава ведаць».

Дамінантныя тэмы — допінг і наварочаная сыстэма бясьпекі (на ахову 10 500 спартсмэнаў кінута 70 000 грэцкіх мянтоў, ня лічачы агентаў спэцслужбаў і ракетнай сыстэмы «Патрыёт»). Нават жоўтым журналюгам цікавей. Яны смакуюць эратызацыю спорту. Сярод спартсмэнаў модна рабіць свае эратычныя здымкі. На кавэрах глямурных часопісаў у позе ню ўжо засьвяцілася гімнастка Хадоркіна, лёгкаатлеткі Аманда Бірд і Мэрыен Джордж, увесь склад нямецкай сборнай па валейболе і нават іх суайчыньніца молатакідальніца Сюзана Кайль. Уяўляю!

Цынічна, але слушна аўтар «Figaro» нагадвае, што легендарныя антычныя алімпіяды былі ня шабасам аматараў спорту і пацыфістаў, а віртуальнай разборкай паміж Атэнамі і Спартай.

Ад наступу папсы выратоўвае беларуская экзотыка. На фоне адноснага фіяска нашага дрымтыму галоўнымі ньюсмэйкерамі спартовых калёнак і вэб-форумаў становяцца зусім не атлеты.

Можна сьмела казаць, што ў аналах айчыннага спорту Алімпіяда-2004 будзе называцца «сівакоўскай». Сп.Сівакоў, якому адмовілі ў «шэнгене», цяпер кіруе зборнай праз мабілу. Цікава, які ў Сівакова пакет — «Супэрджынс» або «Старт», і ці ёсьць у яго «любімы нумар»?

Другімі спартовымі хедлайнэрамі сталі браты Герыловічы — экіпаж камбайну «Дон-150» з-пад Рэчыцы. Калгасьнікі-рэкардсмэны выклікалі алімпійцаў на спаборніцтва. Сама ідэя вывесьці нейкі эквівалент алімпійскай узнагароды для кожнай галіны гаспадаркі — цудоўная! Напрыклад, адзін пераможны гейм у тэнісе эквівалентны 50 мэтрам пракладзенага асфальту, 3 кілаграмам надоенага даяркай малака і 345 гадзінам настаўніка. Такім чынам, уся нацыя становіцца алімпійскай, а Лукашэнка, як прэзыдэнт НАК, заступае на чарговы тэрмін без гемаройнага рэфэрэндуму.

Як бачым, ня так усё і сумна, тым больш што галоўныя прыколы наперадзе. З кожным днём устаноўка на 25 мэдалёў становіцца фата-марганай. Я не дэльфійскі аракул, але мяркую, што наш Зэўс-бацька вось-вось пачне грымець і сыпаць перуны.

**Лёлік Ушкін**

АЛІМПІЯДА Ў ЛЮСТЭРКУ ХМАРАЧОСАЎ

# Аранжавае жыцьцё

Папулярнасьць Алімпійскіх гульняў у ЗША можна параўнаць з «аранжавым» узроўнем бясьпекі, уведзеным Белым домам у Нью-Ёрку ў адказ на пагрозы тэрактаў «Аль-Каіды».

Адзначаныя ў плянах баевікоў фінансавыя будынкі ў Нью-Ёрку цягам 24 гадзін ахоўваюцца ўзброенымі да зубоў вартаўнікамі. Грузавікі на ўезьдзе ў горад праходзяць абавязковы паліцэйскі кантроль, значна замаруджваючы трафік. Максымальна жорсткі характар набыла праверка людзей пры ўваходзе на ўсе без выключэньня масавыя мерапрыемствы. Гэта тое, што перашкаджае амэрыканцам штодня. На небясьпеку тэрактаў большасьць не зважае. Жыцьцё бяжыць сваім ходам.

Гэтаксама і Алімпіяда. Спаборніцтвы паказваюць чатыры тэлеканалы. У цэнтральных газэтах — усе вынікі і падрабязнае апісаньне падзей. Але нават самая відовішчная частка Гульняў — цырымонія адкрыцьця — засталася ў цені шокавага прызнаньня губэрнатара-гея Нью-Джэрзі Джэймса Макгрыві і страшэнных наступстваў урагану Чарлі ў Флорыдзе.

«Дзякуй нябёсам, што не адбылося ніякіх непрадбачаных інцыдэнтаў. Дзякуй нябёсам, што ўсё прайшло гладка. І дзякуй нябёсам, што ўсё гэта скончылася», — так «The Washington Post» не пакінула каменя на камені ад арганізатараў і галоўнага праваўладальніка трансьляцыі трохгадзіннага шоў у ЗША тэлеканалу NBC, абвінаваціўшы іх у звышкамэрцыйнасьці.

Ці не адзінае, што злучае Штаты й Алімпіяду, — гэта зоркі. Такія, як 18-гадовы вундэркінд у плаваньні Майкл Фэлпс, на якога мясцовыя «знаўцы» яшчэ задоўга да Гульняў узвалілі непад'ёмны воз — пераўзысьці дасягненьне Марка Сьпітца 32-гадовай даўнасьці ў сем залатых мэдалёў. І няхай кіраўнік алімпійскай дэлегацыі «зорна-паласатых» Джордж Буш-старэйшы гаворыць пра першаснасьць гонару й годнасьці, янкі прагнуць подзьвігаў і трыюмфаў. А таму бронзавыя мэдалі Фэлпса ўспрымаюцца як няўдача, а параза баскетбалістаў ад зборнай Пуэрта-Рыка (у жыцьці — адміністрацыйнай часткі ЗША), зьніжае і без таго мізэрны інтарэс.

Адзіная згадка аб санкцыях ЭЗ да Сівакова прагучала ў этэры NBC падчас зьяўленьня нашых атлетаў на цырымоніі адкрыцьця Гульняў.

Дарэчы, рэзанансам, узьнятым у эўрапейскіх СМІ з прычыны «дыскваліфікацыі» Сівакова, тутака й ня пахне. Адзіная згадка аб «санкцыях Эўразьвязу да беларускага спартовага міністра, якога на радзіме абвінавачваюць у парушэньні правоў чалавека», прагучала ў жывым этэры NBC падчас зьяўленьня нашых атлетаў на афіцыйнай цырымоніі адкрыцьця Гульняў.

**Кастусь Лашкевіч, Нью-Ёрк**

**У графіка з Заслаўя Тацяны Ласкі, калі яна сказала, што будзе адпачываць на пленэры, суседка прастадушна спыталася: «А дзе гэта краіна такая?» Краіна Пленэр сёлета разьмясьцілася ў Бычках.**






**... нясе мастацтва ў масы.**

# Краіна Пленэр

10-ы драздовіцкі мастакоўскі пленэр быў прысьвечаны 80-годзьдзю Васіля Быкава

Вушача прапусьціла праз лябірынт завулкаў да Школьнай, 6, да дому з чырвонай цэглы на цяністым панадворку. Народны паэт Беларусі сустрэў нас радасна. Мабыць, анёлы падхапілі Рыгора Барадуліна, калі надоечы ноччу сарваўся ён з карказломнае лесьвіцы. Але, тым ня менш, ня змог ён паехаць з намі: балелі скабы і бок.

На знакамітым мэмарыяльным комплексе пайшлі пілігрымы-пленэраўцы на «Прарыў». Помнік, за ўзьвядзеньнем якога сачыў Пятро Машэраў, з пачварнаю скульптураю, успрымаецца цяпер ня больш як даніна часу. Куды болей уражваюць масянжовыя дошкі з імёнамі тых, хто загінуў, прарываючы фашыстоўскую блякаду. Ёсьць сярод іх і Быкавы.

## Намёты пад бусьлянкаю

Лягер з намётаў у Бычках быў разьбіты пры хаце быкаўскай сваячкі Антаніны. Колісь у ёй месьцілася школка, у якой вучыўся і будучы клясык, а цяпер маладзенькія бусьляняты зьдзіўлена пазіралі са сваёй бусьлянкі — адкуль гэта панаехала столькі народу?!

Сталічная дэлегацыя прыбыла ня першаю. А таму пасьпяшаліся мы з арганізацыйнымі турботамі да Ады Райчонак, якая апекавалася пленэрам. Прымала яна сардэчна і толькі няўцямна пазірала на Аляксандра Родзіна з падмайстрам, якія, нібыта кагуляры ў чорных апранахах, доўжылі свой пэрманэнтны пэрформанс.

## Гранітны падворак

«Філіял вушацкага музэю народнай славы імя У.Е.Лабанка. СЯДЗІБА-МУЗЭЙ Васіля Быкава». Такая шыльда прышрубаваная да навюткай, зь бярвеньня як звон, хаціны. Быкаў, аказваецца, філіял Лабанка?! Прызнаюся, не адразу згадаў, што апошні быў адным з арганізатараў партызаншчыны на Віцебшчыне, а потым — партыйна-дзяржаўным функцыянэрам. Дый азначэньне «сядзіба-музэй» як мінімум спрэчнае, бо адшукаць там аўтэнтыку досыць праблематычна. Ці павернецца ў якога гіда язык, каб заявіць: «У гэтай хаце нарадзіўся народны пісьменьнік Беларусі…» Але, мабыць, у традыцыях сёньняшняй бюракратыі — зрабіць «красіва». Маем што маем — сялянскі падворак, пасыпаны гранітным шчэбенем. Але ластаўкі дык і гняздо пасьпелі зьвіць пад вільчыкам.

Думкамі пра спадчыну Быкава дзяліліся Лявон Баршчэўскі і чыноўніца з райвыканкаму. Вярцінскі, Іпатава, Скобла чыталі вершы. Валодзя Някляеў падарыў музэю кепку, якую атрымаў ад Васіля Ўладзіміравіча ў Фінляндыі. А захавальніца музэю Антаніна запрасіла гасьцей і аднавяскоўцаў агледзець экспазыцыю. На жаль, пакуль бедненькую.

Думалася: вельмі хораша, што нашы творцы хаўрусуюцца. Гэта заканамерна: мастакамі і адначасна літаратарамі — былі Драздовіч і Быкаў.

Літаратурнае жыцьцё — праз былiцы, паказкі і анэкдоты — бруіла і на сяброўскай вячэры. За тамаду быў бард Віктар Шалкевіч. А назаўтра ягоны калега Зьміцер Сідаровіч пабудзіў пленэраўцаў мэлёдыямі не гітары, а дуды.

Бычкоўцы выганялі на пашу нешматлікіх кароў і не саромеліся ні аб'ектыва, ні мікрафона. Былі ня супраць пагрэцца ў промнях славы вялікага земляка. 76-гадовая Соф'я Быкава ня толькі спрытна пераапранулася ў чысьцейшае, але й вывела з хлява папазаваць сваю любіміцу-казу.

Алесь Пушкін прыехаў на пленэр пісаць партрэт Васіля Быкава. «Ма́ю выдатныя фотапартрэты Быкава ад Уладзімера Кармілкіна, зробленыя яшчэ на пахаваньні Алеся Адамовіча. Мне не хапала толькі жыўленьня і выяваў быкаўскай зямлі… Думаю пра сям'ю, пра Беларусь, пра свой Бобр. Пра тое, каб на гэтай зямлі мы былі ўсё ж гаспадарамі, а не якімісьці індзейцамі ў рэзэрвацыі…» Алесь пакутліва разважае, хто з сучасьнікаў узваліць на плечы ношу маральнага, духоўнага лідэра нацыі пасьля таго, як яе апостал адышоў у лепшы сьвет.



**Гаспадыня пленэру Ада Райчонак.**



**...а Уладзімеру Сулкоўскаму — неабсяжныя краявіды.**

## Сярод быкаўскіх краявідаў

Адны мастакі ў Бычках накінуліся на натуру, другія выправіліся аглядаць навакольлі ажно да касьцёлу ў Селішчы, трэція гаманілі зь сястрою Быкава Валянцінаю. Сяргей Шатохін рабіў з дапамогаю мясцовых хлапцоў паветку над варыўнёй. Аляксей Марачкін распачаў своеасаблівы дыптых на… дзьвярах ад шафы, знойдзенай на закінутай сялібе. А яшчэ ў яго замест палатна была прызапасена… прасьніца! Пад раскідзістым клёнам Эдуард Агуновіч шчыраваў над парным партрэтам сястрычак Быкавых-Баратынскіх (шыкоўнае прозьвішча!), якія прыкацілі на роварах з Кублічаў.

Не зьявіўся ўчастковы, каб перапісаць пленэраўцаў, як гэта было ў чэрвені ў Валодзькаве на Глыбоччыне. Затое немаведама што рабілася з электронікай. Бяз дай прычыны спрацоўвалі сыгналізацыі ў аўтамабілях, капрызілі гадзіньнікі, не аказваліся мабільныя тэлефоны. «Напэўна, пільнуюць за намі з спадарожніка-шпіёна!» — жартавалі мастакі.

На жаль, мусіў вяртацца ў сталіцу раней. Ад'яжджаў, але ведаў, што ў пленэрыстаў напішуцца новыя эцюды, складуцца вершаваныя радкі, здымуцца фатасэрыі «Закінутыя хутары» і «Жыве Беларусь!». Што на закрыцьці пленэру Рыгор Барадулін прачытае новыя радкі і засьпявае пры вогнішчы народных песьні. Прадчуваў, як усьцешацца жыхары навакольных вёсак запрашэньню на выставу, як будуць узрадавана пазнаваць на палотнах аднавяскоўцаў ды краявіды. Суцяшаўся й тым, што стане пленэр у Бычках традыцыйным.

*Менск—Вушача—Бычкі—Менск*

**Уладзімер Сіўчыкаў**

**Фота Анатоля Клешчука**



**Алене Шарыпе болей імпанавалі вясковыя замалёўкі...**

# Увайсьці ў Котру двойчы

Сяргей Харэўскі

**Што можа цешыць сэрца падарожніка болей, чым бадзёрая сонечная раніца, якою зьбіраюцца сябры ў паход? Ці можна двойчы ўвайсці ў раку? Сёлета я здолеў — у Котру. Раку, што цячэ праз дрымучую пушчу, прапахлую брагай зь лясных бровараў.**

Мінулы раз мы плавалі па Котры Рэдакцыяй «НН». Сёлета была іншая кампанія — спрэс сацыёлягі зь філёзафамі. Ды перакладчыца Калацкая. Ды паэт Хадановіч. Ды кіраўнік хору «Унія» Кірыла Насаеў.

Якія нечаканасьці нам прыносіць жыцьцё! Кожнае раніцы, пакуль розум паступова выцясьняе фантастычнае відмо ночы, было б рэалістычна прачынацца пад шэрым беларускім небам, дзе ў марлевую сьценку намёта б'ецца адзін зь незьлічоных нашых камароў, што сілкуюцца нашаю і, заўважу як знаўца, ня толькі нашаю крывёю.

## Рамантычнае Берштаўскае возера

Першае ўражаньне ад пачатку маршруту — магутнае рамантычнае Берштаўскае возера, зьлеразанае туманамі ды каўткім дымам нашага вогнішча. Рэха тут б'ецца ў берагах, нібы збалелае сэрца.

Берштаўскае возера злучана дзьвюма пратокамі з рэчкай Котрай. Праз адну пратоку вада з Котры трапляе ў возера, а праз другую, каля выселку Берастаўца, вяртаецца ў рэчку. На гэтых пратоках звычайна ставіліся язы — прыстасаваньні для лоўлі рыбы.

У Берштаўскім возеры, паводле інвэнтару, які прыводзіць знаўца тамтэйшых мясьцін гісторык Сяргей Токць, вадзіліся шчупакі, самы, акуні, ляшчы, язі, ліні, плотка, верхаводка. Гэтую рыбу лавілі на возеры вялікім невадам. Рака Котра была галоўнай воднай артэрыяй пушчы. Па ёй сяляне сплаўлялі лес да Горадні і далей да самага Караляўца.

На вялікі жаль, ад тае былое раскошы засталіся адно запісы ў старонках старых кніг. Першым прыкрым адкрыцьцём была амаль поўная адсутнасьць рыбы ў рацэ. Бывалыя тубыльцы ніжэй па плыні тлумачылі, што рыбу нішчаць пра павыбівалі электравудамі. Калі ня бачыш нават маляўкі ў чысьціткай, салодкай вадзе, думкі нядобрыя крозяць усялякімі карамі на тых, хто гэтак па-барбарску зьнішчае найлепшае, што ў нас пазасталася. Між іншым, яшчэ гадоў пятнаццаць таму ў Котры вадзіліся й чырванакніжныя харыюсы са стронгаю.

Таму даваліся есьці багата мяса. На вячэру быў шашлык. На раніцу — гусьценны ўсходні плоў. На думку Ігара Бабкова, кіраўніка ўсяе выправы, гэта было для яго найцяжэйшым выпрабаваньнем.

Дазволю тут сабе яшчэ адну цытату з таго ж Токця. «Паводле веравызнаньня насельніцтва падзялялася на 1714 каталікоў і 1106 праваслаўных. Праўда, на абшарах Берштаўскай грамады не было ніводнага парафіяльнага храму, а толькі праваслаўная капліца ў Берштах (пабудаваная ў 1816 г.) і каталіцкая ў Новай Рудзе. Большасьць жыхароў вёскі Бершты зьвязаліся прыхаджанамі Глыбоцкай царквы, якая знаходзілася на тэрыторыі Лідзкага павету Віленскай губэрні. На жаль, пра рэлігійнае жыцьцё берштаўцаў у гэты пэрыяд нам амаль нічога невядома. Не захавалася зьвестак і пра тое, як яны былі пераведзены ў 1839 г. з уніяцтва ў праваслаўе».

## Пушча «Мужыцкай праўды»

Дрымучая пушча. Па берагох колькі вёсачак. Аднаго разу «НН» ужо рабіла сюды адмысловую экспэдыцыю. Што інтрыгавала: недзе тут, у Катранскай пушчы, на загад Каліноўскага Валер Урублеўскі цісну «Мужыцкую праўду». Ня ведаю, як было за часамі паўстаньня 1863 г., але й сёньня даеш веры, што апроч турыстаў і паўстанцаў тут ніхто ня пройдзе.

Няясны пошчак птушак, галасоў якіх у гэтую пару ўжо і не распазнаць. Гіганцкія дрэвы, якіх у нашыя часы невераемна й сустрэць. На хвіліну ўявіце сабе ясень, якому за трыста гадоў… Грабы, вязы, яліны. А дубоў там не зьлічыць. Першае ўражаньне, якое не стасуецца з папярэднім, — падпаленыя па краях пракаветныя дубы. Натуральна, гэта рабілі не прыбышы. Мясцовыя мэханізатары, спрабуючы знайсьці сваю нішчымную калгасную капейку, замест таго каб пілаваць дрэва цалкам, падпальваюць пушчанскіх волатаў, каб тыя хутчэй зваліліся.

## Самапальныя бровары

На кожным ці, прынамсі, праз адзін, павароце, у тых самых інсургенцкіх пушчах нас сустракаў новы сюрпрыз — сур'ёзна, прамыслова наладжаны самапальны бровар. І зьменлівая псыхалёгія тубыльцаў. Першая вёсачка, што трапляецца пасьля Берштаў, Сухары, знаходзіцца ад іх за 18 км з гакам.

Той самы гак напачатку здаваўся цалкам непераадольным праз суцэльную сьцяну даўжэзных чаратоў, у якіх гублялася мэта шляху. Пасьля кароткага ўступнага слова філёзаф Ігар Бабкоў, папрасіўшы чыстае каладзежнае вады, сутыкнуўся зь неўміручымі пакуль тут традыцыямі гасьціннасьці. Сутыкнуўся зь не зусім каб нечаканай, але з новай візіяй беларускай сытуацыі. Ужо ці не на першым павароце нашае вандроўкі ў першай жа вёсачцы знайшоўся тавар штодзённага попыту. А да яго — малачко, гурочкі, кроп, цыбуля. Асабліва гэткай непасрэднасьцю была ўсьцешана Вольга Калацкая, шчырая вэгетарыянка. Усё за так.

Дарэчы, у гэтай жа вёсачцы дагэтуль зьберагаюцца традыцыі пляценьня корабаў і кашоў, што й да сёньня маюць тут не абы-які ўжытак.

## Катранскія джунглі

Я не зьбіраюся сьцьвярджаць, што вечнае лета робіць людзей шчасьлівымі. На некаторых паваротах Котры я ў гэтым моцна сумняваўся. Несупынны бляск сонца і несупынная зеляніна — наўрад ці найлепшы фон для жыцьця. Брак халоднае пітное вады пасярод балотнае ракі. Непралазныя зарасьнікі араліяў і хмелю, празь якія выйсьці на багністы, сьлізкі бераг месцамі немагчыма. Звон інсэктаў, што джаляць у самы непрыдатны час. Напрыклад, у Бабкова схітрыўся ўпіцца клешч, даставаць якога давялося цэлым калектывам. Ну, а піявак, якіх сёлета расплодзілася безьліч, даводзілася зьдзіраць самому…

Што ж, любая выправа такога кшталту — фізычнае выпрабаваньне. Кожны з удзельнікаў мусіць несьці на сабе сама меней пад 50 кг рыштунку. Штовечар змагацца са слатою й надыходзячым туманам. Зь вільгацьцю, што нейкім інфэрнальным чынам запаўзае табе пад галаву. Зь нячыстай брунатнай вадою, якую, не раўнуючы як у тропіках, трэба дэзінфікаваць, фільтраваць і адстойваць. Трэба нарыхтоўваць велізарную колькасьць дроваў, каб сушыць рэчы, гатаваць каву ці смачнае на агні шчаўе. Трэба падстаўляць адзін аднаму плячо, нельга нікога кідаць за паваротам, бо невядома, што там можа здарыцца. Трэба моцна веславаць, шпурляючы назад па цэлым вядры вады. Доўгімі гадзінамі. Трэба ратавацца ад нялітасьцевага сонца, што з кожнае тваё пырскі робіць лінзу, якая будзе пячы. Натуральным было адно зь першых маіх пытаньняў у першую ж раніцу: «Калегі, а што ў вас… не баліць?» Натуральна, што праз усё паколатае, пабітае, замочанае дый проста стукнутае размовы вечарамі ня клеіліся.



USERS.KALUGA.RU

## Дубы й масты

Насуперак чаканьням, апроч гучных сьпеваў пад хадановіцкую гітару ніякіх геніяльных думак не выказвалася. Філёзафы працягвалі млявую гамонку пра тое, пра што не дагаманілі ў Менску. Сацыёлягі Мікола Кацук ды Ўладзімер Абушэнка са сваімі раскладамі былі відавочна самі па сабе. Цяплела сэрца адно хіба ад творчасьці Хадановіча, якая йзноў вяртала ва ўлоньне літаратуры. Валянцін Акудовіч пры канцы вандроўкі ад душы цешыўся, што галава нарэшце пустая як звон і яе пара насычаць новымі думкамі.



**Валянцін Акудовіч — філёзаф, альпініст і вандроўнік**

МІКАЛАЙ КАЦУК

Апроч размаху самагонаварэньня (не хачу нікога пакрыўдзіць) зьдзіўляе бязьдзейнасьць уладаў, якая толькі й дазваляе паставіць усё з такім размахам у пушчанскіх нетрах.

Котра віляе ўздоўж межаў Гарадзенскага й Шчучынскага раёнаў, адпаведна ўсё тут па астаткавым прынцыпе: маўляў, чаго гэта я ня ў свой раён буду дарогу весьці? Была й цалкам сюррэалістычная карцінка, вартая пяра Далі. Уявіце сабе драўляны масток — нішто сабе масток. Але сьцежак да яго няма! Толькі гіганцкі, памерам з дваццаціпавярховы хмарачос, стаіць дуб, каранямі напалову ўжо над вадою. Вакол тумановы вербалоз, крапіва. А пры самым беразе, у яшчэ роснай траве, — дзявочыя пантофлікі ў матузках. Яшчэ й не астылі. За той час, пакуль мы там падсілкоўваліся салам з мацою, гуркамі й таварам штодзённага попыту, ніхто з пушчы не азваўся. Нікога не было відаць і ў вадзе.

Нялёгка ўявіць сабе, што гэта за вада — шырынёю пяць-шэсьць мэтраў, на вірах пад тры-чатыры мэтры глыбінёю. Павароты настолькі рэзкія, што не пасьпяваеш упісацца і даводзіцца часьцяком тараніць чаротныя сьцены ўсьцяж нетрывалых берагоў.





## Трасянкавы паэт

Разам з тым пах хвоі, разнастайныя берагі, то недасяжна стромкія, то лагодна пляжныя, не дадуць засумаваць нікому. Не засумуеш і ў вадзе: то велізарныя карчы таплякоў, то вось яшчэ зялёнымі шатамі ўваленыя вялізарныя дрэвы. Усё гэта хутка спавівае дзікая расьлінасьць, на якой у мностве плодзяцца інсэкты й жабы.

Балазе хоць птушкам тут пракорму не бракуе. Таму яны водзяцца тут у незьлічонай колькасьці. Чаплі й журавы, буслы й лебедзі… Уразіла гэтым разам і мноства драпежнага птаства.

За даволі заможнай вёскаю Сухары ў Котру ўпадае рэчка Астрынка, утвараючы надзвычай прыгожае возера, парослае старымі пакручастымі хвоямі й густым маліньнікам, што сёлета ўрадзіў-такі.

У вёсачцы з польскім назовам Шклёнск нас напаткаў яшчэ адзін сюрпрыз — сапраўдны тамтэйшы паэт трасянкавы Саша. Вёска была спалена немцамі ў вайну разам з 76 жыхарамі, помнік з крыжам па якіх стаіць на гары. Побач — бронзавы манумэнт таму партызану, празь якога вёску й спалілі. Подпіс бяз косак: «Ад райкому радных і блізкіх».

А сёньня вёскі выміраюць самі па сабе. У тых самых Навасёлках няма аніводнае каровы. Але засталася паэзія.

Вось два масты — адзін помнік нягегласьці савецкага будаўніцтва, другі — новай будучыні. Ад мосту да мосту — 10 мэтраў. Усё цячэ, але нічога не мяняецца. Бадай, праз гадоў дваццаць паставяць тут і трэці мост.

## Скаканьне з плаціны

Пасьля Шклёнску Котра рэзка мяняецца. Яна становіцца цёмнай і інфэрнальнай. Вада набрывае чарноцьцем, а чараты — нечуванай вастрынёю і зваблівымі пахамі, не раўнуючы як галасы сырэнаў.

Самая вялікая вёска на Котры — Галавачы. Насамрэч разьлеглая й брудная вёска, цалкам прасьмярдзелая быдлагадоўляю.

Працяг на старонцы 14.

## Школьны кірмаш

**З 27 да 31 жніўня** ў Нацыянальным выставачным цэнтры «Белэкспа» (Янкі Купалы, 27) адбудзецца выстава-кірмаш «Дзень добры, школа-2004». Тэматыка: школьны рыштунак, падручнікі, спэцыяльная і мастацкая літаратура, канцтавары, вопратка, абутак, спартыўныя тавары, сродкі гігіены і касмэтыкі, музычныя інструмэнты.

## Фэстываль аўтарскай песьні

**З 20 да 22 жніўня** адбудзецца 10-ы фэстываль аўтарскай песьні **«Славуціч-2004»** (Украіна, непадалёк ад Чарнігава). Дабірацца: да Чарнігава цягніком, з Чарнігава — электрычкай да Славуцічу. У Славуцічы на аўтавакзале (побач з чыгуначным) будзе вісець схема, а таксама будуць хадзіць спэцыяльныя аўтобусы і маршруткі.

## Саксафон

**26 жніўня** ў Тэатры юнага гледача «Джаз-саўнд-клюб Яўгена Ўладзімірава» прэзэнтуе саксафаністку і сьпявачку Ганну Каралёву з джаз-квінтэтам у праграме «Вельмі модны джаз». Пачатак а 19-й. Квіткі: 10000 — 25000 руб.

## Dreamland

**22 жніўня** парк «Dreamland», што між Сьвіслаччу і вуліцамі Арлоўскай ды Машэрава, запрашае на фэстываль «Сьвет танцу». Усходні танец, брэйк-данс, акрабатычны рок-н-рол, ансамблі бальнага і сучаснага танцу. Танцавальнае шоў на ўсёй тэрыторыі парку! Пачатак а 15-й. Квіткі: ад 9000 (на фэстываль і ўсе атракцыёны).

## Сэмінар па пытаньнях цэнаўтварэньня

**26 жніўня** ў актавай зале ГУМу а 13-й гадзіне пачнецца сэмінар-кансультацыя па пытаньнях цэнаўтварэньня з улікам апошніх зьменаў, праверкі датрыманьня цэнаў кантрольнымі органамі, а таксама будуць разгледжаныя тыповыя памылкі пры фармаваньні сабекошту прадукцыі, тавараў, працаў ды паслуг, праблемныя пытаньні у бухгальтарскім уліку. Т.: 230-86-13, 230-86-42, 8-029-618-55-41




## Клюбнае жыцьцё

**Гудвін** (226–13–06)

**19** (чц), 21.00 — жывая музыка: «P.S.Jazz».

**20** (пт), 21.00 — жывая музыка: «Аркадзь Эскін і яго джазавае трыё».

**21** (сб), 21.00 — жывая музыка: гурт «Мадэра Хард Блюз».

**Graffiti Club** (693–74–16, 280–01–54)

**25** (ср), 20.00 — вечар джазавай музыкі: Павал Аракелян & Co.

**27** (пт), 20.00 — вечар ROCKавай музыкі. Уваход толькі па картках клюбу.

**Рэактар** (229–74–38)

**27** (пт), 18.00 — рэп-акцыя (адкрыцьцё сэзону) і прэзэнтацыя зборніка «Маладая будучыня».

**Bronx** (288–10–61, velcom: 103 і 105)

**19** (чц), 22.00 — «Клюбны чацьвер»: dj Кулікоў.

**20** (пт), 22.00 — «Live Jazz»: «Madera Hard Blues».

**21** (сб), 22.00 — «Start party»: dj Box.

**Белая Вежа** (284–69–22, 239–16–00)

**19** (чц), 19.00 — dj Dee, White Tower: dj Top, dj Grizzly.

**22** (ндз), 22.00 — dj Alex (europop). Квіткі: 5000.

**20** (пт), 22.00 — «Euroclub»: dj Mixell, go-go. Квіткі: 10 000—20 000.

**28** (сб) — dj КірылOFF (Масква), go-go show (Масква). Квіткі: 25 000—35 000.

**Бліндаж** (219–00–10)

**19** (чц), 23.00 — dj's Egor / Zolart.

**20** (пт), 23.00 — dj's Egor / Zolart.

**21** (сб), 23.00 — dj's Egor / Zolart.

**27** (пт), 18.00 — адкрыцьцё канцэртнага сэзону «Рок пасьля вакацыяў». У праграме: прэзэнтацыя альбому «Веру ў цябе / Я люблю ліцэй!», выступ гуртоў «Zet», «Гарадзкія», А.Памідорава, пераможцаў фэсту «Басовішча'2004» групы «Тарпач» і інш. Пачатак а 18-й. Квіткі: 7000 (танцпол), 10 000 (столік). Т.: 649-08-88, 766-24-25, 400-67-74.

**X-Ray** (223–93–55)

**20** (пт), 22.00 — dj-bar with dj Bergamo.

**21** (сб), 22.00 — dj-bar with dj Noche.

**Ямайка** (252–07–26)

**20** (пт), 2.00 — «The Afterparty»: dj Arsenti Tchouprina, dj Grey (LP School).

**21** (сб), 2.00 — «The Afterparty»: dj Noche, dj Fila (LP School).

## Менская кінаафіша з 20 да 22 жніўня

**«Аўрора»** (253-33-60)

«Чалавек-павук-2»: **20—22** (пт—ндз) 16.00, 18.30, 21.00.

«Кепскае выхаваньне»**** (кінафармат «4х4»): **20** (пт) 17.00, 19.10, 21.10.

«Улюбёнец жанчын»*** (кінафармат «4х4»): **21** (сб) 17.00, 19.10, 21.10.

«Слон» (кінафармат «4х4»): **22** (ндз) 17.00, 19.10, 21.10.

**«Берасьце»** (272-87-91)

«Законы прывабнасьці»: **20** (пт) 14.00, 19.00; **21, 22** (сб, ндз) 14.00 (іл), 19.00.

«Забіць Біла-2»***: **20—22** (пт—ндз) 16.30, 21.00.

**«Дружба»** (240-90-13)

«Забойная парачка: Старскі і Хатч»: **20** (пт) 18.00, 20.00; **21** (сб) 18.00 (іл), 20.00; **22** (ндз) 18.00, 20.00 (іл).

**«Кастрычнік»** (232-93-25)

На рамонце.

**«Масква»** (223-27-10)

«Чалавек-павук-2»: **20** (пт) 16.20, 18.40, 21.00; **21, 22** (сб, ндз) 14.00 (іл), 16.20, 18.40, 21.00.

**«Мір»** (284-37-71)

«Чалавек-павук-2»: **20** (пт) 13:30, 16.00, 18.20, 20.40; **21, 22** (сб, ндз) 13.30 (іл), 16.00, 18.20, 20.40.

«Кепскія дзяўчаты»: **20** (пт) 17.20; **21, 21** (сб, ндз) 15.20, 17.20.

«Слон» (кінафармат «4х4»): **20** (пт) 19.20, 21.20.

«Апошняе жыцьцё ў Сусьвеце» (кінафармат «4х4»): **21** (сб) 19.20, 21.20.

«Кепскае выхаваньне»**** (кінафармат «4х4»): **22** (ндз) 19.20, 21.20.

**«Перамога»** (223-77-66)

«Пасьлязаўтра»: **20** (пт) 14.00.

«Улюбёнец жанчын»*** (кінафармат «4х4»): **20** (пт) 16.30, 18.50, 21.00.

«Кепскае выхаваньне»**** (кінафармат «4х4»): **21** (сб) 16.30 (іл), 18.50, 21.00.

«Апошняе жыцьцё ў Сусьвеце» (кінафармат «4х4»): **22** (ндз) 16.30 (іл), 18.50, 21.00.

**«Піянер»** (227-64-87)

«Мільён год да нашай эры»: **20** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **21, 22** (сб, ндз) 15.40, 17.30, 19.20, 21.10.

**«Цэнтральны»** (220-34-16)

«Кепскія дзяўчаты»: **20** (пт) 11.00, 12.50, 14.40, 16.30; **14, 15** (сб, ндз) 11.00 (іл), 13.00, 15.00.

«Апошняе жыцьцё ў Сусьвеце» (кінафармат «4х4»): **20** (пт) 18.20, 20.30.

«Слон» (кінафармат «4х4»): **21** (сб) 17.00, 19.00, 21.00.

«Улюбёнец жанчын»*** (кінафармат «4х4»): **22** (ндз) 17.00, 19.00, 21.00.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

## Юнаму гледачу

**«Аўрора»**

«Кніга джунгляў»: **21, 22** (сб, ндз) 15.00.

**«Берасьце»**

«Дзеці дажджу»: **21, 22** (сб, ндз) 12.00.

**«Дружба»**

«Міс Мядзьведзіца»: **20** (пт) 10.30; **22** (ндз) 13.00.

«Маленькі Сьцюарт»: **21** (сб) 13.00.

**«Мір»**

«Бібі — маленькая чараўніца»: **20** (пт) 10.30.

«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **20—22** (пт—ндз) 12.30.

**«Перамога»**

«Агент Кодзі Бэнкс»: **21, 22** (сб, ндз) 14.30.

**«Піянер»**

«Ледавіковы пэрыяд»: **20** (пт) 10.20; **21, 22** (сб, ндз) 12.30.

«Зьнесеныя прывідамі»: **20** (пт) 12.00; **21, 22** (сб, ндз) 10.20.

«Бальная сукенка»: **20** (пт) 14.20; **21, 22** (сб, ндз) 14.10.

КІНАФАРМАТ «4Х4»

# Забітае юнацтва

Разьня ў школе Калумбіны ўжо падштурхнула Майкла Мура да стварэньня дакумэнтальнай стужкі. Гас ван Сэнт прапануе ўляўрэачаную ў Канах іграву версію страшных падзей, убачаную вачыма звычайных школьнікаў — сьведкаў, ахвяраў — і забойцаў.

Тлумачэньні быццам бы на паверхні: перад разьнёй падлеткі гуляюць у кампутарную стралялку, замаўляюць зброю праз Інтэрнэт, глядзяць фільм пра Гітлера і цалуюцца ў душы. Ван Сэнт ня быў бы ван Сэнтам, калі б не ўказаў на гамафобію, якая спараджае нянавісьць. Сама назва карціны «Слон» спасылаецца на аднайменную дакумэнтальную стужку пра канфлікт у Паўночнай Ірляндыі і на мульт-фільм «Слон ніколі не забывае» пра помсьлівую жывёлу.

Але галоўнае — не паверхня падзей, а тое, як гэта зроблена — і якіх эмоцый дамагаецца рэжысэр.

Гледачы, знаёмыя з творчасьцю Аляксея Германа, ня зьдзівяцца доўгім плянам, калі камэра ідзе за героем, паварочваецца, адхіляецца, вяртаецца да пэрсанажа. Толькі ў Гаса ван Сэнта гэта ня так шурпата й рэчыўна, хаця іграюць у яго непрафэсійныя акторы. Да таго ж падзеі паказваюцца з розных бакоў — аднаго ўдзельніка, другога, назіральніка. Стварацца свабоднае і лёгкае, як подых, павуціньне.

«Слон» («Elephant»)
ЗША, 2003,
каляровы, 81 хв.
**Жанр:** Драма
**Адзнака:** 7 (з 10)



Гэты свабодны подых — калі нават дробныя й няважныя размовы школьнікаў гучаць як апошні глыток жыцьця — кантрастуе з тым наканаваньнем, якое паставіць на ўсім кропку.

Карціна Гаса ван Сэнта не адкрывае новых далягляды. Яна дакладна маніпулюе дасьведчаным гледачом. Але ў выніку нават зашмальцаваны ад частага скарыстаньня Бэтховэн пераўтвараецца ў шчымлівы і нябёсны рэквіем па забітым юнацтве.

**Андрэй Расінскі**

# Увайсьці ў Котру двойчы

Працяг са старонкі 13.

А збоку, праз бераг з пушчы, цягнецца ўсё той жа невынішчальны пах брагі.

Крамы тут зачыняюцца рана, а таму ўвесь магчымы й немагчымы тавар можна прыдбаць па хатах, вакол якіх — пастрыжаныя газоны ды буйства гартэнзіяў.

І вось, вось недзе набліжаюцца даўно нябачаныя драты, слупы. Зьлева ад Котры, рукою падаць, застаецца Скідзель, а вунь прадукты яго жыцьцядзейнасьці праз рэчку Скідзялянку імкліва ўпадаюць у Котру. А ўжо зправа ў Котру імкнецца Пыранка. І тут героі, вартыя антычных эпасаў, атрымліваюцца паміж двума велізарнымі мастамі: шашой Менск—Горадня і чыгукаю Масты—Горадня. Нішто так не пацешыла нашых засьмяглых вуснаў і засумавалых па куртуазнай культуры вачэй, як ідовішча ці мо летуценьне — тры вясельныя картэжы на мосьце. Прычым, як высьветлілася, адпаведна тубыльскай традыцыі жаніх абавязаны несьці сваю абранніцу на руках праз увесь мост.

Але самай вялікай нашай прыгодаю было хутчэй ня гэта, а скаканьне ў байдарках з бэтоннай пляціны ля вёскі Бірулічы. Хуткасьць ракі тут самая высокая. Што не перашкодзіла спачатку аднаму харобраму зуху пераадолець гэтую бэтонную перашкоду вышынёю ў паўтара мэтра, а пасьля не адстаці ад яго і філёзаф з сацыёлягам ды мастацтвазнаўца з капітанам сваёй байдаркі, эканамістам з Гомелю Юрасём Клімовічам. Дзеці вакол сьмяяліся. Пыталіся, ці будзе хто яшчэ за намі. Падраныя байдаркі давялося папросту рамантаваць няпэўны тэрмін.

Прыкладна вось так, ці амаль так, скончалася наша немалое падарожжа. Пры вёсцы Агароднікі імклівы вір панёс нас на каменныя перакаты. Гэта было доўгачаканым фіналам паходу. Рака несла нас сама. Сама ад сябе ўпрочкі. Апошняе сустрэтае на павароце дзяўчо сказала, што мы тут не праедзем. Але вось ён і Нёман. Неймаверны, нечаканы разлог берагоў і нябёсаў. Нічога табе яшчэ невядома, незнаёмая дзяўчынка. Прынамсі, ня столькі, колькі нам. Самі з сабою мы дыялёгаў не вядзём, адцемілі філёзафы Бабкоў з Акудовічам. Мы вялі бясконцы дыялёг з ракою. Дыялёг у 100 кілямэтраў.


Андрэй Лянкевіч

# Закапанае жыцьцё

## Кароткая тыпалёгія беларускіх дачнікаў

Тацяна Барысік

Летні дождж. Людзі пахаваліся на прыпынку. Кабеты сярэдняга веку голасна перамаўляюцца:

— А ці ё дождж на нашых дачах?

— Давай вечарам суседзям пазвонім і дазнаемся.

Адна з суразмоўніц узьнімае вочы да неба й кажа, на хмары гледзячы:

— На дачу йдзіце, на дачу, у бок Вендрыжу!

— На Шклоў!

— На Быхаў, — абзываюцца некалькі галасоў.

Ані вялікага голаду, ані доўгатэрміновай сьпёкі ў краіне няма. Проста гэтыя людзі хворыя на дачную ліхаманку. Хваробу распаўсюджаную ў нашых краёх, якая шкодзіць псыхічнаму здароўю ня толькі самога носьбіта, але і ягонага атачэньня, і характарызуецца незваротнымі зьменамі ў сьвядомасьці. У выніку асоба робіцца няздольная ўспрымаць навакольную рэчаіснасьць адасоблена ад свайго надзелу ў 5—10 сотак, а ўласная града радыскі бачыцца цэнтрам сучаснай цывілізацыі. Ня кожны дачнік — хворы. Таму, каб засьцерагчыся ад узьдзеяньня захворваньня на вас непасрэдна, пажадана ведаць формы яго праяўленьня і меры прафілактыкі.

### Хвалько

Адразу прыгадваецца мажная гаваркая цётка ў дызэлі і ейны лямант на ўвесь вагон:

— Ой, як у мяне ўсё расьцець! На адным каліве па дванаццаць яблыкаў. А ў мяне ж перцы во такія! А цыбуля во такая!

Не сьпяшайцеся зайздросьціць, лепей пагаманіце зь яе суседзямі па лецішчы. Бо на самай справе гарод такой гаспадыні мае занядбаны выгляд. Хвалько езьдзіць на сваю фазэнду штодня, але зусім не дзеля градаў. Рабіць на зямлі яна ня любіць і не прывыкла. Кульне чарку ды сьпіць у баразьне, каб у горадзе п’янай ня бачылі. Адпачывае ад вечнага гармідару ў перанаселенай кватэры, надакучлівых дзяцей, унукаў. Цягаецца ў будзённыя дні па чужых гародах, шукаючы дармэнай спажывы. Варыянтаў дачнага адпачынку можа быць безьліч. У транспарце ж такія хворыя хлусяць выключна з мэтаю ўзьняцьця ўласнай самаацэнкі, аўтарытэту хаця б у вачах выпадковых людзей.

Для грамадзтва хвалько шкодны тым, што, па-першае, не дае спакойна спаць у дызэлі. Па-другое, сваімі дылетанцкімі парадамі, якімі шчодра адорвае ўсіх навокал, хоць цяміць у расьлінаводзтве і нарыхтоўцы гародніны меней, чым сьвіньня ў апэльсынах.

Таму, даведаўшыся ад выпадковых людзей рэцэпт засолкі сырых баклажанаў, праверце інфармацыю, інакш выкінеце ўраджай на сьметнік. А пачуўшы знаёмае «А ў мяне ж гуркоў парасло!», адкажыце: «Вось і ежце на здароўе».

І працягвайце дзівіцца на краявіды за акном.

### Актывіст

Гэты хворы індывід адрозьніваецца хаатычнай грамадзкай актыўнасьцю, звычкаю лезьці не ў свае справы, а таксама вырашаць уласныя праблемы за кошт іншых. Наносіць значны ўрон псыхіцы і кішэні. Інтэлектуальная недаразьвітасьць кампэнсуецца амбіцыйнасьцю, нахабствам, імкненьнем усюды пачуваць сябе як дома. Надзвычай любіць камфорт, на лецішчы хоча ўладзіцца як мага лепей, будуецца. Такія хворыя часта сустракаюцца сярод старшыняў дачных каапэратываў. Для таго каб балбатаць па тэлефоне на лецішчы, ён не набывае мабільнік, а агітуе, прымусова зьбірае грошы на ўстаноўку тэлефона за кошт каапэратыву. Як будуць аплачвацца размовы, хто будзе вартаваць тэлефонную будку — яму не ў галаве. Ніякай рэальнай улады гэтая пачвара ня мае. Найлепшы спосаб абароны ад яе — ігнараваньне яе пачынаньняў. Не дазваляйце актывісту адчуваць сябе самым хітражопым у каапэратыве, драць зяпу на вас ды вашых родзічаў. Вылучайце ў адказ сваю яшчэ больш абсурдную прапанову пабудовы на грошы каапэратыву царквы або фантану. З пагрозы выключэньня з каапэратыву ад душы пасьмейцеся і вельмі настойліва папрасіце больш не турбаваць вас рознай лухтой.

### Супэрдачнік

Самая цяжкая, заразная, невылечная форма дачнай ліхаманкі. Блізкім хворага, калегам па працы — мае спачуваньні. Усё жыцьцё супэрдачнік з дапамогай свайго надзелу зьдзекуецца зь сябе і з астатніх. Марна гаруе сам і прымушае гараваць іншых. Затраты на праезд, плёнку, угнаеньне куды большыя за кошт ураджаю, але хвораму гэта даводзіць бессэнсоўна. Пачуеце бясспрэчны аргумэнт: «Раз агарод ёсьць, яго трэба садзіць». Дзеля лецішча супэрдачнік ня толькі жыве, але і памерці гатовы, у плуг запрогшыся. Такіх выпадкаў паўсюль багата.

Ня блытайце аматара расьлінаводзтва з супэрдачнікам. Апошні атрымлівае неблагі ўраджай толькі за кошт вялізнай плошчы агароду, няспыннага рачкаваньня. Новых сартоў расьлін не выводзіць. Значная частка ягоных укараненьняў ніяк не ўплывае на агародную флёру, адно людзям жыцьцё ўскладняе. Так, граду клубніц супэрдачнік накрывае плёнкай, потым выразае дзірку на кожны куст, каб ягады на зямлі не ляжалі, ля кожнага каліва памідораў, нават калі іх пад сто, укопвае абрэзаную плястыкавую бутэльку, залівае туды ваду, каб расьлінам хапала вільгаці. Шчыра перакананы, нібыта бульбу трэба садзіць толькі тады, калі месяц у фазе росту. Роспытамі, размовамі, парадамі гэткага кшталту атручвае ўвесь абедзенны перапынак. Гутарыць на іншыя тэмы няздатны. Дэманстрацыяй уласнай бессэнсоўнай працавітасьці выклікае комплекс непаўнавартасьці, адчуваньне віны перад сваім агародам у нясталых асоб. Ні ў якім разе не распавядайце нічога супэрдачніку пра лецішча, інакш праз месяц або самі захварэеце на ліхаманку, або нечакана для ўсіх пры слове «дача» пачняце заходзіцца нямым крыкам.

*Магілёў*

прыватнасьці

# Вішнёў на паляваньні


**Зьміцер Вішнёў падчас пэрформансу.**

Сустрэць на менскіх вуліцах літаратара нападпітку — звычайная справа.

На Вішнёва я натрапіў выпадкова. Пазнаёміўся зь ім тыдзень таму, павітаўся зь ім пазаўчора, а ўчора — не павітаўся, хаця й бачыў. Ён учора таксама бачыў мяне, але таксама не павітаўся. Цікавая адбылася несустрэча. А ў гэты вечар — вечар паляваньня — Зьміцер Вішнёў выходзіў з мэтро, размаўляючы зь нейкім хлопцам у джынсе.

Я заўважыў Вішнёва толькі тады, калі натоўп кінуў мяне да яго — ці то пад ногі, ці то ў твар. Але ён не зьвярнуў на мяне ўвагі, павярнуўся да свайго суразмоўцы; я пакрочыў за імі. Нам было па дарозе; можна было б напісаць, што я перамог сваю цікаўнасьць і пакрочыў проста дадому, але… я крочыў менавіта за імі.

З хлопцам у джынсе Зьміцер разьвітаўся на прыпынку. Потым мы «ўбачылі» адзін аднаго, пачалі размову пра конкурс імя Пэтраркі, які скончыўся днямі. «Якія вы ўсе маладыя й таленавітыя», — сказаў Вішнёў, хаваючы іронію. Ён хутка прапанаваў выпіць па бутэльцы піва (надвор’е спрыяла), але… «Пачакай, я толькі пазнаёмлюся вунь з той дзяўчынай». Добра, Зьміцер, я пачакаю.

— Прабачце, калі ласка. Вы такая прыгожая, вы мне так падабаецеся, можна з вамі пазнаёміцца?

— Не.

— Я — Зьміцер. А як вас завуць?

— Навошта вам гэта ведаць?

— Як жа мы будзем размаўляць, калі я ня ведаю, як вас завуць?

— А мы ня будзем.

— Я так не магу. Дзе вы вучыцеся?..

Дзяўчына вучылася ў пэдагагічным унівэрсытэце. Мы ўтраіх пагрузіліся ў тралейбус, і нейкі час мне не было чуваць, што ён казаў ёй. Але размова працягвалася, і за гэта я паважаў Вішнёва ўсё болей. Пасьля заходу сонца і ў знаёмай дзяўчыны нялёгка выклікаць давер. Зьміцер ствараў цуд.

Праз два прыпынкі мы выйшлі з тралейбуса, і я зноў далучыўся да размовы. Уявіце маё расчараваньне, калі я высьветліў, што яна ня зрушылася ні на крок! Эх, Вішнёў, мы дарма марнуем час…

Мы ішлі вельмі цёмнай вуліцай, да інтэрнату заставаліся лічаныя крокі. Нарэшце дзяўчына пачула тое пытаньне, якое не магло не прагучаць. Бо яна ж ішла побач са Зьміцерам Вішнёвым, слынным бум-бам-літаўцам, піянерам «Першацвету», паэтам, які вырас — і застаўся паэтам. Толькі стаў прыкладам для перайманьняў з боку наступнага пакаленьня.

— Можна прачытаць вам верш? Спыніцеся, калі ласка! Можна я прачытаю вам свой верш?

Яна спынілася. Зьміцер Вішнёў набраў у грудзі паветра, і…

«Зафрахтуй маё цела!
Паркетнае неба будзе над намі!
Мае пальцы...» — і г.д.

— Вы прачыталі? — спыталася дзяўчына.

— Прачытаў, — адказаў Вішнёў.

— Можна ісьці?

Яшчэ некалькі крокаў аддзяляла нас ад ганку інтэрнату. Вішнёў узьляцеў па прыступках і ўвярнуўся ў сьвятло, што выбухнула з адчыненых дзьвярэй, — за ёй! Я застаўся на вуліцы й чакаў Вішнёва — нядоўга. Ён выйшаў сумны (знаёмства скончылася ля інтэрнацкай вахты), але надзея яшчэ жыла ў ім.

Наступная ахвяра Вішнёва проста ішла нам насустрач. Шэраг ужо знаёмых вам пытаньняў прынёс добрыя вынікі: дзяўчыну звалі Ксеня, яна працавала на тэлеканале «Лад». На жаль, яна не згадзілася даць Вішнёву нумар свайго тэлефону, але ён прэзэнтаваў ёй уласную візытоўку. Зьміцер Вішнёў, чалавек зь візытоўкай ад выдавецтва «Логвінаў», дастаў аловачак і дадаў да яе зьместу нумар мабільнага. Вуліца была яго сцэнай, а я — гледачом. Яна ўзяла паперчыну й зьнікла ў ночы, паабяцаўшы патэлефанаваць раніцай. Але раніца мудрэйшая за ноч.

Паўза, якую мы правялі ў пошуках, не прынесла мне разуменьня таго, што адбывалася. Была амаль адзінаццатая. Мы спыніліся ля дзьвюх дзяўчын, што палілі ля ўваходу ў інтэрнат. Гэта быў спрынт: Зьміцер добра разумеў, што часу няма, што цыгарэты згараюць вельмі хутка… Ён паспрабаваў і не пасьпеў. Мы падселі да першакурсьніц, што бавілі час на лаўцы побач, але Зьмітру яны падаліся зялёнымі і мы хутка разьвіталіся зь імі.

Крочылі па наступнае піва. Зьміцер перахапіў наступную дзяўчыну й тлумачыў ёй, што заўтра адбудзецца паэтычная імпрэза, падчас якой ён будзе чытаць вершы. Вось яно… «Я, ПАЭТ, ЗАПРАШАЮ ВАС НА ПАЭТЫЧНУЮ ВЕЧАРЫНУ» — казаў ён. «Вы, паэт, запрашаеце мяне на паэтычную вечарыну…», — чула дзяўчына. *Ня дзевак мы шукалі ў вялікім горадзе, а статус Зьмітра Вішнёва — беларускага паэта.* Але дзяўчаты тым вечарам хадзілі хутка й адмаўляліся разумець, што такое верш, паважаць проста за талент і верыць прыгожым словам…

На прыпынку, зь якога Вішнёў зьбіраўся зьяжджаць дадому, мы раптам наткнуліся на трох студэнтак са спэцыялізацыяй «Сусьветная мастацкая культура». Яны нечакана пачалі адказваць нам па-беларуску, размова цягнулася колькі хвілін. Раптам затрэнькала мая мабіла, і я адышоў паразмаўляць за дашок на прыпынку. Вярнуўся — і не знайшоў ні дзяўчат, ні Вішнёва.

Вішнёў зьехаў зь дзяўчатамі. Вішнёў зьехаў, не разьвітаўшыся. Вішнеў ускочыў у 82-гі, імкнучыся скарыстаць свой апошні шанец гэтага вечара.

Дзеўкі! Калі ўвечары да вас падыдзе незнаёмы чорнавалосы чалавек з бляшанкай піва ў руцэ — не жахайцеся! Цалкам магчыма, што гэта вядомы беларускі паэт Зьміцер Вішнёў, аўтар кніг «Бочкавы краб» (1995), «Афрыканскія матывы» (1996), «Клёкатамус» (1996), «Штабкавы тамтам» (1998), «Тамбурны маскіт» (2001). Ён мае мірныя намеры. Паразмаўляйце зь ім. Памятайце: на пароль — «Зафрахтуй маё цела!» — ёсьць водгук — «Паркетнае неба будзе над намі!».

**Павал Сьвярдлоў**

ФЭЛЬЕТОН

# Ніякага сэксу

## Адкрыты ліст у Міністэрства інфармацыі ЗША ад жыхароў Садамавіцкага раёну, апрацаваны ідэалягічным аддзелам райвыканкаму

Мы, жыхары Садамавіцкага раёну, выказваем рашучы пратэст у сувязі са зьяўленьнем у амэрыканскай прэсе публікацыяў, што бэсьцяць маральныя якасьці й дзелавую рэпутацыю кіраўнікоў нашага раёну. Газэта «Капіталістычная Амэрыка» надрукавала поўны непрыхаванай маны пасквіль «Садомавічы ці Садом?», у якім было зьбэшчанае добрае імя старшыні Садомавіцкага райвыканкаму Садамоўскага А.А.

Як піша «КА», у часе брыфінгу, дадзенага журналістам раённай газэты «Рэха Садому», старшыня заявіў, што сыстэматычна і ў вычварэнскай форме дамагаецца загадчыка райаддзелу ідэалёгіі Гамаровіча І.І. і ўсяе радзіны апошняга. Больш за тое, старшыня нібыта цынічна паабяцаў узмацніць сэксуальны ўціск на ідэоляга, калі той не правядзе працу з даяркамі Гаморавіцкай фэрмы, якія псуюць раённую справаздачнасьць па надоях. У выніку ідэоляг быццам вымушаны быў напісаць заяву з просьбай перавесьці яго ў іншае месца працы. Тэндэнцыйная і хлусьлівая «Капіталістычная Амэрыка» не была б сабой, калі б не абярнула справу ў палітычнае рэчышча. «Дарэчы, Садамовіч быў адным зь вельмі тэмпэрамэнтных крытыкаў палітычных працэсаў у ЗША, — піша «КА». — Ён неаднаразова выступаў па правадной радыёсетцы з адпаведнымі рэзкімі заявамі. Напэўна, каб пра яго дрэнна не падумалі». Лішне казаць, што асобнай праваднай сеткі раён ня мае. Яна ў нас агульнанацыянальная, і выступае па ёй зусім не Садамовіч А.А. Слова ж «брыфінг» магло зьявіцца толькі ў сапсаванай грамадзтвам спажываньня галаве: старшыня штодня заходзіць у рэдакцыю «Рэха», каб загадаць, пра што пісаць і якія фатаграфіі ставіць у нумар. Заяву ж кіраўнік аддзелу ідэалёгіі напісаў ня ў сувязі з уціскам, а з прычыны часовага пераходу ў абласны алімпійскі штаб. Ніводнага праўдзівага слова ва ўсёй публікацыі!

Больш аб'ектыўную карціну падзеяў дае амэрыканская «Байскаўцкая праўда». У публікацыі «Які ж рускі каўбой ня любіць ядронага слаўца» выказваньні Садамовіча А.А. слушна інтэрпрэтуюцца не як пагрозы сэксуальнай расправай, але як спэцыфічныя рытарычныя фігуры. Аднак журналісты так імі захапляюцца, што за хваласьпевам старшынёўскаму ўмельству не заўважаюць вялікай пазытыўнай ролі такой манеры выказваца. Бацькоўскі наказ Садамовіча А.А., расквечаны лексычнымі шматпавярховікамі, натхняе на ўдарную працу: раён мае найлепшыя ў вобласьці паказьнікі. І акадэмік маваназнаўства Калужскі, да якога мы зьвярнуліся па экспэртызу, лічыць выказваньні старшыні зусім не мацюкамі, а табуяванымі канструкцыямі, рэхам старажытных фалічных культаў рускага народу.

Калі надалей падобныя публікацыі будуць мець месца ў амэрыканскай прэсе, мы змушаныя будзем зьвярнуцца ў «Рэха Садому» з просьбай напісаць пра справу сэнатара Макгрыві.

**Сяргей Мікулевіч**



Андрэй Хадановіч

## Ехаў казачнік-байкер...

Раскажу, хоць людзі ня звыклі
й будуць лаяць: маўляў, маўчы!
Ехаў казачнік на матацыкле.
Без глушыльніка. Уначы.

На ўсёй хуткасьці лётаў у сьне.
Па ім плакаў будынак жоўты...
— Баяць ці не?
— Ды пайшоў ты!..

Зараз будзе яму праблема:
неба ў краткі, адзежа ў паскі!
Бач, разьезьдзіўся тут бяз шлема
і — бяз каскі! — развозіць казкі!

Лепш пяяў бы на старане!
Хто прачнуўся, вельмі сярдзіты.
— Баяць ці не?
— Ды йдзі ты!..

«Гэта, ясна, жыдамасон!»
І начному госьцю ня радыя.
Лепей бачыць дазволены сон,
лепей слухаць дзяржаўнае радыё!

Бачаць байкі яго ў труне
і славянскі піпал, і балты.
— Баяць ці не?
— Задзяўбаў ты!..

Ды аднойчы знайшоў 9-ы
дом на вуліцы Байкер-стрыт:
тут яго і ў будні, і ў сьвяты
слухаць маюць натхненьне й спрыт.

Не хапала праўды ў мане?
Не хапала байкі — хапай!
— Баяць ці не?
— Тут бай!



Алімпіяда левым вокам — старонка 8.

REUTERS

ЦЫТАТНІК

### Завяршаецца фарбаваньне

Тураў (Гомельская вобласьць), 15 жніўня. Да XI Дня беларускага пісьменства, які пройдзе 5 верасьня ў Тураве, у гэты горад пастаўлена 16 кілямэтраў платоў. У цяперашні час завяршаецца іх фарбаваньне, і тысячагадовы Тураў набывае новае, жоўта-ружовае, аблічча.

**БелаПАН**

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**ВІТАНЬНІ**

**Любую дачушку Ўладленку Малашчанку** з Трыццатымі Народзінамі віншуюць бацькі. Жадаем шчасьлівага лёсу ў свабоднай краіне. Чакаем зьдзяйсьненьня тваіх самых сьветлых мараў, наша каханая!

**Антося Рудака** віншуем з Днём народзінаў. К і Я

**КАНТАКТЫ**

**Шукаю маладых людзей** і спадарожнікаў у вандроўніцтве па Беларусі, неабыякавых да гісторыі сваёй Бацькаўшчыны. Litvakryviczou@tut.by

**Хлопец** 25/176/86, сымпатычны, в/а. Ёсьць кватэра. Шукае сябра. А/с 86, 220079, Менск

**КАЦЯНЯТЫ**

**Махнатыя** і ласкавыя кацяняты шукаюць гаспадароў (кошачкі чарапахавага колеру, два месяцы). Т.: 273-86-55, 8-029-34-23

**КНІГІ**

**Куплю кнігу**: Славамір Адамовіч, «Плавільшчыкі расы». Т.: 250-35-22, Сяргей. Электронны адрас: kanaj@tut.by

**Прадаю кнігу**: Марта Піньска, «Беларуска», на беларускай і польскай мовах. Т.: 262-69-19 (ад 19 да 21)

**Футболкі** з нацыянальным арнамэнтам ды Пагоняй, фенечкі, значкі, кнігі па гісторыі, архітэктуры, філялёгіі, слоўнікі, відэа, аўдыё, CD на Румянцава, 13 (Таварыства беларускай мовы). Панядзелак—пятніца (11.30—17.00). Т.: 8-029-707-40-01

**Набуду** «Энцыкляпэдыю гісторыі Беларусі» (1, 3, 4, 5 тамы ці ўсе разам), «Археалёгію Беларусі» (т.1). Прадам збор твораў Кандрата Крапівы (т.3—5), «Лексычны атляс беларускіх народных гаворак» (т. 3, 5), «Гістарычны слоўнік беларускай мовы» (т.13, 15, 18, 19), «Рэканструкцыю неба» В.Гапеевай. Т.: 8-029-707-40-01, 234-93-71

**Прадам** «Энцыкляпэдыю гісторыі Беларусі», 4 і 5 т., часопісы «Спадчына», «Маладосць», «Полымя» — усё старыя нумары — або памяняю на кнігі па гісторыі, этнаграфіі, архітэктуры ды інш. Т.: 236-02-15

**Прадам кнігі** «Каталіцкія храмы Беларусі», «Нарысы гісторыі Беларусі» ў 2-х тамах, 1995 г., «История архитектуры Беларуси», энцыкляпэдычны даведнік і іншыя кнігі па гісторыі, архітэктуры, этнаграфіі, фальклёры, паэзіі — вялікі выбар. Т.: 236-02-15

**Кнігі — поштай.** Замаўляйце каталёг: поштай — а/с 333, 220050 Менск, электронны адрас — exlibris@tut.by, вэбвузел — http://knihi.net, т. — 8-029-643-57-33

**Кнігі — поштай. Новае дзецям**: Мілаш Мацоўрак, Адольф Борн «Мах і Шэбестава вандруюць па сьвеце», казкі М. Мацоўрака і О.Сэкары на аўдыёкасэтах, Пятро Васючэнка «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі». Т.: 8-029-643-57-33, exlibris@tut.by

**Набуду кнігу** «Речи Варга» або прыму дапамогу па пошуку гэтай кнігі. Т.: 8-029-550-73-83. Антон

**Кнігі — поштай. Новае**: часопіс «Беларускі рэзыстанс» №1/2004, Міраслаў Адамчык «Зборнік», «Czasopis» №7—8/2004, «Дзеяслоў» №10, фільм «Васіль Быкаў. Вяртаньне» на VHS, DVD, CD у фармаце DivX-AVI, часопіс «pARTisan» 03/2004. Т.: 8-029-643-57-33, exlibris@tut.by

**Энцыкляпэдыі** па археалёгіі, нумізматыцы, гісторыі Беларусі (1, 2, 6 тамы), «Гістарычны слоўнік беларускай мовы» (т.13, 15, 18, 19), «Лексычны атляс беларускіх народных гаворак» (т.3,5), іншыя кнігі на Румянцава, 13 (Таварыства беларускай мовы). Панядзелак—пятніца (11.30—17.00). Т.: 8-029-707-40-01

**ПАКОЙ**

**Дзьве беларускамоўныя дзяўчыны**, студэнткі Акадэміі мастацтваў, здымуць пакой на доўгі тэрмін. Т.: 8-029-558-66-37, (8-01773) 61-045

**ПРАЦА**

**Ангельская і швэдзкая мовы** зь беларускамоўнай рэпэтытаркай! Вопыт выкладаньня, замежныя стажыроўкі. Т.: 202-97- 20. Наста

Запрашаем у падарожжа
**на Крапівенскае поле 4—5 верасьня**
з заездам у **Белую Царкву, Смаляны і Воршу.**
Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер), 264-12-38, 776-24-35 (Павал).

*Сям'я Савіцкіх віншуе Міхася Тычыну з нараджэньнем унучкі Эўфрасіньні!*

«Наша Ніва» дзякуе Андрэю К., Ружы Ганчаровай і N. зь Менску за ўчасную дапамогу.

КАІСА

# Гульня ціхіх імпэрыялістаў

У Беларусі гульня ў го асацыюецца з кропкамі, якія на перапынках малююць у сшытку школьнікі. Прынцып го — заваёва прасторы, і тут гульня мае больш ваенны характар, чым шахматы. Але наймацнейшыя беларускія гульцы ў го — цывільныя. Іх пакуль нямнога: чалавек 50 у Менску, адзінкі за Менскам. Але ж і даведаліся пра новую гульню ў Беларусі нядаўна, у 1970-я, дзякуючы публікацыям у маскоўскім часопісе «Наука и жизнь».

Пачынаюць у го чорныя. Камяні, падобныя да гузікаў, ставяцца на скрыжаваньні клетак. Ад гульцоў патрабуюцца цярплівасьць, псыхічная раўнавага і пачуцьцё меры.

Го — мастацтва Ўсходу, блізкае значэньнем да ікебаны ды чайных цырымоній. У шахматах дамінуе лёгіка, гульцы ж у го мусяць задзейнічаць інтуіцыю, уключыць абодва паўшар'і мозгу. Кампутарам перабраць усе варыянты ў го не пад сілу, і машыны, як і ў японскіх шахматах сёгі, саступаюць людзям.

У Японіі ў го гуляюць 20 мільёнаў чалавек... Аднак чэмпіёны сьвету жывуць у Паўднёвай Карэі, дзе го вывучаецца ў школах. Карэйцы ўкладаюць вялізныя грошы ў папулярызацыю гульні, ладзяць майстар-клясы па ўсёй Эўропе.

І ў Менску ладзіліся міжнародныя турніры — апошні быў у 1994 г. Пасьля, як сьведчыць кіраўнік незарэгістраванай фэдэрацыі «Го ў Беларусі» Аляксандар Супонеў, стала цяжка знаходзіць грошы нават на нацыянальныя спаборніцтвы: «Пайшоў у міністэрства, а мне ў адказ: «Хіба го — алімпійскі від спорту?»

Найчасьцей беларусы выпраўляюцца на спаборніцтвы за кошт гаспадароў. У лістападзе два менчукі ўпершыню паедуць на парны чэмпіянат сьвету ў Японію: пакажуць, на што здольныя выхаваньні «Клюбу інтэлектуальных гульняў Усходу».

**ВР**

### Як бы вы згулялі?

**Э.Ласкер — Л.Жыткевіч. Менск, 1936, сэанс адначасовай гульні на 25 дошках. Ход чорных (Lasker.pcx). Белыя перасунулі пешку 1. е5 з намерам выйграць якасьць. Як рэагаваць?**



**Адказ на заданьне з №30:** 1...Кb3 і на 2. Кd3 Кa1! 3. Тc8+ Сf8. Не мяняла справы 2. Кc6 Кa1! 3. Тb2 Сc3.

**Адказ:** чорныя маглі папросту выйграць пешку 1...de 2. Фd8 Тad8. У партыі было 1...Сe5 2. Сa8 Фa8 з кампэнсацыяй за якасьць. Урэшце чорныя перамаглі.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Рыгору Л**. «Водар ранішняй...» — гэта яшчэ не апавяданьне. Друкаваць ня будзем.

**Раману зь Менску**. Згаданыя Вамі касэты і кнігу «Залатыя дыскі беларускага рок-н-ролу» шукайце на выставе ў БНФ (вул.Варвашэні, 8) і ў незалежных распаўсюднікаў на бліжэйшых канцэртах айчынных музыкаў.

**Людміле А. з Шаркаўшчыны.** Наш матэрыял пра пленэр паўнейшы за дасланы Вамі.

НЯ РЭЖЦЕ ГАЗЭТУ!

Увага! Цяпер прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фота-рэдактар — Арцём Лява
карэктарка — Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар — Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 3377. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 21.00 18.08.2004.
Замова № 5086.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а